Официальная государственная позиция была представлена в «Поздравлении со 100-летним юбилеем Октябрьской революции» президента Республики Беларусь[33]. Обратим внимание на два аспекта «знаменательной даты», отмечаемых в документе. Это провозглашение права наций на самоопределение и формирование новых социально-экономических принципов. Именно возможность национального возрождения и реализации идеи социальной справедливости стали важнейшими позициями президентских «Поздравлений с Днем Октябрьской революции» в течении последнего пятилетия.

Посмотрим, как это прослеживается по официальным документам президента Республики Беларусь.

31 *Сергей Нарышкин: революционные события 1917 года больше не раскалывают общество*, <http://tass.ru/opinions/interviews/4699298>.

32 *Кроме Республики Беларусь День Октябрьской революции празднуется в непризнанной Приднепровской Молдавской Республике*, <https://ru.wikipedia.org/wiki>.

33 *Поздравление со 100-летним юбилеем Октябрьской революции*, <http://president.gov.by/ru/news_ru/view/pozdravlenie-so-100-letnimjubileem-oktjabrskoj-revoljutsii- 17408>.

2013 г.: «Бесплатные образование и медицинское обслуживание, восьмичасовой рабочий день, ликвидация сословных привилегий, свобода совести и равенство гражданских прав женщин и мужчин — эти и другие, кажущиеся нам естественными и неотъемлемыми, блага составляют завоевание той поры. Провозглашенное советской властью право наций на самоопределение стало фундаментом, на котором мы построили суверенное Отечество — Республику Беларусь. Достижения, которыми гордится независимая Беларусь сегодня: сильная народная власть, опирающаяся на систему советов депутатов всех уровней, социально ориентированная экономика, высокоразвитые образование, наука и культура — во многом основаны на потенциале, накопленном в БССР»[34].

2014 г.: «События октября 1917 года изменили судьбу огромной страны и создали условия для национального возрождения населявших ее народов, а также для реализации права наций на самоопределение... Присущие нашему обществу мир, стабильность и согласие — закономерный итог того, что мы не отвергли социальные завоевания Великого Октября, не предали идеалы равноправия, справедливости и бескорыстного служения людям. Мы одни из немногих на постсоветском пространстве, кто отдает дань уважения этой исторической дате. Белорусы не отказываются от собственного прошлого, но и не хотят поступаться суверенным правом самостоятельно определять свое будущее»[35].

2015 г.: «Для многих из нас 7 ноября — дорогой сердцу праздник... Мы строим социально ориентированное государство, в основе которого — уважение к людям труда, идеалы равенства и социальной справедливости, стремление к взаимопониманию и единению во имя благополучия нашей Родины»[36].

2016 г.: «В XX веке это событие (Октябрьская революция) занимает особое место. Оно оказало значительное влияние на ход мировой истории и определило судьбы многих народов. Доступные социальные блага, идеалы равноправия, мира, межнационального согласия, сложившиеся в советскую эпоху, актуальны и поныне»[37].

[34] <http://president.gov.by/ru/news_ru/view/pozdravlenie-s-dnem-oktjabrskojrevoljutsii-7329>.

[35] <http://president.gov.by/ru/news_ru/view/pozdravlenie-s-dnem-oktjabrskojrevoljutsii — 10127>.

[36] <http://president.gov.by/ru/news_ru/view/pozdravlenie-s-dnem-oktjabrskojrevoljutsii-12508>.

[37] <http://president.gov.by/ru/news_ru/view/pozdravlenie-s-dnem-oktjabrskojrevoljutsii-14797>.

2017 г.: «Октябрь 1917 года ознаменован появлением на политической карте страны с принципиально новым укладом и провозглашением права наций на самоопределение... Сегодня мы живем в суверенной, независимой стране»[38].

Как видно из приведенных документов, после паузы 2015-2016 гг., вопрос национально-государственного строительства, обретение независимости вновь выходит на первый план. В приветствии участникам Международной научной конференции «1917 год в исторических судьбах Беларуси», состоявшейся в Минске в ноябре 2017 г., Александр Лукашенко вновь подчеркнул, что «события 1917 года способствовали стремлению белорусов жить в своем доме. Идея самоопределения Беларуси, которая шла снизу, от инициативы народных масс, выразилась в созыве Первого Всебелорусского съезда. Это народное собрание продемонстрировало важнейшие ценности, значимые для нас до настоящего дня: свое государство, его социальный характер и тот факт, что только народ, его воля, коллективный разум и лидеры могут стать подлинным источником независимости»[39].

Следует отметить, что и представители «левых», коммунистических организаций Беларуси сегодня также отмечают факт белорусской государственности как важнейший итог революции 1917 г. Секретарь ЦК КПБ Георгий Атаманов заявил, что именно благодаря событиям столетней давности «белорусский народ стал строить свою государственность»[40], а председатель партии «Справедливый мир» (бывшая Партия коммунистов Белорусская) Сергей Калякин, отметил, что 7 ноября — «исторически актуальная дата» и «если бы не было Октября, не было бы Республики Беларусь... Мы продолжали бы быть забитой царской окраиной, наша страна была бы разделена между Польшей и Россией или вообще находилась бы в составе России. Неизвестно, был бы вообще белорусский язык, белорусская национальная культура»[41].

[38] <http://president.gov.by/ru/news_ru/view/pozdravlenie-so-100-letnimjubileem-oktjabrskoj-revoljutsii-17408>.

[39] *Приветствие гостям и участникам конференции «События 1917 года в исторических судьбах Беларуси»*, <http://president.gov.by/ru/news_ru/view/privetstvie-gostjam-iuchastnikam-konferentsii-sobytija-1917-goda-v-istoricheskix-sudbax-belarusi-17584>.

[40] *Официальное празднование в Минске столетия Октябрьской революции продолжалось 15 минут*, <http://naviny.by/new/20171107/1510044039-oficialnoe-prazdnovanie-v-minske-stoletiya-oktyabrskoy-revolyucii>.

[41] *Беларусь отмечает столетие Октября. Единственная из постсоветских стран*, <http://naviny.by/article/20171107/1510037723-belarus-otmechaet-stoletie-oktyabrya-edinstvennaya-iz-postsovetskih>.

Взаимосвязанность крушения Российской империи и становления белорусской государственности отрицать бессмысленно, это очевидный факт. Для белорусской исторической политики сегодня более актуальным является вопрос о том, только ли революция 1917 г. дала возможность реализоваться белорусской национальной идее? Какую роль сыграла Первая мировая война как нациеобразующий фактор? Какова роль основных участников российской гражданской войны в постановке и реализации национального вопроса на просторах бывшей империи? Как способствовали и препятствовали крупнейшие европейские державы и государства-соседи Беларуси национальному движению?

Столетние юбилеи для белорусского общества и государства отнюдь не исчерпываются событиями 1917 г. В 2018 г. исполнится сто лет провозглашению Белорусской Народной Республики, в 2019 г. — столетие образования Советской Социалистической Республики Белоруссии и Литовско-Белорусской Советской Социалистической Республики.

Сформировавшейся политики по отношению к этим датам нет ни у белорусской власти, ни у белорусского исторического сообщества[42]. Так что белорусские «бои за историю» еще впереди.

Переосмысление и выстраивание национальных историй, процесс национально-государственной самоидентификации делает необходимым расширение «социальных рамок памяти», концентрацию внимания общества на национальных и демократических процессах актуализированных событиями 1917 года, позволяет анализировать белорусскую историю как историю одного из геополитических центров первых десятилетий XX в. Комплексное изучение революция, в контексте предшествующих ей и последовавших за ней событий европейской и мировой истории, становится одним из важнейших факторов формирования модерной белорусской идентичности, базирующейся на принимаемых обществом и государством представлений о прошлом.

[42] См., например, круглый стол газеты «Звязда»: *1918-ы год для нашай дзяржаўнасці: набыткі і страты*, <http://zviazda.by/be/news/20180117/1516167450-1918-y-god-dlya-belarusi-nabytki-i-straty>.

Summary

Centenary of the 1917 Russian revolution: Why the Russian Federation and the Republic of Belarus celebrated the anniversary differently

The author analyses the official Belarusian and Russian stance towards the revolutionary events of 1917 and the reaction to the state discourse on the part of the historians' milieu, political parties and public organizations of the Republic of Belarus and those of the Russian Federation.

Keywords: 1917 Revolution, Republic of Belarus, Russian Federation, historical policy, historiography.

Streszczenie

Stulecie rewolucji 1917 roku. Dlaczego Federacja Rosyjska i Republika Białoruś obchodziły rocznicę inaczej

Autor analizuje oficjalne białoruskie i rosyjskie stanowisko państwowe wobec wydarzeń rewolucyjnych w 1917 roku i reakcję na państwowy dyskurs ze strony środowisk historycznych, partii politycznych i organizacji społecznych w Republice Białoruś i Federacji Rosyjskiej.

Słowa kluczowe: rewolucja 19017 r., Republika Białoruś, Federacja Rosyjska, polityka historyczna, historiografia.

Menkouski Viachaslau — doktor nauk historycznych, profesor Wydziału Historycznego Białoruskiego Uniwersytetu Państwowego w Mińsku. Autor ponad 200 publikacji, w tym monografii: *Англо-американская советология: история, современность, академические ресурсы* (Mińsk 2000); *История и историография: Советский Союз 1930-х гг. в трудах англо-американских историков и политологов* (Mińsk 2007). Współautor i redaktor wydawnictw naukowych, szkolnych i encyklopedycznych: *История России. XX век* (Mińsk 2005); *История России: Новое и Новейшее время* (Mińsk 2010); *GULAG: Ideology and Economy of Forced Labour in the XX century* (Banská Bystrica 2017). Członek kolegiów redakcyjnych szeregu białoruskich, ukraińskich, rosyjskich, czeskich i słowackich periodyków naukowych.

Мікола Мязга
(Гомель)

Узнікненне польска-савецкай вайны 1919-1920 гг. і Беларусь

Польска-савецкая вайна 1919-1920 гадоў істотным чынам паўплывала на дзяржаватворчыя працэсы на тэрыторыі Беларусі, стала адной з трагічных старонак у гісторыі беларускага народа. Беларускія землі ператварыліся ў адзін з аб’ектаў польска-расійскага супрацьстаяння. Гэта было звязана з тым, што ў цэнтры канфлікту паміж Савецкай Расіяй і Польшчай была барацьба за размешчаныя паміж імі землі, у тым ліку, беларускія. Аднавіўшая незалежнасць Польшча зыходзіла з таго, што яна мае гістарычныя правы на ўсе тэрыторыі, якія ўваходзілі ў склад Рэчы Паспалітай да яе падзелаў. Гэта азначала вылучэнне прэтэнзій і на беларускія землі.

Яшчэ ў час Першай сусветнай вайны польская эліта сфармулявала сваю пазіцыю адносна будучых граніц сваёй дзяржавы. Польскі нацыянальны камітэт (ПНК), у якім пераважалі палітыкі правага лагера, вызначыў усходнюю граніцу Польшчы, якая атрымала назву «лінія Дмоўскага». Аб гэтым рашэнні ў адмысловым мемарандуме быў праінфармаваны прэзідэнт ЗША Томас Вудра Вільсан. Як сцвярджалі аўтары мемарандума, пры вызначэнні граніцы яны зыходзілі, па-першае, з таго, што Польшча павінна быць моцнай дзяржавай, а, па-другое, мець аднароднае насельніцтва, каб захаваць «унутраную згуртаванасць». Зыходзячы з названых меркаванняў, дзеячы ПНК лічылі неабходным, каб тэрыторыя будучай Польшчы на ўсход ад Каралеўства Польскага ўключала большую частку Віленскай губерні, Гродзенскую губерню, большую частку Мінскай губерні, «якая ахоплівае Мінск, Слуцк, Пінск». Польскія палітыкі пры гэтым сцвярджалі, што на гэтых тэрыторыях палякі маюць колькасную большасць, ці, калі і знаходзяцца ў меншасці, то нязначнай. Астатнія беларускія землі павінны былі застацца ў складзе Расіі. Польскі правы лагер тым самым цалкам адмаўляўся ад ідэі стварэння Беларускай дзяржавы, матывуючы гэта тым, што «беларусы прадстаўляюць цалкам пасіўны расавы элемент. Сярод іх няма ніякага нацыянальнага руху...»[1]. Раман

[1] *Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914-1991). Зборнік дакументаў і матэрыялаў*, Мінск 2008, т. 1, ч. 1, с. 161-163.

Дмоўскі і іншыя польскія правыя палітыкі лічылі прапанаваную граніцу кампраміснай, бо яна мела на ўвазе падзел г.зв. «усходніх крэсаў» з Расіяй і азначала адмову Польшчы ад патрабавання граніцы 1772 г. На самой справе, сярод расійскіх палітычных сіл наўрад ці можна было знайсці тых, хто гатоў быў пагадзіцца на граніцу Польшчы ў адпаведнасці з «лініяй Дмоўскага».

Палітычны лагер Юзэфа Пілсудскага прапаноўваў для вырашэння пытання аб граніцах ва Усходняй Еўропе рэалізаваць канцэпцыю федэрацыі. Гэта дало б магчымасць Польшчы паставіць пад свой кантроль усю тэрыторыю «ўсходніх крэсаў» былой Рэчы Паспалітай праз стварэнне Літоўска-Беларускай і Украінскай дзяржаў, якія павінны былі ўтварыць федэрацыю з Польшчай. У рамках федэрацыі ўласна польская граніца павінна была прайсці значна заходней мяжы 1772 г. На наш погляд, не варта абсалютызаваць разыходжанні паміж прыхільнікамі Ю. Пілсудскага і правым палітычным лагерам адносна ўсходняй граніцы Польшчы. 16 снежня 1918 г. прыбыўшы ў Варшаву ў якасці прадстаўніка ПНК Станіслаў Грабскі паведамляў сваім калегам па камітэце, што на перамовах паміж ім і Ю. Пілсудскім начальнік дзяржавы выказаўся за граніцу, якая была блізкай да «лініі Дмоўскага» і азначала непасрэднае ўключэнне асноўнай часткі Беларусі, Літвы, Усходняй Галіцыі, часткі Заходняй Валыні ў склад Польшчы[2]. Адзін з найбольш блізкіх паплечнікаў маршала Леан Васілеўскі пісаў, што «ў адносінах да ўсходняй граніцы Пілсудскі ў цэлым пагаджаўся з лініяй, якую прапанаваў Дмоўскі»[3]. Ю. Пілсудскі праз стварэнне федэрацыі Польшчы з новымі незалежнымі дзяржавамі, якія павінны былі ўтварыцца на заходніх ускраінах былой Расійскай імперыі, хацеў адкінуць далёка на ўсход і значна аслабіць Расію, умацаваўшы ў той жа час пазіцыі Польшчы ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Канцэпцыя федэрацыі была яшчэ і адказам Ю. Пілсудскага на прапагандаваны Антантай прынцып права нацый на самавызначэнне, і павінна была маскіраваць тэрытарыяльную экспансію Польшчы ва ўсходнім напрамку. Пазней Ю. Пілсудскі пісаў: «Я казаў, што ісці гэтым шляхам падаецца мне немагчымым. ... Мы прыходзім са зброяй, што супярэчыць прынцыпу федэрацыі. Між тым, я тут не бачыў тых, хто гатовы быў уступіць у гэтую федэрацыю»[4]. Такім чынам, пазіцыя Ю. Пілсудскага па пытанні палітычнага ўладкавання Усходняй Еўропы таксама мела на ўвазе барацьбу Польшчы за беларускія землі.

[2] Тамсама, с. 185.

[3] L. Wasilewski, *Józef Piłsudski jakim Go znałem*, Warszawa 1935, s. 172.

[4] К. Гамулка, *Паміж Польшчай і Расіяй. Беларусь у канцэпцыях польскіх палітычных фарміраванняў (1918-1922)*, Вільня 2008, с. 66.

Палітыка расійскага савецкага ўрада ў дачыненні да заходніх раёнаў былой Расійскай імперыі вызначалася імкненнем падначаліць іх сваёй уладзе. Бальшавікі лічылі сябе спадкаемцамі ранейшай расійскай дзяржаўнасці. Прынцыпы сваёй палітыкі па нацыянальным пытанні яны сфармулявалі ў Дэкларацыі правоў народаў Расіі ад 2 (15) лістапада 1917 г. У ёй адзначалася, што палітыка царызму па нацыянальным пытанні «павінна быць заменена палітыкай добраахвотнага саюза народаў Расіі», у выніку чаго рабочыя і сяляне народаў Расіі аб'ядноюцца ў «адну рэвалюцыйную сілу, здольную ўстаяць супраць усялякіх замахаў з боку імперыялістычна-анексіянісцкай буржуазіі»[5]. На падставе зместу Дэкларацыі можна зрабіць выснову, што савецкі расійскі ўрад, абвяшчаючы права нацый на самавызначэнне, не збіраўся дапусціць распаду былой Расійскай імперыі на нацыянальныя дзяржавы. Права на самавызначэнне бальшавікі прызнавалі толькі за працоўнымі, і то толькі тэарэтычна. Наркам па справах нацыянальнасцей Іосіф Сталін адзначаў, што бальшавікі разумеюць гэтае права як «добраахвотны саюз працоўных усіх незалежных савецкіх рэспублік» праз усталяванне федэратыўнай сувязі з Савецкай Расіяй[6]. Відавочна, што бальшавікі імкнуліся захаваць тэрытарыяльную цэласнасць былой Расійскай імперыі, падначаліць сваёй уладзе яе ўскраіны, у тым ліку, і заходнія. Адзначым, што з пункту гледжання міжнароднага права пазіцыі Расіі ў плане прэтэнзій на беларускія землі былі аслаблены прыняццем Саветам Народных Камісараў дэкрэта ад 29 жніўня 1918 г. Ён абвяшчаў, што «ўсе дагаворы і акты, якія былі заключаны ўрадамі Расійскай імперыі з урадамі Прускага каралеўства і Аўстра-Венгерскай імперыі, якія датычыліся падзелаў Польшчы, у сувязі з іх пярэчаннем «прынцыпу самавызначэння нацый і рэвалюцыйнай самасвядомасці рускага народа, які прызнаў за польскім народам неад'емнае права на самастойнае адзінства, адмяняюцца гэтым беззваротна»[7]. Тым самым, юрыдычна неабгрунтаваным абвяшчалася далучэнне да Расіі зямель Рэчы Паспалітай, а ў Польшчы з'яўляліся дадатковыя падставы для абгрунтавання прэтэнзій на ўсходнія землі былой Рэчы Паспалітай.

Такім чынам, склалася сітуацыя, калі і Польшча, і Савецкая Расія ў сваёй палітыцы ў дачыненні да беларускіх зямель зыходзілі з таго, што маюць «гістарычныя правы» на гэтыя тэрыторыі. Імкненне дзвюх названых дзяржаў устанавіць кантроль над тэрыторыяй Бела-

[5] *Декреты Советской власти*, Москва 1957, т. 1, с. 40.
[6] И. В. Сталин, *Сочинения*, Москва 1947, т. 4, с. 228.
[7] *Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914-1991)*, т. 1, ч. 1, с. 151.

русі, як і над іншымі землямі, якія ляжалі паміж этнічнай Польшчай і этнічнай Расіяй, стала важнейшым фактарам узнікнення польска-савецкай вайны ў пачатку 1919 г.

Наспяванне і пачатак названага канфлікту стала штуршком для ўрада Уладзіміра Леніна, каб прыняць рашэнне аб абвяшчэнні савецкай рэспублікі на тэрыторыі Беларусі. 24 снежня 1918 г. ЦК бальшавіцкай партыі прыняў рашэнне аб стварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь (ССРБ) як буфернага ўтварэння паміж РСФСР і капіталістычнай Еўропай, перш за ўсё — Польшчай. На той момант кіраўніцтва Савецкай Расіі прыйшло да высновы, што яго спадзяванні на блізкі камуністычны пераварот у Германіі, Польшчы і Еўропе ў цэлым не спраўдзіліся. У сувязі з гэтым Беларусь страчвала ролю важнейшага плацдарма для распаўсюджвання рэвалюцыі на захад, які Савецкая Расія імкнулася пакінуць пад уласным кантролем. У пастанове Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта ад 13 лістапада 1918 г. аб ануляванні Брэсцкага мірнага дагавора беларусы не называліся сярод народаў ускраін былой Расійскай імперыі, правa якіх на дзяржаўнасць хоць бы ў форме савецкай рэспублікі бальшавікі прызнавалі[8]. Гэта сведчыла аб іх імкненні да непасрэднага кантролю з Масквы над тэрыторыяй Беларусі.

Пасля 20 снежня 1918 г. важнейшым фактарам, які вызначаў палітыку РСФСР на беларускім напрамку, стаў ужо відавочна набліжаўшыся польска-савецкі канфлікт. 22 снежня 1918 г. міністр замежных спраў Польшчы Л. Васілеўскі ў ноце на імя Георгія Чычэрына пісаў: «Польскі ўрад энергічна пратэстуе супраць руху савецкіх войскаў да польскай граніцы». Дзеянні гэтых войскаў ацэньваліся як варожыя ў адносінах да Польшчы[9]. У ноце ў адказ ад 23 снежня 1918 г. савецкі ўрад асноўны акцэнт зрабіў на тое, што Чырвоная Армія займае тэрыторыі, якія не належаць Польшчы: «...войскі Расійскай Савецкай Рэспублікі не толькі знаходзяцца на значнай адлегласці ад польскіх граніц, але аддзелены ад яе Літвой і суседняй часткаю Украіны»[10]. Указаны абмен нотамі выразна абазначыў тэрытарыяльную спрэчку паміж Савецкай Расіяй і Польшчай, у тым ліку і за беларускія землі. Характэрна, што ў савецкай ноце Беларусь яшчэ не названа ў якасці

[8] *Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора. Сборник документов*, Москва 1968, т. 1: *(1917-1918 гг.)*, с. 579-680.

[9] *«Красная книга». Сборник дипломатических документов о русско-польских отношениях 1918-1920 г.*, Москва 1920, с. 28.

[10] Тамсама, с. 29.

асобнай дзяржавы, у адрозненні ад Літвы і Украіны, аднак ужо праз дзень адбылося рашэнне ЦК РКП(б) аб стварэнні ССРБ.

У момант стварэння ССРБ яе тэрыторыя разглядалася Масквою як поле для дасягнення магчымага кампрамісу з Польшчай, каб пазбегнуць у той момант стварэння для Савецкай Расіі яшчэ аднаго фронту. Мелася на ўвазе, што мір з Польшчай можа быць захаваны праз саступку ёй, у прыватнасці, беларускіх тэрыторый. Прадстаўляўшы ў той момант ЦК РКП(б) у Беларусі Адольф Іофе наступным чынам тлумачыў неабходнасць утварэння ССРБ: «Каб не паўтараць памылак, калі нам давялося весці непасрэдную барацьбу з германскім імперыялізмам, мы вырашылі ў ЦК Савецкую Расію аддзяліць буферамі ад Еўропы»[11]. Аб тым, што стварэнне Беларускай, як і Літоўскай, савецкіх рэспублік было выклікана неабходнасцю пошуку кампрамісу з Польшчай, А. Іофе прама заявіў на пасяджэнні Цэнтральнага Бюро КПБ 22 студзеня 1919 г. Ён указаў, што прэтэнзіі польскага імперыялізму могуць быць вырашаны дыпламатычным шляхам, для чаго было неабходна, каб Польшча сутыкнулася з буферамі, і для чаго стваралася Беларуская ССР[12]. На гэтым жа пасяджэнні А. Іофе адзначыў, што «неадкладнае ўключэнне Беларускай рэспублікі ў Савецкую Расію на правах федэрацыі знішчае ўсе выгоды ад стварэння буфераў-рэспублік, бо тады ўсе перамовы вядзе цэнтральны ўрад, гэта значыць самой Расіі прыйдзецца непасрэдна прымаць у іх удзел»[13]. Пры гэтым расійскі савецкі ўрад гатоў быў ісці на вялікія тэрытарыяльныя саступкі за кошт савецкіх буферных рэспублік. А. Іофе падкрэсліў на пасяджэнні ЦК КП(б) ЛіБ 5 красавіка 1919 г.: «... за мір з Антантай можна аддаць Літву і Беларусь»[14].

Калі ўлічыць, што ССРБ стваралася для дасягнення кампрамісу з Польшчай за кошт тэрытарыяльных саступак, лагічным выглядае рашэнне ЦК РКП(б) пакінуць у складзе Савецкай Беларусі толькі тыя губерні, якія непасрэдна межавалі з Польшчай, а ўсходнія, якія не маглі быць прадметам саступак Польшчы, перадаць у склад РСФСР[15]. У. Ленін указваў, што Беларуская рэспубліка патрэбна настолькі, наколькі яна мяжуе з іншымі краінамі. Паколькі Смаленск, Віцебск і Магілёў не мяжуюць, то іх можна выключыць са складу ССРБ. Ён

[11] *Гісторыя Беларусі*, Мінск 2007, т. 5, с. 106, 107.

[12] Р. Р. Лазько, *Беларуская буферная рэспубліка ў палітыцы савецкай Расіі ў пачатку 1919 года*, «Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины», 2006, № 2, с. 5.

[13] *Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914-1991)*, т. 1, ч. 1, с. 205.

[14] Тамсама, с. 265.

[15] Тамсама, с. 207.

паставіў перад савецкім беларускім урадам задачу ўвайсці ў адносіны з Польшчай, выкарыстоўваючы для гэтага А. Іофе[16]. Уключэнне Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў у склад РСФСР павінна было забяспечыць захаванне гэтых тэрыторый у складзе Расіі ў выпадку, калі б бальшавікам для дасягнення пагаднення з Польшчай прыйшлося б ахвяраваць тэрыторыяй ССРБ. У ЦК РКП(б) існаваў план склікання канферэнцыі прадстаўнікоў камуністаў Беларусі, Літвы, Латвіі, Украіны і Польшчы для вырашэння ўсіх спрэчных тэрытарыяльных пытанняў. 25 студзеня 1919 г. А. Іофе ў лісце Г. Чычэрыну рэкамендаваў тэрмінова склікаць такую канферэнцыю. Такое рашэнне, на думку А. Іофе, было неабходным у сувязі з існаваннем тэрытарыяльных прэтэнзій Польшчы да Беларусі (Беластоцкі і Бельскі паветы), Літвы, «існуючай напружанай сітуацыяй на пагранічччы, якая ў любы момант можа стварыць тут *casus belli*»[17].

З пачатку лютага 1919 г. савецкі расійскі ўрад стаў вылучаць польскаму ўраду ССРБ, а затым — ЛітБел, у якасці асноўнага партнёра на перамовах па ўрэгуляванні тэрытарыяльнай спрэчкі. 10 лютага Г. Чычэрын накіраваў ноту польскаму ўраду, у якой прапанаваў палякам для ўрэгулявання тэрытарыяльнага пытання звяртацца да савецкіх рэспублік Літвы і Беларусі, «якіх яно датычыцца непасрэдна, і да якіх мы маем намер звярнуцца з прапановай нашых паслуг з мэтаю дапамагчы ў рашэнні адносячыхся да іх пытанняў»[18]. Рабоча-сялянскі ўрад Літвы і ЦВК ССРБ 16 лютага прапанавалі польскаму боку «вырашыць палюбоўна ўсе спрэчныя тэрытарыяльныя пытанні». Для гэтага стварыць змешаную камісію, якая «павінна будзе ўстанаўліваць дзяржаўную граніцу паміж утварыўшайся Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай Літвы і Беларусі — з аднаго боку, і Польскай Рэспублікай — з другога»[19]. Прадстаўляецца, што савецкі расійскі ўрад у той час рэальна хацеў пазбегнуць ваеннага канфлікту з Польшчай. Г. Чычэрын накіраваў 8 лютага тэлеграму А. Іофе ў Вільню, у якой прасіў утрымаць польскую дывізію, ці якіх-небудзь польскіх паўстанцаў ад уварвання ў этнічныя польскія землі. Да іх савецкі наркам адносіў Царства Польскае. Ён выказваў занепакоенасць тым, што такія дзеянні справакуюць польскі ўрад на вайну супраць Савецкай Расіі. Але выказваў меркаванне, што калі такіх правакацый не будзе, то вайны ўдасца пазбегнуць[20].

[16] Тамсама, с. 209.

[17] В. М. Бароўская, *Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918-1921 гг.*, Мінск 2017, с. 44-45.

[18] *«Красная книга». Сборник*, с. 40.

[19] Тамсама, с. 41-43.

[20] Архив внешней политики Российской Федерации, ф. 04, оп. 51, п. 326, д. 55002, л. 11.

Аднак польскія правячыя колы не прызналі названыя савецкія рэспублікі ў якасці суб'ектаў міжнародных адносін і адверглі магчымасць перамоў з імі. 4 красавіка 1919 г. Сейм Польшчы адмовіўся прызнаць незалежнасць Літоўска-Беларускай ССР. Асноўны дакладчык па гэтым пытанні С. Грабскі заявіў, што Польшча не прызнае літоўска-беларускі ўрад, «таму што гэта не самастойны ўрад, а абавязаны сваім існаваннем расійскім бальшавікам. Мы павінны ісці ў Літву і Беларусь, каб вызваліць польскае насельніцтва ад бальшавікоў»[21]. Як бачым, лёс палякаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, стаў для польскага ўрада адным з матываў, каб накіраваць войскі на беларускія землі насустрач Чырвонай Арміі.

Такім чынам, беларускія землі выступілі ў якасці аб'екта тэрытарыяльнай спрэчкі паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Абедзве гэтыя дзяржавы ў сваёй палітыцы зыходзілі з таго, што яны маюць «гістарычныя правы» на беларускія землі. Прэтэнзіі Савецкай Расіі і Польшчы на землі, якія былі размешчаныя паміж рускай і польскай этнічнымі тэрыторыямі, у тым ліку і беларускія, рабілі польска-савецкую вайну практычна непазбежнай. У момант яе ўзнікнення кіраўніцтва РСФСР спрабавала выкарыстаць тэрыторыю Беларусі і створаную па рашэнні Масквы ССРБ для дасягнення часовага кампрамісу з Польшчай. Аднак такая палітыка не знайшла падтрымкі ў польскага кіраўніцтва. Яно зрабіла стаўку на ваеннае вырашэнне пытання аб прыналежнасці тэрыторыі Беларусі. Барацьба Польшчы і Савецкай Расіі за беларускія землі стала важнейшым фактарам узнікнення польска-савецкай вайны ў пачатку 1919 г.

Summary

Belarus and the outbreak of the Polish-Soviet War (1919-1920)

The government of the Soviet Russia and the government of Poland, which had recently regained independence, both stated that they had historical rights to claim the territory of Belarus. According to the Polish government, the Polish Army was legally justified in entering the territory of Belarus; the Soviet government used the same argument to justify the activities of the Red Army in the Belarusian territory. As a result, the Belarusian territory became the epicentre of a territorial dispute between Soviet Russia and Poland, which was one of the most important causes of the outbreak of the war between them. The government led by Vladimir Lenin tried to postpone the outbreak of the war by giving up some of the Belarusian lands to Poland; however, those attempts were not accepted by the Polish government.

Key words: Polish-Soviet War, causes of the conflict, Belarus, RSFSR, Poland, territorial dispute.

[21] *Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914-1991)*, т. 1, ч. 1, с. 289.

Streszczenie

Wybuch wojny polsko-radzieckiej (1919-1920) a Białoruś

Rosyjski rząd radziecki i władze odrodzonej Polski w równym stopniu rościły sobie pretensje do terytorium Białorusi. Każda ze stron utrzymywała, że ma „historyczne prawo" do ziem białoruskich. Rząd Polski uważał za absolutnie prawnie uzasadnione wkroczenie wojska polskiego na terytorium Białorusi, takie same stanowisko odnośnie do działań Armii Czerwonej na ziemiach białoruskich zajmował rosyjski rząd radziecki. Ziemie białoruskie znalazły się w epicentrum sporu terytorialnego pomiędzy Rosją Radziecką i Polską, który stał się jedną z najważniejszych przyczyn wybuchu wojny pomiędzy nimi. Próba opóźnienia przez rząd W. Lenina wybuchu wojny na drodze ustępstw terytorialnych kosztem Białorusi nie spotkała się z aprobatą polskiego rządu.

Kluczowe słowa: wojna polsko-radziecka, przyczyny konfliktu, Białoruś, RFSRR, Polska, spór terytorialny.

Mikoła Miazha – doktor habilitowany nauk historycznych Państwowego Uniwersytetu im. Franciszka Skaryny w Homlu. Zainteresowania badawcze: historia stosunków międzynarodowych w Europie Środkowo-Wschodniej w okresie międzywojennym; historia polityki zagranicznej ZSRR, Polski, Niemiec; położenie międzynarodowe Białorusi. Ważniejsze publikacje: *В тисках Рапалло: германский фактор в польско-советских отношениях 1921–1926 годов* (Гомель 2010); *Между наукой и политикой: советско-польские отношения в историографии России и Польши 1918–1941 годов* (Гомель 2014).

Анатоль Трафімчык
(Мінск)

Партызанская барацьба супраць улады ў Круговіцкай гміне ў першай палове 1920-х гг.
(па старонках тагачаснай прэсы Польскай Рэспублікі)

Масква не жадала мірыцца са стратай Заходняй Беларусі і не пакідала планаў вярнуць яе[1]. Таму ледзь не адразу пасля заключэння мірнага (!) дагавора Крэмль стаў інспіраваць разгортванне партызанскае барацьбы супраць польскае ўлады.

Багатым на звесткі па гэтым аспекце быў і Лунінецкі павет. Яго тэрыторыя была асабліва лясістай і забалочанай у паўночнай частцы (дзе акурат знаходзілася і Круговіцкая гміна). Таму, натуральна, тыя ўмовы былі спрыяльнымі для знаходжання там партызан. Да таго ж блізкае да мяжы становішча гэтай адміністрацыйнай адзінкі як мінімум пракладала праз яе шляхі перамяшчэнняў савецкіх дыверсантаў.

За першую палову 1920-х гг. па адной Круговіцкай гміне намі налічваецца не менш 15 прымяненняў сілы, якія можна кваліфікаваць як барацьбу супраць улады Польшчы. Найбольш гарачымі выдаліся 1924 і 1925 гг. Адной з прычын каталізацыі такіх дзеянняў стаў слабы ўраджай 1924 г. Гэты чыннік найперш мог падштурхнуць да ўдзелу ў злачынствах супраць польскай улады некаторых сялян з мясцовага насельніцтва. Да таго ж яно, перажыўшы шмат разоў змены ўлады, і гэтым разам не надта верыла ў трываласць польскай дзяржаўнасці і лёгка паддавалася антыдзяржаўнай прапагандзе. Можна ўявіць ступень напружанасці, калі на працягу двух гадоў — 1923 і 1924 — на розных узроўнях цыркулюравала інфармацыя пра магчымасць хуткага ўзброенага паўстання[2].

У круговіцкім наваколлі дзейнічалі савецкія баевікі на чале з Кірылам Арлоўскім (псеўданімы — Аршынаў, Муха-Міхальскі ці проста Муха) і Станіславам Ваўпшасавым. Муха-Міхальскі, дарэчы, гэта легендарызаваная асоба на капыл такога вядомага персанажа, як Робін Гуд. Пад гэтакім прозвішчам, паводле версіі С. Ваўпшасава, існаваў польскі кавалерыст у чыне харунжага, які не паладзіў з начальнікамі-афіцэрамі, таму дэзерціраваў і прымкнуў да Арлоўскага. У далейшым

[1] А. Трафімчык, *Да праблемы дзяржаўнасці распалавіненай Беларусі ў міжваенны перыяд: палітыка Крамля*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, 2008, nr 29, s. 115-129.

[2] W. Śleszyński, *Województwo Poleskie*, Kraków 2014, s. 240, 246, 250-251.

дзеля нагнятання страху на польскую ўладу Муха-Міхальскім сталі называцца іншыя савецкія партызаны[3].

Густыя лясы і непралазныя балоты Круговіцкай гміны сапраўды акаваліся вельмі спрыяльнымі для гнездавання партызанаў. Адтуль яны рабілі частыя налёты на ўстановы і маёнткі не толькі Круговіцкай гміны, але і суседніх. Пра гэта адзначаецца і ў дакументах польскіх сілавікоў[4]. Нямала ўвагі ў сувязі з гэтым удзяляла і тагачасная польская прэса.

Даволі гучны напад адбыўся 6 лютага 1924 г. У той дзень каля 50 дыверсантаў, узброеных вінтоўкамі, рэвальверамі, гранатамі, а таксама 2 кулямётамі (ручным і станковым), здзейснілі напад на маёнтак жонкі Тарасевіча ў Агарэвічах Круговіцкай гміны і ў выніку захапілі 10 коней, 5 вазоў, збрую. Пасля перарэзалі правады, якія вялі да Ганцавіч, і падаліся ў бок гміны (г.зн. Круговіч)[5]. Па ўспамінах сведкі — маладога дзецюка Уладыслава Іваноўскага (1902 г.н.), дыверсанты займаліся рабаўніцтвам мясцовых жыхароў, а ў бацькі рэспандэнта проста ў двары знялі з ног боты[6]. Падзея знайшла шырокі розгалас на газетных старонках. Так, адно з цэнтральных выданняў „Варшаўскі кур'ер" адразу пасля апісанага нападу пісаў:

„Чым даўжэй Муха-Міхальскі беспакарана грасуе на беларускай (sic! — *А. Т.*) зямлі, тым выразнейшай рэвалюцыйна-бальшавіцкая фізіяномія яго колісь дзіўных з прычыны сваёй зухаватасці і арганізаваных з вайсковай дакладнасцю бандыцкіх акцый.

З 1922 г. хроніка Лунінецкага павета адзначана 11 рабаўнічымі паходамі пад асабістым кіраўніцтвам слыннага верхавода. Абрабаваны наступныя польскія маёнткі: Сянява, Грушаўка (2 разы), Агарэвічы (3 разы!!! — клічнікі нашы. — *А. Т.*), Любашаў, Кукоў і Нача, апроч таго выкананы ў амерыканскім стылі два напады на чыгуначныя цягнікі (як бачым, геаграфія дзеянняў лакалізуецца галоўным чынам у Круговіцкай гміне. — *А. Т.*)"[7].

[3] С. Ваупшасов, *На разгневанной земле*, Минск 1965, с. 214.

[4] Гл. падрабязней: *Памяць: Гістарчна-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна*, Мінск 1999, с. 247-248.

[5] *Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы*, т. I: *(1921-1929)*, Минск 1962, с. 184.

[6] *„Dziadek w polskim mundurze": Władysław Iwanowski*, „Głos znad Niemna", 2014, nr 9, s. 7.

[7] W. Rabski, *Kartki ulotne*, „Kurjer Warszawski", 1924, R. 104, nr 46, s. 4.

Адбітак газетнага паведамлення пра напад на маёнтак у Агарэвічах.
Крыніца: W. Rabski, *Kartki ulotne*, „Kurjer Warszawski", 15 lutego 1924, R. 104, nr 46, s. 4.

Kartki ulotne.

—o—

Mucha Michalski.

Gdy do Warszawy zaczęły napływać pierwsze wieści o grasującym na kresach wschodnich bandytyzmie, z Muchą Michalskim, jako watażką opryszków, na czele, dźwięczała w tych odgłosach jakby melodja starego romantyzmu Janosików i Rinaldinich. Jak w legendzie Tatr i Abruzzów, był tam grzech w aureoli poezji, był mściciel krzywdy społecznej, była ręka, która zabija Nababów twardego serca, a karmi głodnych żebraków, były trubadurów i Donżuanów motywy.

Ale czasy romatyzmu minęły. Dzisiejsze zbójnictwo na kresach jest raczej problemem politycznym, niż złotą przędzą dla wyobraźni poety. Im dłużej Mucha Michalski bezkarnie grasuje na białoruskiej ziemi, tem wyrazistsza jest fizjognomja rewolucyjno-bolszewicka wszystkich jego, zdumiewających niekiedy swą zuchwałością i zorganizowanych z precyzją wojskową imprez bandyckich.

Od roku 1922 kronika powiatu łuninieckiego zapisała 11 wypraw zbójeckich, pod osobistem dowództwem głośnego herszta. Ograbiono następujące majątki polskie: Sieniawa, Chruszówka (2 razy), Oharewicze (3 razy), Lubaczew, Kuków i Nacz, a prócz tego wykonano w stylu amerykańskim dwa napady na pociągi kolejowe.

Zrazu miało to wszystko pozory fachowego bandytyzmu, któremu bliskość granicy bolszewickiej ułatwiała robotę. Jasne było wprawdzie, że władze sowieckie, znające doskonale kryjówki opryszków, tolerują je rozmyślnie, aby Polsce przysporzyć kłopotów, ale nie było żadnego dowodu, że rozbójnictwo Muchy Michalskiego jest najemnym sługą polityki bolszewickiej, jest awangardą rewolucji i jakby partyzantką nieregularnych oddziałów armji czerwonej. W ostatnich miesiącach dopiero wyłoniło się z tego bandytyzmu niepokojące oblicze zamachu politycznego.

Zauważono mianowicie, że Mucha Michalski, nawiasem mówiąc b. plutonowy wojsk polskich, zdobywszy jakiś dwór, poprzestaje na uprowadzaniu koni, nie czyniąc krzywdy ludziom, nie kradnąc pieniędzy, nie tykając pościeli i odzieży. Tak było np. przy trzeciem już z rzędu napadzie na Oharewicze. Zabrano dziesięć koni,—nic więcej. Wywierało to raczej wrażenie rekwizycji, niż bandytyzmu.

To zaintrygowało mieszkańców dworu oharewickiego, więc gdy herszt opryszków zasiadł do wieczerzy—rozkoszna sielanka!—stara gospodyni, znająca go już z poprzednich napadów i traktowana przez niego poufale, jako dobra znajoma, zapytała wprost, do czego właściwie potrzeba mu tylu koni?

Uśmiechnął się i odpowiedział:

— Jestem żołnierzem, a do czego mi konie potrzebne, dowiecie się niebawem.

Możnaby to uważać za zwykłą fanfaronadę, bo bandyci lubią upiększać swoje rzemiosło dekoracjami wojskowo-politycznemi, i Mucha Michalski niejednokrotnie już odśpiewał przed ograbionymi tenorową partję „mściciela”, biorącego odwet „za krzywdy ludu białoruskiego” i „prześladowanie komunistów w Polsce”. Wobec faktu jednak, że wbrew dawniejszym zwyczajom, uprowadza obecnie tylko konie folwarczne, jego „Jestem żołnierzem” i jego „Dowiecie się niebawem” musi być traktowane inaczej, niż przechwałka bandycka.

W rzeczywistości też na całem pograniczu lud białoruski, utrzymujący najściślejsze stosunki z bandytą, odwiedzający go „po tamtej stronie” i oddający „atamanowi” tysiące przysług szpiegowskich, jest najgłębiej przekonany, że Mucha Michalski tworzy z wiedzą i pomocą władzy sowieckiej oddziały partyzanckie, które z wiosną mają rozpalić powstanie na Białorusi. Dla tych oddziałów potrzeba mu koni pociągowych i kawaleryjskich.

Zresztą posiada już wszystko. Gdy d. 6 lutego napadł na Oharewicze w sile 40 ludzi, rozporządzał sześciu mitraljezami francuskiego typu. Miał też karabiny magazynowe i granaty ręczne. Wszystko wywierało takie wrażenie, jakby do wsi wkroczyło wojsko nieregularne sowietów.

Tego naprawdę dłużej tolerować nie można. Tu chodzi nietylko o bezpieczeństwo dworów polskich, tej ostoi władztwa naszego na Białorusi, tu chodzi o przygotowania rewolucyjne. Mucha-Michalski nie jest bandytą pospolitym, grabiącym na własną rękę, dla własnego zysku, lecz emisarjuszem rządu bolszewickiego, narzędziem polityki moskiewskiej, usiłującej podpalić nam kresy.

Coś się stać musi i to niezwłocznie, aby temu koniec położyć. Z chwilą, gdy straż wojskową w pasie granicznym zastąpiła policja, stosunki pogorszyły się znacznie. Wiadomo powszechnie, że tę policję organizowano na łeb na szyję, prawie bez wyboru. Że tylko cząstka jej składa się z żywiołów rutynowanych i pewnych. Że obok ludzi dzielnych, dostało się do niej sporo szumowin ulicznych. A najlepszym tego dowodem jest fakt, że niedawno 35 policjantów z bronią i rynsztunkiem zbiegło do Bolszewji.

To się mści. Dziś już nie może być mowy o „źle strzeżonej granicy”, bo ta granica nie jest prawie wcale strzeżona. Włazi, kto chce, i wyłazi, kto chce. Jeżeli niezwłocznie nie będą zorganizowane lotne oddziały kawalerji strażniczej, jeżeli nie postaramy się o drugi kordon wojskowy, jeżeli nie zastosujemy najostrzejszych represji wobec całych wsi, które są kryjówkami wywiadowców, żywicielkami bandytów i jakby armją pomocniczą Muchy Michalskiego, to możemy się doczekać nieobliczalnych wypadków, których opanowanie będzie kosztowało sto razy więcej krwi i pieniędzy, niż reorganizacja straży granicznej.

Choć zresztą Muchomichalszczyzna nie ma nic wspólnego z romantyzmem bandyckim starego stylu, to jednak byłoby może wskazano zastosować wobec niej te same środki, które niegdyś były najskuteczniejsze w walce z zbójnictwem legendowem i prawie zawsze kładły kres jego gospodarce. Wobec rozmieszczonych w każdej niemal wsi białoruskiej czat niebezpiecznego opryszka, mała jest nadzieja, aby udało się bandę jego zaskoczyć i ująć. Tylko wysoka nagroda za odkrycie jego schronisk i szlaków zbójeckich, tylko chłopskie łakomstwo złota może go oddać w ręce sprawiedliwości polskiej. Małe pieniądze nie dokonają niczego, bo drobne łapówki płaci sam bandyta. Nagroda za schwytanie rozbójnika musi być olśniewająca i ogłoszona w taki sposób i z takiemi gwarancjami, aby nikt nie mógł wątpić, że będzie istotnie, dyskretnie i bez zwłoki wypłacona. A jeżeli państwo na taką nagrodę zdobyć się nie może, niech dopomogą ziemianie kresowi. Gra naprawdę warta jest świecy.

Władysław Rabski.

Круговіцкая гміна ляжала на шляхах партызан у тым ліку падчас адной з самых скандальных, рэзанансных акцый 24 верасня 1924 г. Тады каля Баранавіч быў абрабаваны цэлы цягнік, у якім ехаў палескі ваявода Станіслаў Даўнаровіч. Яго ў сваю чаргу ганебна адлупцавалі, прычым зрабіўшы гэта рукамі аднаго з афіцэраў. Як паведамляе вядомы даследчык мінулага Заходняй Беларусі Ігар Мельнікаў, паліцыі ўдалося ўстанавіць, што савецкія дыверсанты перайшлі мяжу ў Нясвіжскім павеце, а затым перамясціліся ў раён Лунінец — Баранавічы. Там яны мелі базу прыкладна на 100 чалавек, якая знаходзілася каля Круговіч[8]. Па гарачых слядах польскія ўлады кінулі ці не ўсе магчымыя сілы. Толькі з Пружан быў накіраваны кавалерыйскі аддзел у колькасці 240 коней і з Лунінца — 110 паліцэйскіх і 4 узводы пяхоты. Вялікая тэрыторыя на ўсход і поўдзень ад Круговіч уключна з вёскамі Дзяніскавічы і Чудзін апынулася пад жорсткім кантролем карнікаў. Пачаліся арышты. Было схоплена не меней 70 асоб. У прыватнасці аддалі на разгляд ваенна-палявому суду дзяніскаўца Паўла Берташа (правільна прозвішча ўказана толькі ў польскай першакрыніцы, хто яе не чытаў, той падае „назвіско" Барташ або Бертач). Аднак нікога не прызналі датычным да нападзення і ўсіх вызвалілі (відавочна, паспрыяла такому нечаканаму гуманізму тое, што ў ходзе аперацыі выпадкова затрымалі ў Баранавіцкім павеце 16 чалавек іншай банды, якая, як аказалася, якраз і здзейсніла гэты напад). Частцы дыверсантаў удалося ўцячы за савецкую мяжу[9].

Калі падобныя дзеянні — не стыхійныя бунты тутэйшых, а барацьба савецкіх дыверсантаў — выкрываліся польскімі сілавікамі і ўдзельнікі арыштоўваліся, а віна даказвалася, то іх нярэдка чакала пакаранне смерцю. Так, 26 сакавіка 1925 г. адбыўся напад на надлясніцтва Хамінка (суседняя гміна Заастравечча). У выніку яго было ўчынена 5 забойстваў. Гэта паводле афіцыйнай інфармацыі. Ва ўспамінах відавочца, падафіцэра Корпуса Аховы Пагранічча „Людвікова", гаворыцца, што, акрамя забітых ляснічага, пісара, дзвюх жанчын-рахункаводаў і аднаго егера, знішчанымі аказаліся жонка ляснічага і яго дзеці. Сама банда ўцякла на савецкі бок мяжы. (Цікава, што здарэнне адбылося якраз падчас змены аховы на мяжы з паліцыі на пагранічнікаў[10].)

8 И. Мельников, *1924 год. «Рельсовая война» в Западной Беларуси*, [у:] Виртуальный Брест, [дата доступа: 23.03.2018], <http://virtual.brest.by/news24164.php>.

9 Гл. падрабязней: *Napad na pociąg pod Leśną*, „Ofiarom Obowiązku": wydawnictwo poświęcone pamięci poległych funkcjonariuszów policyjnych Państwa Polskiego: z kalendarzem na rok, 1925, s. 244-249; *Борьба трудящихся Западной Белоруссии*, т. I, с. 222-223; *Памяць*, с. 249.

10 A. Rosik-Rosiński, A. Ochał, *Wspomnienia podoficera KOP Antoniego Rosika-Rosińskiego*, „Przegląd Historyczno-Wojskowy", 2015, nr 16 (67)/1, s. 139-140.

Тым не менш колькі чалавек у сувязі з той страшнай акцыяй затрымалі па гарачых слядах. Шасцёх у вёсцы Лактышы, яшчэ двух на мяжы. Былі прыгавораны да расстрэлу і ў хуткім часе пакараны ў Лунінцы 2 чалавекі, адзін з якіх жыхар Круговіцкай гміны — лактышовец Давід Мышкавец. Справа Міхаіла Луганоўскага з вёскі Гута перададзена акружному суду ў агульным парадку судовага справаводства. Яшчэ адзін — лактышовец Іосіф Зуйкевіч — быў апраўданы. Варта заўважыць, што ў дакуменце не паведамляецца пра палітычную мэту таго нападу, але гаворыцца, што бандыты абрабавалі ўстанову, а значыць, кіраваліся прагай матэрыяльнай нажывы. Таксама адзначым, што нападаўшых было больш — каля 10 чалавек. Але іншых чамусьці не знайшлі. Хоць рабілі аблаву з дапамогай цэлага палка пяхоты, выкліканага адразу з Баранавіч[11]. Гэта наводзіць на думку, што астатнія маглі не быць мясцовымі, бо сваіх землякоў польская экспазітура (сетка завербаваных агентаў-даносчыкаў) выкрывала даволі спраўна. Розныя віды пакарання і нават прызнанне невінаватасці сведчыць пра ўважлівае разбіральніцтва злачынства, імкненне следчых да індывідуальнага падыходу стасоўна падазраваных.

У хроніцы газеты „Życie Polesia" паведамляецца яшчэ пра адзін напад на лясніцкую ўстанову. Гэтым разам — на лесніччоўку Людвікова, якая на той час знаходзілася ў складзе суседняй Чучавіцкай гміны. Апоўначы 14 чэрвеня 1925 г. той напад здзейсніла банда з чатырох чалавек. Вайсковы пастарунак, аднак, адкрыў стральбу па нападаўшых і прымусіў іх „уцякаць у напрамку вёсак Будча, Люшча і Чудзін"[12]. У той жа газеце паведамляецца пра сутычку з пяццю ўзброенымі людзьмі пастарунковага (напэўна, дзяніскавіцкага) Францішка Майндровіча, што адбылося 18 лютага 1925 г. за адзін кіламетр ад вёскі Дзяніскавічы[13].

[11] Archiwum Akt Nowych, Zespół „Komenda Wojewódzka Policji Państwowej w Brześciu", sygn. 2018/13, k. 110: Meldunek sytuacyjny Nr. 113 z dnia 8.V.25; *Mordercy są ujęci*, „Życie Polesia", 12 kwietnia 1925, s. 6; *Борьба трудящихся Западной Белоруссии*, т. I , с. 284-285.

[12] „Życie Polesia", 21 czerwca 1925, s. 8.

[13] *Sromotna ucieczka bandytów*, „Życie Polesia", 1 marca 1925, s. 5.

Sromotna ucieczka bandytów.

Z Łunińca donoszą, że w środę 18 bm. o godz. 18 min. 30 na drodze w odległości 1 klm. od wsi Deniskowicz gm. Kruhowicze pięciu nieznanych ludzi, uzbrojonych w karabiny napotkało poster. Majchrowicza Franciszka z VI Komp. Gr. P.

Poster. Majdrowicz na widok bandytów okrzykiem „ręce do góry" usiłował ich zatrzymać, lecz gdy w odpowiedzi bandyci rozpoczęli strzelaninę — Majchrowicz również użył broni, dając do napastników kilka strzałów, przyczem jeden z bandytów został ranny. Pozostali, podbiegłszy do rannego, zabrali go ze sobą i zbiegli w kierunku wsi Kruhowicz-Pościg zarządzony nie dał narazie rezultatu.

Адбітак газетнага паведамлення пра сутычку паліцэйскага з узброенымі людзьмі. **Крыніца:** *Sromotna ucieczka bandytów*, „Życie Polesia", 1 marca 1925, s. 5.

Прычым як не шкадавалі прадстаўнікоў польскай улады савецкія партызаны, так і да іх не было літасці. Напрыклад, у ноч з 18 на 19 верасня 1925 г. паліцыя наладзіла засаду на дыверсантаў. Імі былі браты Карпені — Дзмітрый і Андрэй. Па ўсёй бачнасці, дзяніскаўцы. Яны вярталіся з Савецкага Саюза. Нелегальна. У выніку першы быў застрэлены, другі — узяты жывым[14].

Сімптаматычна, што так званая рэйкавая вайна практыкавалася ўжо тады. Так, адзін з выпадкаў адбыўся ў Круговіцкай гміне. Як паведамляе польская крыніца, каля станцыі Ганцавічы невядомыя спрабавалі пусціць пад адхон чыгуначны састаў. Падвярнуўся таварны цягнік. У выніку рух быў на ненадоўгі час затрыманы[15].

[14] *Zajście w pasie granicznym*, „Życie Polesia", 27 września 1925, s. 8.
[15] *Udaremniony zamach na pociąg*, „Ziemia Wileńska", 3 maja 1925, s. 6.

Zajście w pasie granicznym.

W nocy z dnia 18 na 19 b. m. na skutek otrzymanej poufnie wiadomości o przekroczeniu granicy z Rosji do Polski przez bandytów Dymitrego i Andrzeja, braci Karpieniów, należących do bandy dywersyjnej Arszynowa, zostały zarządzone na chutorach, przyległych do wsi Deniskowicze przez wywiadowcę Chmielaz P. U. Ś. Łuniniec czaty na czele z Komendantem posterunku P. P. Deniskowicze, przod. Mrozem. Podczas trwania czatów, bandyci Karpienie, wracając ze wsi Deniskowicze, natknęli się na przod. Mroza, który wystrzałem karabinowem zastrzelił bandytę Dymitra Karpienia, zaś Andrzej został ujęty żywcem.

Адбітак газетнага паведамлення пра засаду паліцэйскіх на дыверсантаў.
Крыніца: *Zajście w pasie granicznym*, „Życie Polesia”, 27 września 1925, s. 8.

Udaremniony zamach na pociąg.

Onegdaj na linji Baranowicze-Łuniniec w pobliżu stacji Hancewicze nieznani złoczyńcy usiłowali spowodować wykolejenie pociągu. Gdy pociąg towarowy Nr. 372 zbliżał się do Hancewicz wjechał na wbite wpoprzek toru pale, które zmiażdżył. Wskutek uszkodzenia toru pociąg musiał się zatrzymać i dopiero po dokonanej naprawie ruszył w dalszą drogę.

Адбітак газетнага паведамлення пра дыверсію на чыгунцы ля Ганцавіч.
Крыніца: *Udaremniony zamach na pociąg*, „Ziemia Wileńska”, 3 maja 1925, s. 6.

Калі напады на адміністрацыйныя ўстановы, панскія маёнткі і нават леснічоўкі яшчэ можна было кваліфікаваць як антыпольскую барацьбу, дык рабаванне гандлёвых кропак, тым больш яўрэйскіх, больш было падобна да бандытызму. Як піша польскі даследчык тэмы В. Сляшынскі, тыя напады падзяліць на дыверсійныя і крымінальныя вельмі складана[16]. Такія выпадкі мелі месца ў Круговіцкай гміне. Толькі ў чэрвені 1925 г. у адной Будчы пацярпелі дзве мануфактурныя крамы: Гэрша Кортуша — урон ацэнены больш чым на 800 злотых[17]; Пэйсаха Галембэрта — на 3000 злотых[18]. У апошнім выпадку рабавала пяць чалавек з узбраеннем. Такія падыходы былі характэрны для прасавецкіх партызан.

Pod koniec września Alaksandr Ćwikiewicz spotkał się w Pradze z delegacją rządu białoruskiego, do której nieprzypadkowo włączono czołowych przedrewolucyjnych odrodzeniowców Zmitroka Żyłunowicza i Jankę Kupałę, a także poetę młodego pokolenia Michasia Czarota. Oni to właśnie przekazali mu oficjalną zgodę KC KP(b)B na przyjazd do Mińska, a także dostarczyli środki na przeprowadzenie zjazdu białoruskiego[39]. Kierownictwo KP(b)B wcześniej (14 sierpnia 1925 r.) przyjęło w tej sprawie rezolucję, określającą warunki przyjazdu Ćwikiewicza i jego zwolenników do Mińska.

W Berlinie 12-16 października 1925 roku odbyła się II Białoruska Konferencja Narodowa, zorganizowana przez rząd BRL na emigracji. Udział w niej wzięło dziewięciu ministrów rządu BRL, członkowie Rady BRL, a także liczni przedstawiciele środowisk białoruskich z Litwy, Czechosłowacji, Niemiec, Litwy, Polski i Łotwy. Sowiecką stronę reprezentowali Zmitrok Żyłunowicz i Alaksandr Uljanaŭ[40]. Na przewodniczącego konferencji obrano byłego ministra spraw wojskowych w pierwszym rządzie BRL, utworzonym 25 marca 1918 roku, Kastusia Jezawitawa. Referat sprawozdawczy wygłosił Alaksandr Ćwikiewicz, który nie zdążył przygotować pełnego tekstu referatu i występował, posiłkując się szczegółowymi tezami, które zachowały się w archiwum Muzeum Białoruskiego im.

[38] Tamże.

[39] „Полымя", 1925, № 7, с. 184.

[40] НАРБ, ф. 4, воп. 7, спр. 82, арк. 218.

Iwana Łuckiewicza w Wilnie[41]. Dążąc do przekonania do swych racji jak największej liczby uczestników konferencji, sprawozdawca próbował połączyć idee białoruskiego nacjonalizmu z komunizmem. Wychwalał decyzję I Kongresu Białoruskiego, który w grudniu 1917 roku opowiedział się za autonomią dla Białorusi. „Gdyby Kongres nie był rozpędzony — twierdził — na pewno całkowicie poparłby rewolucję bolszewicką". Ideę odrodzenia białoruskiego Ćwikiewicz określił jako „sojusz białoruskiego chłopstwa z rosyjskim proletariatem". „Przyszłość Białorusi — podkreślał — nierozerwalnie związana jest z losem Związku Sowieckiego i dalszym losem rewolucji socjalistycznej"[42].

Nie spełniły się przewidywania partii komunistycznej i zwolenników „zmienawiechaŭstwa", że opracowany przez Alaksandra Ćwikiewicza i poparty przez KC KP(b)B plan zjednoczenia całej białoruskiej elity politycznej na platformie prosowieckiej zostanie zrealizowany. Czterodniowe posiedzenia Białoruskiej Konferencji Narodowej przekształciły się w gorące dyskusje między zwolennikami i przeciwnikami „zmienawiechaŭstwa". Nieprzejednanym przeciwnikiem Ćwikiewicza na konferencji okazał się jeden z najbardziej szanowanych i cieszących się autorytetem działaczy białoruskich, przewodniczący Rady BRL Piotra Kreczaŭski. Odmówił on podpisania wszystkich pięciu zaproponowanych przez zwolenników Ćwikiewicza rezolucji. Nieco łagodniejszą postawę wobec inicjatyw zwolenników „zmienawiechaŭstwa" zajął zastępca Kreczaŭskiego w Radzie BRL Wasil Zacharka, który jednocześnie wykonywał obowiązki ministra finansów w Radzie Ministrów BRL. Poparł on rezolucję o zakończeniu działalności Rady Ministrów rządu emigracyjnego, natomiast nie zgodził się uznać Mińska za jedyne centrum białoruskiego ruchu niepodległościowego. Na konferencji bardzo ostro zaatakował Ćwikiewicza i jego zwolenników jeden z liderów partii eserowców białoruskich Jazep Mamońka. W swym wystąpieniu oświadczył, że kurs na współpracę z komunistami jest zgubny dla ruchu białoruskiego, że wcześniej lub później doprowadzi on do zniszczenia idei niepodległościowej. Mamońka w swym nieprzyjęciu idei „zmienawiechaŭstwa" posunął się nawet tak daleko, że na ręce przewodniczącego II Białoruskiej Konferencji Narodowej Kastusia Jezawitawa złożył pisemny protest przeciwko „rujnowaniu ruchu białoruskiego", w którym czytamy: „Rezolucja na temat sytuacji pod okupacją polską i na Białorusi Sowieckiej stanowi przykład zmienatycznictwa. Działacze, którzy poparli tę rezolucję, świadomie zdradzili cały ruch białoruski zarówno w Polsce, jak i na Łotwie. Działania te dają możliwość Polakom i Łotyszom rozpat-

41 Tamże.

42 Tamże, арк. 219.

rywać cały socjal-rewolucyjny ruch białoruski, jako akcję RKP i politykę Moskwy"[43]. Krytycznie do polityki Alaksandra Ćwikiewicza odniosła się inna wpływowa działaczka eserowców Pałuta Badunowa, która jednak sama już w listopadzie 1925 roku wyjechała do Mińska.

Te i inne protesty nie były w stanie zmienić wyraźnie prosowieckiego charakteru II Białoruskiej Konferencji Narodowej. Praktycznie zostały osiągnięte wszystkie cele postawione przez KC KP(b)B przed Alaksandrem Ćwikiewiczem i jego zwolennikami. Przyjęte na konferencji większością głosów rezolucje nie pozostawiały wątpliwości w powodzenie komunizacji ruchu białoruskiego. „W związku z tym — czytamy w jednej z rezolucji konferencji — że władza robotników i chłopów, powstała w Mińsku — stolicy Białorusi Sowieckiej, rzeczywiście dąży do odrodzenia narodu białoruskiego w dziedzinie kultury, ekonomiki i państwowości, że Białoruś Sowiecka stanowi jedyną realną siłę zdolną wyzwolić Białoruś Zachodnią spod polskiego jarzma, postanawiamy przy całkowitym poparciu organizacji krajowych: zakończyć działalność rządu Białoruskiej Republiki Ludowej i uznać Mińsk za jedyne centrum odrodzenia narodowego Białorusi"[44].

Ostre spory co do polityki władz komunistycznych na wschodzie nie przeszkadzały delegatom prawie jednogłośnie potępiać polską politykę w kwestii białoruskiej. W rezolucji „O sytuacji politycznej" czytamy: „Opanowanie przez Polskę Białorusi Zachodniej stanowi akt gwałtownej okupacji. Polska nie ma praw państwowych do zagarniętych obszarów. W związku z tym konferencja wyraża swój protest przeciwko prześladowaniom, które polskie władze stosują wobec bezbronnej ludności białoruskiej"[45].

Również w ostrych sformułowaniach utrzymana jest rezolucja na temat stosunków białorusko-litewskich. „Stosunek Litwy do spraw białoruskich był i pozostaje nieszczery. Polityka litewska cały czas traktuje Białorusinów jako kartę przetargową w sporze z Polską o Wilno. (...) Wilno i cały obszar otrzymany przez Litwę na podstawie umowy z 12 lipca 1920 roku znajduje się wewnątrz etnograficznej przeważnie białoruskiej granicy. Dlatego los Wilna powinien być rozstrzygnięty nie na postawie kombinacji dyplomatycznych czy handlu między Litwą a Polską, lecz na drodze wolnego, powszechnego referendum"[46].

II Białoruska Konferencja Narodowa zakończyła się triumfem idei „zmienawiechaŭstwa". Przeciwnicy Alaksandra Ćwikiewicza albo wkrót-

[43] „Крывіч", 1925, № 10, с. 112.
[44] Tamże, s. 116.
[45] *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, red. С. Шупа, Вільня — Нью Ёрк — Менск — Прага 1998, т. 1, кн. 2, с. 1630.
[46] Tamże, s. 1631.

ce uznali swe pomyłki i dołączyli się do jego obozu, albo na długie lata zostali zmarginalizowani. Sam Ćwikiewicz wyjechał do Mińska już w dziesięć dni po zakończeniu konferencji. Pod koniec 1925 roku do stolicy BSRS przybyli między innymi sekretarz państwowy BRL Uładzimir Prakulewicz, szef komisji kontroli państwowej Lawon Zajac, skarbnik BRL Alaksandr Walkowicz. Już pod koniec 1925 roku zaczęli również wracać ci, którzy na konferencji zajęli krytyczną postawę wobec Ćwikiewicza. Do Mińska przyjechała Pałuta Badunowa.

Zwycięstwu idei „zmienawiechaŭstwa" na II Białoruskiej Konferencji Narodowej w Berlinie towarzyszył proces komunizacji białoruskiej elity politycznej w II Rzeczypospolitej. Branisłaŭ Taraszkiewicz, Maksim Bursiewicz, Anton Łuckiewicz, Radasłaŭ Astroŭski i inni niepodległościowcy zakładają słynne ugrupowanie polityczne o nazwie Białoruska Włościańsko-Robotnicza Hromada, prawie wszyscy potajemnie wstępują do Komunistycznej Partii Zachodniej Białorusi. Wpływ idei „zmienawiechaŭstwa" był tak wielki, że w środowisku niepodległościowców w II RP, z których większość jeszcze kilka lat temu zakładała niepodległą BRL, zapanowała tendencja negowania historycznej roli BRL na rzecz gloryfikowania faktu stworzenia BSRS 1 stycznia 1919 roku. Na przykład wileński Białoruski Komitet Narodowy, skupiający w swych szeregach wszystkie liczące się grupy polityczne Białorusinów, w lutym 1926 roku zdecydował odwołać wielką uroczystość z okazji ósmej rocznicy proklamowania BRL i ograniczyć się jedynie do okolicznościowego referatu[47]. Z referatem na temat rocznicy wystąpił wiceprzewodniczący Białoruskiego Komitetu Narodowego Anton Łuckiewicz, który w przemówieniu skoncentrował się na aktualnych sprawach białoruskich, prawie zupełnie ignorując historyczny aspekt utworzenia BRL. Natomiast wysoko ocenił on wyniki konferencji berlińskiej i nazwał ją „znamiennym wydarzeniem w życiu narodu białoruskiego", a decyzję o zaprzestaniu działalności rządu BRL i przeprowadzkę większości ministrów gabinetu Alaksandra Ćwikiewicza do Mińska — „historyczną potrzebą czasu"[48].

Przeciwnicy białoruskiego „zmienawiechaŭstwa", chociaż całkowicie zostali zepchnięci na margines, nie zamierzali składać broni. Przewodniczący Rady BRL (nominalny przywódca państwa białoruskiego na emigracji) Piotra Kreczaŭski, który w 1923 roku osobiście desygnował Alaksandra Ćwikiewicza na premiera Rady Ministrów BRL, ostro zwalczał byłego kolegę na łamach prasy emigracyjnej. „Awanturnictwo Ćwikiewicza

[47] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 163, арк. 12.
[48] Tamże, арк. 3-4.
[49] „Эхо", 15 XII 1925.

— pisał — można rozpatrywać jedynie jako zdradę narodową. Nie spełnił on woli narodu i poszedł do obozu jego wrogów w celu wzmocnienia jarzma okupantów nad zamęczoną ojczyzną"[49]. Tamasz Hryb, jeden z liderów partii eserowców, do której należał również Ćwikiewicz, w artykule nazwał swego byłego szefa „białoruskim Cziczikowem[50], który sprzedaje bolszewikom martwe dusze członków swego rządu"[51].

W celu przeciwdziałania planom Ćwikiewicza Tamasz Hryb opracował nawet specyficzną koncepcję neutralizacji wpływów „zmienawiechaŭstwa". Do Kowna, gdzie rezydował poprzednik Ćwikiewicza na posadzie prezesa Rady Ministrów BRL Wacłaŭ Łastoŭski, wysłano memorandum. Liczono, że autorytet Łastoŭskiego pozwoli na stworzenie alternatywnego w stosunku do komunistów kierowniczego ośrodka ruchu białoruskiego. Tamasz Hryb zaproponował Łastoŭskiemu rezygnację z jego prolitewskiej orientacji politycznej, przyjazd do Wilna i pokierowanie „masową organizacją typu narodnickiego", zdolną stać się przeciwwagą dla tworzonej przez komunistów i ich sojuszników Hromady. Planowano również ściągnąć do Wilna przewodniczącego Rady BRL Piotra Kreczaŭskiego[52]. Plany te jednak pozostały jedynie planami. Idee „zmienawiechaŭstwa" powoli ogarniały swym wpływem również kowieński ośrodek białoruski. Wkrótce i sam Łastoŭski padł ofiarą komunistycznej propagandy i skierował się do Mińska.

Prawdziwym apogeum zwycięstwa „zmienawiechaŭstwa" stała się konferencja akademicka poświęcona reformie pisowni białoruskiej i alfabetu, którą zorganizowano z wielką pompą w Mińsku 14-19 listopada 1926 roku. Wśród 69 jej uczestników znajdowali się naukowcy z Niemiec, Polski, Litwy i Łotwy. Na zaproszenie Inbiełkultu przyjechali również liderzy białoruskich mniejszości z Litwy i Łotwy — Wacłaŭ Łastoŭski i Kastuś Jezawitaŭ. Liderom prokomunistycznego białoruskiego ruchu w Polsce polskie władze odmówiły wydania paszportów zagranicznych, dlatego na konferencji odczytano telegramy powitalne od Bronisława Taraszkiewicza, Antona Łuckiewicza i Radasława Astroŭskiego[53].

Konferencja mimo czysto naukowego charakteru miała spory wydźwięk polityczny. Był to swoisty triumf zjednoczenia ideologii komunistycznej z ideologią białoruskiego nacjonalizmu. Świadczą o tym liczne imprezy towarzyszące konferencji. Na uroczystym jej otwarciu od razu po wykona-

[50] Wyjątkowo negatywna postać w powieści Nikołaja Gogola „Martwe dusze".

[51] „Бюлетэнь Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў", 19 XI 1925.

[52] БДАМЛіМ, ф. 3, воп. 1, спр. 163, арк. 84.

[53] *Працы акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі*, Менск 1927, с. 34.

niu komunistycznego hymnu „Międzynarodówka”, który jednocześnie był oficjalnym hymnem państwowym Związku Sowieckiego, orkiestra wykonała „białoruską marsyliankę *Ad wieku my spali*” — hymn BRL, który w podniosłej atmosferze śpiewali goście i gospodarze konferencji.

Wybitny poeta łotewski i polityczny działacz lewicowy, jeden z twórców niepodległego państwa łotewskiego Jan Rajnis, pochodzący z Łatgalii, gdzie mieszkała stosunkowa liczna mniejszość białoruska, był jednym z czołowych honorowych gości konferencji. Swoje wrażenia z Mińska przedstawił na łamach łotewskiej gazety „Socjaldemokrata”: „Odrodzenie narodowe na Białorusi — pisał — jest na tyle mocne, że w jego cieniu pozostają wszystkie inne interesy duchowe. (...) Białorusinów ogarnęło cudowne poczucie odrodzenia narodowego”[54].

Wizyta na Białorusi liderów emigracji i ich udział w konferencji spowodowały jeszcze większy zamęt w środowisku emigracji białoruskiej. Idei „zmienawiechaŭstwa” uległ niedawny czołowy przeciwnik Alaksandra Ćwikiewicza, jego poprzednik na posadzie premiera rządu BRL, Wacłaŭ Łastoŭski, który tak ostro krytykował go na lamach wychodzącego w Kownie czasopisma „Krywicz”. Teraz Łastoŭski staje się zwolennikiem teorii „demokratyzacji” Białorusi Sowieckiej pod wpływem działaczy niepodległościowych, biorących aktywny udział w białorutenizacji. Łastoŭski sam decyduje się na przyjazd do BSRS, a jednocześnie wystosowuje apel do wszystkich białoruskich działaczy politycznych spoza BSRS o braniu przykładu z jego postępowania. Na łamach redagowanego przez siebie „Krywicza” zaapelował: „Wszyscy nasi pracownicy kultury, którzy znajdują się poza Mińskiem, powinni przyjść z pomocą Inbiełkultowi w jego wysiłkach mających na celu odbudowanie kultury białoruskiej. Kultura to nie partyjny, lecz ogólnonarodowy skarb”[55]. Sam Łastoŭski po przyjeździe do Mińska został dyrektorem Państwowego Muzeum Białoruskiego, a później sekretarzem naukowym Inbiełkultu i Akademii Nauk BSRS.

Lata dwudzieste ubiegłego stulecia stały się symbolem zwycięstwa idei „zmienawiechaŭstwa”. Białoruski ruch narodowy za granicami BSRS znalazł się, poza nielicznymi wyjątkami, pod wpływem partii komunistycznej. W rezultacie dwóch z trzech byłych premierów BRL (Alaksandr Ćwikiewicz i Wacłaŭ Łastoŭski) razem z wielką grupą swych zwolenników przyjechali do BSRS, by wziąć udział w białorutenizacji, natomiast trzeci (Anton Łuckiewicz) zaangażował się w sponsorowaną przez komunistów akcję utworzenia w II RP Białoruskiej Robotniczo-Włościańskiej Hroma-

[54] НАРБ, ф. 701, воп. 1, спр. 98, арк. 154.

[55] „Крывіч”, 1927, № 12, с. 94.

dy. Antysowiecki nurt w ruchu białoruskim znalazł się w sytuacji permanentnego kryzysu, z którego nie zdołał wyjść nawet w sytuacji „wielkiego terroru” w Związku Sowieckim i fizycznego zniszczenia prawie wszystkich zwolenników „zmienawiechaŭstwa”. Dopiero wydarzenia II wojny światowej nieco ożywiły ten nurt.

Dla zwolenników „zmienawiechaŭstwa” zwycięstwo lat 20. XX wieku już wkrótce przekształci się w osobistą tragedię. Jedni prawie od razu po przekroczeniu granicy zostaną aresztowani i skazani (Jazep Mamońka), inni zdążą jeszcze trochę nacieszyć się udziałem w białorutenizacji i pracą na wysokich posadach państwowych. Zmiotła ich pierwsza jeszcze łagodna fala represji antybiałoruskich w latach 1930-1931. Prawie nikt z nich nie przeżył „wielkiego terroru” lat 1937-1938. Zginęli przed plutonem egzekucyjnym NKWD jako polscy lub angielscy szpiedzy. Zapłacili najwyższą cenę za swoją naiwność, a możliwe, że za ofiarność i wierność ideałom białoruskości.

Bez względu na tragiczne doświadczenia stalinizmu lata dwudzieste ubiegłego stulecia weszły do historii narodu białoruskiego jako kluczowy, decydujący moment w kształtowaniu się świadomości narodowej Białorusinów, porównywalny prawdopodobnie z okresem po rozpadzie Związku Sowieckiego i pojawieniu się na mapie Europy niepodległego państwa białoruskiego. Istnienie tego państwa mimo w dużej mierze autokratycznego charakteru reżimu prezydenta Aleksandra Łukaszenki gwałtownie przyspieszyło procesy uświadomienia narodowego Białorusinów.

W latach 20. XX wieku podobnym czynnikiem, przyspieszającym uświadomienie narodowe Białorusinów, była polsko-bolszewicka rywalizacja o względy narodu białoruskiego i prowadzona przez nią polityka partii komunistycznej, noszącą nazwę korienizacji i białorutenizacji. Represje lat 30. XX wieku, mimo bezprecedensowych strat elity intelektualnej narodu, jedynie zahamowały, ale nie zatrzymały procesu kształtowania się jedności narodowej Białorusinów. Dziś już nikt i nic nie jest w stanie wymazać z mapy współczesnej Europy państwa białoruskiego. Wyjątkowa w tym zasługa białoruskich nacjonal-komunistów, niepodległościowców — zwolenników „zmienawiechaŭstwa”, którzy ulegli wpływom iluzji zbudowania rzeczywistego domu białoruskiego pod komunistycznym szyldem i zapłacili za to najwyższą cenę — stracili własne życie. Można być skrajnym antykomunistą, ale nie można nie uznać obiektywnego faktu historycznego — komunizmu, będącego w latach 20. XX wieku logicznym sojusznikiem białoruskich odrodzeniowców, zdecydowanie sprzyjającego założeniu podwalin pod współczesny europejski naród i jego dzisiejsze państwo.

Summary

Belarusian *smenovekhovstvo*

The term *smenovekhovstvo* symbolises a short-term co-operation of Belarusian nationalists, the founders of the Belarusian People's Republic in 1918, with the communist party in the period of Belarusization. In the course of the implementation of the ideology of *smenovekhovstvo*, two out of three former prime ministers of the Belarusian People's Republic (Alexander Tsvikevich and Vatslaw Lastowski) together with a numerous group of their supporters came to BSSR to take part in „Belarusization", whereas the third (Anton Lutskevich) became involved in founding — which was sponsored by the communists — the Belarusian Peasants' and Workers' Union (Hramada) in the Second Polish Republic. The anti-Soviet fraction in the Belarusian movement entered a permanent crisis and could not recover from it even against the background of the Great Purge in the Soviet Union and the physical annihilation of nearly all of the proponents of *smenovekhovstvo*.

For the proponents of *smenovekhovstvo* themselves, the victory of the 1920s was soon to transform into a personal tragedy. Some of them were arrested and sentenced almost immediately after crossing the border (Jazep Mamonka) and others were to enjoy for some time their participation in „Belarusization" and work in high-profile state jobs. Most of them were killed in the first, relatively mild, wave of anti-Belarusian repressions in 1930-1931. And almost no one survived the Great Purge in the years 1937-1938. Regardless of the tragic experience of Stalinism, the 1920s became a part of the history of the Belarusian nation as a key and decisive moment in the shaping of the Belarusian national awareness, probably comparable to the period after the dissolution of the Soviet Union and the appearance of the independent Belarusian state on the map of Europe.

Keywords: Belarus, *smenovekhovstvo*, Belarusization, Great Purge

Змест

Беларускае зменавехаўства

Тэрмін «зменавехаўства» сімвалізуе кароткачасовае супрацоўніцтва беларускіх незалежнікаў, заснавальнікаў у 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі з камуністычнай партыяй у перыяд правядзення беларусізацыі. У ходзе рэалізацыі ідэалогіі зменавехаўства двух з ліку трох былых прэм'ер-міністраў БНР (Аляксандр Цвікевіч і Вацлаў Ластоўскі) разам з вялікай групай сваіх паплечнікаў пераехалі ў БССР, каб прыняць удзел у беларусізацыі, а трэці (Антон Луцкевіч) уключыўся ў падтрымліванае камуністамі заснаванне ў II Рэчы Паспалітай Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Антысавецкая плынь у беларускім руху апынулася ў сітуацыі перманентнага крызісу, з якой не здолела выйсці нават на фоне вялікага тэрору ў Савецкім Саюзе і фізічнага знішчэння амаль усіх прыхільнікаў зменавехаўства.

Для саміх зменавехаўцаў перамога 1920-х гадоў ужо неўзабаве пераменіцца ў асабістую трагедыю. Адны амаль зразу пасля перасячэння мяжы будуць арыштаваны і асуджаны (Язэп Мамонька), іншыя нацешацца трохі ўдзелам у беларусізацыі і працай на высокіх дзяржаўных пасадах. Змяла іх першая, яшчэ лагодная хваля антыбеларускіх рэпрэсій 1930-1931 гадоў. Аднак амаль ніхто не перажыў вялікага тэрору 1937-1938 гадоў. Нягледзячы на трагічныя паслядоўнасці сталінізму, дваццатыя гады мінулага стагоддзя ўвайшлі ў гісторыю беларускага народа як ключавы вырашальны момант у фармаванні нацыянальнай тоеснасці беларусаў, які можна праўдападобна прыраўняць да перыяду пасля развалу Савецкага Саюза і з'яўлення на карце Еўропы незалежнай беларускай дзяржавы.

Ключавыя словы: Беларусь, зменавехаўства, беларусізацыя, вялікі тэрор.

Mikołaj Iwanow — profesor dr hab. Zatrudniony na Uniwersytecie Opolskim. Rosjanin urodzony na Białorusi. Po małżeństwie z Polką mieszka w Polsce od 1984 r. W latach 1989-2004 pracownik etatowy (editor-broadcaster) Radio Wolna Europa — Radio Swoboda w Monachium i Pradze. Pracował w redakcjach białoruskiej i północno-kaukaskiej. Autor ponad stu prac naukowych i publicystycznych wydanych w Polsce, na Białorusi, w Wielkiej Brytanii, Stanach Zjednoczonych, Niemczech, Finlandii, Izraelu i na Ukrainie. Za pracę *Pierwszy naród ukarany. Polacy w Związku Radzieckim, 1921-1939* został uhonorowany wieloma polskimi i międzynarodowymi nagrodami, m.in. nagrodą „Polityki" oraz imienia prezydenta Edwarda Raczyńskiego (Londyn). Wykładał i wygłaszał odczyty na uniwersytetach w Stanfordzie (Stany Zjednoczone), paryskiej Sorbonie, Uniwersytecie Londyńskim i Uniwersytecie w Jerozolimie.

Віталь Гарматны
(Мінск)

Арганізацыя палявання і аховы жывёл у Палескім ваяводстве ў 1921-1939 гг.

Уводзіны. Пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскай мірнай дамовы Заходняя Беларусь трапіла ў склад польскай дзяржавы. На гэтых землях быў праведзены новы адміністратыўны падзел, вынікам чаго стала стварэнне Палескага ваяводства, тэрыторыя якога ў асноўным супадала з сучаснай Брэсцкай вобласцю (за выключэннем сучасных Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў). У міжваенны перыяд Палескае ваяводства было самай вялікай па тэрыторыі адміністратыўнай адзінкай і разам з тым найменш развітым у сацыяльна-эканамічным плане рэгіёнам краіны[1]. Дамінуючую ролю ў эканамічным жыцці Палесся ў 1921-1939 гг. адыгрывала сельская гаспадарка, ураджайнасць вырошчваных раслін знаходзілася на апошнім месцы ў краіне, акрамя таго, захоўвалася буйное памешчыцкае землеўладанне, а істотная частка мясцовага сялянства пакутавала ад малазямелля, што ў многім было абумоўлена наяўнасцю шматлікіх забалочаных абшараў[2].

Адначасова Палескае ваяводства заставалася сапраўдным раем для паляўнічых і простых вандроўнікаў дзякуючы захаванасці сваёй унікальнай прыроды і наяўнасці шматлікай дзічыны, перш за ўсё на абшарах паўсюднавядомай яшчэ з царскіх часоў Белавежскай пушчы, а таксама непаўторнай і старадаўняй культуры мясцовага насельніцтва. У цэлым Палессе ўспрымалася тады як амаль адзіны ў Еўропе запаведнік некранутай прыроды і этнаграфіі, своеасаблівая казачная краіна[3].

[1] *Polesie*, [дата доступу: 05.08.2018], <http://www.wlad.com.pl/Polesie.htm>.

[2] K. Mason, *W lasach poleskich. Tradycje myśliwskie na Polesiu*, [дата доступу: 05.08.2018], <https://www.rp.pl/artykul/649453-W-lasach-poleskich—Tradycje-mysliwskie-na-Polesiu.html>; J. Niezbrzycki, *Polesie: opis wojskowo-geograficzny i studjum terenu*, Warszawa 1930, s. 322.

[3] В. Лабачэўская, *Кінарэпартаж з мінуўшчыны. Палеская хроніка з венецыянскай адзнакай*, [дата доступу: 15.01.2019], <http://kimpress.by/index.phtml?page=2&id=1474&mode=print>; Е. Н. Мешечко, Д. В. Никитюк, *Развитие туристско-экскурсионной деятельности на территории Брестской области в 20-30 гг. XX века*, «Вучоныя запіскі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Частка 2. Прыродазнаўчыя навукі», 2009, вып. 5, с. 129-144; Т. Хвагіна, *Палескія мястэчкі ў этнічным турызме Беларусі*, [у:] *Этнакультурны турызм у трансгранічным памежжы Гродзенскай вобласці і Сувалкаўскім субрэгіёне: зб. навук. арт.*, рэд. І. І. Трацяк, Гродна 2013, с. 35; M. Marczak, *Przewodnik po Polesiu*, Brześć 1935, s. 17.

Вялікую ўвагу пры даследаванні азначанага пытання заслугоўвае нарыс Баляслава Свентаязерскага „Паляванне на Крэсах Усходніх у апошнім стагоддзі. 1850-1936”, у якім разгледзеў развіццё паляўнічай справы на Палессі, паказаў асноўныя паляўнічыя звычаі і традыцыі, метады і аб’екты палявання[4]. У мастацкай форме паляванне на Палессі ў міжваенны перыяд знайшло адлюстраванне ў славутай аповесці вядомага тагачаснага пісьменніка Антонія Фердынанда Асендоўскага „У палескіх джунглях”, у якой маляўніча расказваецца аб незвычайных прыгодах тут чатырох юнакоў[5].

Паляўнічыя арганізацыі. З самага пачатку аднаўлення Польскай дзяржавай незалежнасці ў Брэсце ўзнікла і пачала актыўна дзейнічаць даволі шматлікая група паляўнічых-энтузіястаў, якая ўключылася ў працэс стварэння тут паляўнічых арганізацый. Першай падобнай арганізацыяй, што дзейнічала ў гэты час у горадзе, быў Брэсцкі гурток паляўнічых, зарэгістраваны 31 сакавіка 1921 г. На 1928 г. у яго шэрагах налічвалася 30 членаў.

З моманту ўзнікнення ў 1923 г. галоўнай арганізацыі, якая аб’ядноўвала ў сваіх шэрагах паляўнічых Польшчы, Цэнтральнага Саюза польскіх паляўнічых арганізацый (Centralny Związek Stowarzyszeń Łowieckich, ЦСППА), мясцовыя паляўнічыя бралі актыўны ўдзел у яго рабоце[6]. На арганізацыйным з’ездзе ЦСППА 9 ліпеня 1923 г. Брэстчыну прадстаўляў маёр Браніслаў Кудэльскі з Паляўнічай секцыі Спартовага вайсковага клуба „Крэсы”. 10 верасня 1923 г. Брэсцкі гурток паляўнічых рэарганізаваны як філія ЦСППА. На 1928 г. старшынёй Брэсцкага саюза паляўнічых быў Тэадор Талочка, яго намеснікам — Ян Падгурскі, сакратаром — Баляслаў Фрыдрыховіч. Сядзіба гарадскіх паляўнічых знаходзілася ў памяшканні мясцовага кінатэатра (вул. 3-га Мая, 38), другім адрасам можна назваць кватэру Вацлава Квяткоўскага на вул. Стэцкевіча, 23. У 1928 г. ганаровым членам гарадской паляўнічай арганізацыі быў мясцовы ваявода Станіслаў Даўнаровіч, дэлегатамі ЦСППА з Брэсцкага павета пасля смерці ў 1924 г. маёра Б. Кудэльскага з’яўляліся Аляксандр Залеўскі (Брэст, вул. Стэцкевіча, 12) і Станіслаў Зданьскі (Лышчыцы).

4 B. Świętorzecki, *Myślistwo na Kresach Wschodnich w ostatnim stuleciu 1850-1936*, Malinowszyzna 1936.
5 A. F. Ossendowski, *W polskiej dżungli*, Lwów 1938.
6 *Łowiectwo polskie w okresie międzywojennym i podczas II wojny światowej*, [дата доступу: 25.12.2018], <http://www.kulturalowiecka.pl/artykuly_prasowe/pzl_miedzywojnie.pdf>.

Пра першыя структуры ЦСППА ў паветах Палескага ваяводства вядома толькі з 1937 г. У 1939 г. Ваяводскую раду ЦСППА ў Брэсце (сядзіба на вул. Стэцкевіча, 30) узначальваў князь Караль Радзівіл (пражываў у Манькавічах Столінскага павета, памешчык і грамадскі дзеяч), віцэ-старшынямі былі Юзаф Галыньскі (Брэст, вул. Стэцкевіча, 40, адвакат) і Вітальд Заянчкоўскі (Брэст — Пінск, камандуючы Пінскай флатыліяй, вядомы як „князь Палесся"). З 1937 г. дзейнічала і Брэсцкая павятовая рада ЦСППА на чале з Францішкам Цвіклінскім (даныя на 1939 г.).

У разгляданы перыяд у Брэсце дзейнічалі тры крамы са зброяй і паляўнічымі прыладамі. Першы з іх размяшчаўся на вул. 3 Мая, 23, належаў Г. Чэскешу і М. Пашчу і гандляваў зброяй; другі называўся „Стралец", па адрасе вул. Люблінская, 26, уласнік Ян Галембоўскі, у асартыменце зброя, паляўнічыя прылады і боепрыпасы; трэці называўся „Дзіяна", знаходзіўся па вул. Стэцкевіча, 23, гаспадар Вацлаў Квяткоўскі, у продажы зброя і амуніцыя[7].

Да ліку брэсцкіх паляўнічых належалі многія знакамітыя і ўплывовыя жыхары горада і ваколіц, перш за ўсё, зразумела, афіцэры, чыноўнікі, прадстаўнікі самакіравання і памешчыкі, такім чынам, паляванне разглядалася як адна з асноўных прыкмет прыналежнасці да тагачаснай эліты. Палескія паляўнічыя добра ведалі норавы дзічыны, умела імітавалі іх голас, шырока выкарыстоўвалі спецыяльна вывучаных сабак і падрыхтаваныя пасткі[8]. Для паляўнічых ЦСППА прапанаваў шэраг выданняў, самым вядомым з якіх быў „Каляндар паляўнічага" на кожны каляндарны год, у якім распісваліся дазволеныя тэрміны палявання на вызначаныя пароды жывёл, парады па арганізацыі палявання і заканадаўчая рэгуляцыя палявання[9]. Яскравым пацвярджэннем асаблівых адносін палескіх улад да палявання з'яўляецца штогадовае правядзенне на пачатку лістапада ў Пінску ў 1930-х гг. „Паляўнічага свята (святога Губерта)", на якое з'язджаліся паляўнічыя з усёй Польшчы[10].

У цэлым на той час К. Радзівіл быў самым вядомым паляўнічым Палесся[11], які за сваё апякунства над ласямі на тэрыторыі Давыд-Гарадоцкай ардынацыі атрымаў шэраг міжнародных узнагарод. Так,

[7] W. S. Kobylarz, *Organizacje łowieckie w Brześciu n/Bugiem w latach 1921-1939*, „Echa Polesia", 2013, nr 1, s. 42-44.

[8] *Полесье. Материальная культура*, ред. В. К. Бондарчик, Киев 1988, с. 158, 163.

[9] *Kalendarz myśliwski na 1938 rok*, Warszawa [1937].

[10] П. Цихорацки, А. И. Ильин, *Развитие туризма на территории Полесского воеводства в 30-х годах XX века*, «Туризм и гостеприимство», 2018, № 1, с. 51.

[11] D. Zagacki, *Polowania w Deniskowiczach*, „Echa Polesia", 2018, nr 2, s. 59-62.

у нарысе Мечыслава Арловіча „Турызм на Палессі" (1938) адзначаецца, што Першая сусветная вайна нанесла вялікі ўрон фаўне Палесся. За гэтыя гады былі знішчаны амаль усе ласі. Калі ў раёне Давыд-Гарадка дзякуючы намаганням князя Карла Радзівіла колькасць ласёў была даведзена да 450 у 1936 г., то, напрыклад, у такіх надзвычай спрыяльных для ласёў лясах каля вёскі Чучавічы Лунінецкага павета іх было толькі некалькі дзясяткаў[12].

На той час паляўнічыя выпрацавалі сваю ўнікальную культуру, у многім падобную на вайсковую (так, пачатак палявання параўноўваўся з уступленнем у бой, а „павадыр палявання" меў фактычна дыктатарскія паўнамоцтвы і разглядаўся як „кіраўнік невялікай баталіі"), з жорстка распрацаванымі іерархіяй, раскладам і субардынацыяй, без чаго быў абсалютна немагчымым поспех на паляванні[13]. Напрыклад, князь К. Радзівіл запрашаў на шматдзённае паляванне, якое мела добрае арганізацыйнае забеспячэнне, не толькі памешчыкаў навакольнага Столінскага павета і сваякоў, але і ўплывовых польскіх палітычных дзеячаў (графа К. Замойскага, князёў Любамірскіх, Друцкіх-Любецкіх і інш.), дыпламатаў. Вельмі часта ў паляванні ўдзельнічаў кіраўнік англійскай ваеннай місіі ў Польшчы генерал Адрыян Картон дэ Віарт[14]. Як апісвалася ў адным з тагачасных выданняў: «Часцей за ўсё генерал палюе на бекасаў, таму, што гэта вельмі хуткая птушка, і забіць яе вельмі цяжка. Радзей палюе на качкі, якія пазней аддае сваім працоўным, бо сам не есць качак. На паляванні заўсёды прысутнічае гаявы, які зараджае стрэльбу»[15].

Заканадаўчае рэгуляванне палявання і аховы жывёл. Першым і асноўным заканадаўчым актам у справе рэгуляцыі палявання ў міжваеннай Польшчы стала распараджэнне прэзідэнта міжваеннай Польшчы Ігнацы Масьціцкага ад 3 снежня 1927 г. „Аб паляў-

12 *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна*, [дата доступу: 15.01.2019], <http://luninec.by2.by/pamiac/a10.html>.

13 T. Budrewicz, *Myśliwi i naganiacze. Stratyfikacja ról społecznych na pograniczu*, „Napis. Pismo poświęcone literaturze okolicznościowej i użytkowej", 2005, nr 21, s. 120-145; J. Cheda, *Łowiectwo i jego rola w życiu społecznym Wielkiej Brytanii i Polski*, „Civitas Hominibus: rocznik filozoficzno-społeczny", 2010, nr 5, s. 91-105.

14 А. М. Вабішчэвіч, *Грамадска-культурнае і асветніцкае жыццё польскай супольнасці ў заходнебеларускіх землях у 20-30-я гг. XX ст.*, «Україна: культурна спадщина, національна свідомість, державність», 2008, № 17, с. 272.

15 І. Мельнікаў, *Картон дэ Віарт. Прыгоды палескага Джэймса Бонда*, [дата доступу: 15.01.2019], <https://kyky.org/heroes/karton-de-viart-prygody-paleskaga-dzheymsa-bonda>.

нічым праве"[16]. Варта падкрэсліць, што заканадаўства міжваеннай Польшчы ў сферы палявання было самым суровым у тагачаснай Еўропе[17] і прадугледжвала хуткае правапрымяненне адміністрацыйных штрафаў ад 50 да 5000 злотых і нават арышту ад 4 тыдняў да 6 месяцаў. Вызначэннем памеру штрафаў займаўся павятовы стараста за выключэннем самых цяжкіх парушэнняў, якія разглядаў павятовы суд[18]. Згодна заканадаўству чалавек, які нанёс прыродзе шкоду, павінен быў у адпаведным памеры кампенсаваць яе[19]. У цэлым паводле ацэнак сучаснікаў польскі закон аб паляванні быў дзейным і менавіта дзякуючы яму ўладам удавалася захаваць колькасць жывёлы на ранейшым памеры, нягледзячы на шырокі маштаб палявання[20]. Акрамя таго дзякуючы таму, што адстрэлу пераважна падлягалі хворыя і старыя жывёлы, у цэлым гэта ішло на агульную карысць папуляцыі.

Згодна дадзенаму закону права паляваць мелі ўсе грамадзяне міжваеннай Польшчы, але зразумела, што найбольш зручна скарыстацца ім маглі перш за ўсё менавіта памешчыкі, уладальнікі буйных зямельных абшараў[21]. Адпаведна на той час культура палявання была цесна звязана са шляхецкай, разглядалася як адна з форм прывілеяў. Кожны паляўнічы павінен мець з сабой адпаведным чынам афармленае пасведчанне („карту паляўнічага") і дазвол на адстрэл жывёл. У некаторых павятовых староствах узнікала пытанне, хто павінен аплачваць друк „карт паляўнічага" і ад якой даты вылічваць гадавы тэрмін сапраўднасці карты: каляндарны (з 1 студзеня па 31 снежня), бюджэтны год (з 1 красавіка да 31 сакавіка) ці паляўнічы сезон (з 1 сакавіка да 28 лютага)[22]. Кожнае павятовае староства абавязвалася да сярэдзіны студзеня штогод рабіць справаздачу ў ваяводства аб колькасці мясцовых паляўнічых.

Поўнасцю забаранялася паляванне на зуброў і баброў, ласіц. Цэлы год можна было паляваць на ваўкоў, ліс, выдраў, куніц, тхароў,

[16] *Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 3 grudnia 1927 r. o prawie łowieckim*, „Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej", 1927, nr 110, poz. 934.

[17] *Problemy współczesnego łowiectwa w Polsce*, red. D. J. Gwiazdowicz, Poznań 2012, s. 43.

[18] M. Raba, *Karnoprawna ochrona zwierząt łownych*, „Prokuratura i Prawo", 2010, nr 9, s. 153.

[19] M. Flis, B. Rataj, *Szkody łowieckie — nowe podejście do problemu*, „Wieś i Rolnictwo", 2017, nr 1, s. 151.

[20] M. Marczak, *Przewodnik po Polesiu*, s. 17.

[21] J. Cheda, *Łowiectwo i jego rola w życiu społecznym Wielkiej Brytanii i Polski*, „Civitas Hominibus: rocznik filozoficzno-społeczny", 2010, nr 5, s. 95.

[22] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (далей: ДАБр.), ф. 1, воп. 6, спр. 3308, арк. 22: Отчёты поветовых старосте об установлении контроля за охотой в 1936 г.

гарнастаяў, трусоў, ястрабаў-галубятнікаў, сарок і варон. Нельга было паляваць ад заходу да ўсходу сонца, акрамя жывёл, які вялі начны лад жыцця. Забаранялася паляваць падчас набажэнстваў у нядзелю і ўрачыстыя святы на адлегласці менш 2 кіламетраў ад святыні. Найменшай плошчай для арганізацыі паляўнічага надзела вызначаліся 100 га, а ў выпадку, калі на тэрыторыі асобнай гміны не мелася такой плошчы, дазвалялася арганізацыя сумеснага. Нельга было паляваць на адлегласці менш 100 метраў ад жылых пабудоў і могілак, а таксама з сабакамі на паляўнічым участку плошчай менш 2000 га[23].

Галоўнымі месцамі для палявання разглядаліся паўднёва-ўсходнія ваколіцы Белавежскай пушчы ў Пружанскім павеце (непадалёку ад Івацэвіч) і радзівілаўскія лясы ў Лунінецкім і Столінскім паветах[24]. Кожны ўчастак, дзе дазвалялася весці паляванне, павінен быць зарэгістраваны ў дзяржаўных органах з заключэннем дамовы з прадстаўнікамі мясцовага насельніцтва. Напрыклад, у лістападзе 1934 г. было вырашана стварыць у вёсцы Забалаць гміны Велікарыта Брэсцкага павета сумесны паляўнічы ўчастак абшарам 2202 га. Першы агульны сход выбаршчыкаў прайшоў у вёсцы 19 снежня 1934 г. На ім замест войта гміны, як таго патрабавала заканадаўства, прысутнічаў толькі супрацоўнік гміннай управы. Акрамя таго, на з'ездзе была абрана рада ў складзе 3 чалавек, але адзін з іх потым выступіў супраць, бо ў гэты час адсутнічаў і быў у Кобрыне, таму лічыў выбары незаконнымі, што пацягнула за сабой працяглае даследаванне абставін справы[25]. 1 красавіка 1935 г. войту гміны Велікарыта было загадана асабіста самому адправіцца ў вёску і на месцы разабрацца з сітуацыяй[26]. Акрамя таго, вясной 1938 г. ішоў працяглы разгляд справы аб дазволе на паляванне малодшым афіцэрам 78-га пяхотнага палка, расквартараванага ў Баранавічах, у наваколлі вёскі Малькавічы Лунінецкага павета ў сувязі з неадпаведна заключанай дамовай, у справе была задзейнічана ў тым ліку нават і вайсковая пракуратура[27].

У цэлым у гэты час паляванне заставалася ўдзелам нешматлікай і самай прывілеяванай групы тагачаснага насельніцтва і не набыло масавага характару, разглядалася як ускосны занятак, але аднача-

[23] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3309, арк. 9: Распоряжения министерства и переписка со старостами об установлении времени сезоны охоты за 1935 г.

[24] M. Marczak, *Przewodnik po Polesiu*, s. 18.

[25] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3306, арк. 4: Распоряжения министерства и переписка со старостами об установлении контроля за правилами ведения охоты за 1935 г.

[26] Тамсама, арк. 9.

[27] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3311, арк. 5-6: Дело о регистрации охотничьего участка в деревне Мальковка гм. Хотыничи Лунинецкого повета.

сова здаўна на Палессі шырока было распаўсюджана браканьерства (трапна сфармуляванае ў вядомай мясцовай прыказцы „хто ў лесе не злодзей, той у хаце не гаспадар”), асабліва ўлічваючы паўсюдную наяўнасць у насельніцтва шматлікай агнястрэльнай зброі, што патрабавала ад дзяржавы прыняцця належных мер для захавання жывёльнай разнастайнасці[28].

Дзейнасць урадавых органаў у сферы арганізацыі палявання і рэгуляцыі аховы жывёл і птушак. Сярод тагачасных жывёл асноўнымі аб’ектамі для палявання на Палессі ў міжваенны перыяд з’яўляліся ласі, рысі, дзікі і качкі. Перш за ўсё вялікую каштоўнасць для палявання ўяўлялі ласі з-за сваёй шматлікасці і вялікай колькасці мяса ад адной асобіны, якое потым перапраўлялі на кансервы ці на экспарт[29]. Напрыклад, у чэрвені 1935 г. граф Яраслаў Патоцкі, уладальнік маёнтка Радзялкавічы-Хатынічы Лунінецкага павета, прасіў дазвол на адстрэл 6 ласёў-самцоў на абшарах. Паводле яго слоў там налічвалася 225 такіх жывёл, на якія ўжо некалькі гадоў не вялося паляванне.

2 ліпеня 1935 г. управа Секцыі аховы і развядзення лася Саюза паляўнічых вызначыла колькасць ласёў, умовы іх пражывання і размнажэння і ў выніку прыйшла да высновы аб павелічэнні яго колькасці да 990 штук: з іх 758 на прыватных землях, з якіх 223 самцы старэйшы за 3 гады. На прыватных абшарах дазваляўся адстрэл 15 ласёў: князю Каралю Радзівілу (Давід-Гарадок Столінскага павета) — 8 штук, Я. Патоцкаму — 6, графу М. Патоцкаму (Гошава Косава-Палескі павет) — 1. Разам з тым 15 ліпеня 1935 г. косава-палескі павятовы староста пісаў, што ўсё насамрэч было далёка не так гладка: ласі звычайна прыходзяць з дзяржаўных лясоў, заяўленых экспертамі 10 ласёў там няма, плошча мясцовага ляснога масіву не перавышала 2000 га (а не 4000 га), акрамя таго назіраюцца выпадкі хвароб, у выніку чаго толькі за мінулы год знойдзена каля 15 трупаў жывёл, якія здохлі па невядомай прычыне[30]. 21 мая 1936 г. Патоцкі прасіў дазвол на адстрэл 4 ласёў. З-за кароткага часу прысутнасці снегу і маразоў цяжка было вызначыць дакладную колькасць гэтых жывёл, але паводле маючыхся звестак можна адзначыць павелічэнне іх колькасці на 10-15% ці

[28] J. Niezbrzycki, *Polesie*, s. 322-323.

[29] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3314, арк. 26: Переписка с поветовыми старостами о предоставлении лицам права на охоту в государственных лесах.

[30] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3305, арк. 33-34: Указания министерства и переписка со старостами о разрешении ведения охоты в сезоны запрещения.

каля 250 штук на агульным лясным масіве Лунінецкага павета Палескага ваяводства і Баранавіцкага павета Навагрудскага ваяводства. Уладамі быў дазволены адстрэл 3 ласёў[31].

У цэлым такая пільная апека над жывёламі часам давала і некаторыя адваротныя вынікі, таму, напрыклад, 22 лістапада 1935 г. Міністэрства сельскай гаспадаркі і аграрных рэформ паведамляла палескаму ваяводу, што забарона палявання на самак аленяў і ланяў прывяла ў некаторых паляўнічых акругах да празмернай іх колькасці. Залішняя колькасць такіх жывёл у адносінах да плошчы, на якой яны знаходзяць сабе пракорм, можа прывесці да шкоды ў гадоўлі лесу. У сувязі з гэтым неабходны больш лагодныя адносіны да выдачы дазволаў на паляванне там, дзе колькасць жывёл ацэньваецца як празмерная. Адносіны самцоў і самак не павінны перавышаць 1 да 2, колькасць аленяў і ланяў неабходна захоўваць у суадносінах 1 жывёла на 50-100 га ў залежнасці ад гатункаў мясцовай расліннасці, для сарн (казуль) — 1 на 10 га. Каб давесці колькасць жывёл да такіх суадносін, неабходна выдаваць дазволы не на кароткі час, а не менш 4-6 месяцаў дзеля таго, каб адстрэл мог праводзіцца ў селекцыйны спосаб у адпаведнасці з гаспадарчымі падставамі[32].

27 снежня 1934 г. Стэфан Грундзель, прадстаўнік уладальніка маёнтка Целяханы Косава-Палескага павета Караля Пуслоўскага, прасіў ва ўлад дазвол на адстрэл 3 рысяў. У запыце паведамлялася, што гэтым дазволам Патоцкі можа скарыстацца толькі пасля 15 студзеня, акрамя таго ў мінулым годзе з-за хваробы сямейных не змог скарыстацца выдадзеным дазволам. Па звестках уладальнікаў маёнтка звычайна ў наваколлі кармілася 10-12 рысяў, якія прычынялі значную шкоду з-за свайго палявання на сарнаў, таму такі адстрэл бачыўся ім рацыянальным[33].

Нягледзячы на тое, што на дзікоў таксама вызначаўся ахоўны перыяд часта з-за прычыненай імі вялікай шкоды для сельскай гаспадаркі ўздымалася пытанне аб іх дадатковым пазапланавым адстрэле. Так, у лютым 1935 г. вышэйзгаданы Патоцкі прасіў дазвол на паляванне на дзікоў, якія летам і восенню могуць прынесці вялікую шкоду сялянскаму ўраджаю, акрамя таго ў мінулым годзе колькасць забі-

[31] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3314, арк. 16: Переписка с поветовыми старостами о предоставлении лицам права на охоту в государственных лесах.

[32] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3305, арк. 59: Указания министерства и переписка со старостами о разрешении ведения охоты в сезоны запрещения.

[33] Тамсама, арк. 17.

тых дзікоў на паляванні была менш звычайнай[34]. З мэтай вызначэння колькасці дзікоў і магчымасці іх адстрэлу ў маёнтак быў накіраваны спецыяльны судовы чыноўнік.

У лютым 1936 г. адзначалася, што з-за працяглых дажджоў і недахопу замаразкаў немагчыма было арганізаваць паляванне на дзікоў, у сувязі з чым прапаноўвалася працягнуць паляўнічы сезон на іх да 20 сакавіка. Дзікі прыносілі вялікую шкоду сялянскім пасевам, кампенсаваць якія павінен быў дзяржаўны бюджэт[35]. У маі 1936 г. вялася перапіска паміж ваяводствам і павятовымі старастамі аб праве апошніх самастойна арганізоўваць аблаву на дзікоў у ахоўны перыяд. У рэшце рэшт было вызначана, што ў выключных выпадках староста можа абвесціць дадатковы адстрэл дзікоў на сваёй тэрыторыі ў любы перыяд[36]. Надалей 15 красавіка 1939 г. улады адзначалі, што павелічэнне колькасці дзікоў можа прывесці да росту шкоды ў сялянскай гаспадарцы, якую павінен пакрываць дзяржаўны бюджэт, таму прапаноўвалася правесці ўлік дзікоў і вызначыць для адстрэлу неабходную колькасць[37].

Ляснымі ўгоддзямі вакол вёскі Чучавічы Лунінецкага павета, у ліку іншых валодала і фірма „Агахель” з рэзідэнцыяй у Варшаве і аддзяленнем у Мікашэвічах. У адным са сваіх рэкламных праспектаў яна запрашала паляўнічых у належачы ёй маёнтак, указваючы, што ў чучавіцкіх лясах бліжэй да ракі Лань кожную зіму налічвалася да 10 бярлог мядзведзяў, тут вадзіліся рысі, кабаны, лісы, касулі, бабры, цецерукі і ў вялікай колькасці — качкі. Бядой гэтай мясцовасці з’яўляліся ваўкі, якіх многа развялося пасля Першай сусветнай вайны. У справаздачы лунінецкага старасты Зыгмунта Ягадзінскага адзначалася, што ў 1928 г. урон ад іх толькі ў гміне Чучавічы склаў 100 000 злотых. У 1927-1930 гг. ваўкі знішчылі ў наваколлі 60 коней і жарабят і столькі ж буйной рагатай жывёлы, 150 авечак, многа сабак, свіней, гусей, былі выпадкі нападу ваўкоў на людзей. На лясных драпежнікаў праводзіліся аблавы і масавыя паляванні з удзелам мясцовых, а таксама прыезджых і замежных паляўнічых[38].

34 Тамсама, арк. 8.

35 ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3314, арк. 8: Переписка с поветовыми старостами о предоставлении лицам права на охоту в государственных лесах.

36 ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3308, арк. 15-16: Отчёты поветовых старость об установлении контроля за охотой в 1936 г.

37 ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3315, арк. 6: Переписка о сборе взносов с лесного охотничества за 1936-37 год.

38 *Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна*, [дата доступу: 15.01.2019], <http://luninec.by2.by/pamiac/a10.html>.

Сярод палескіх жывёл у пагражальным становішчы ў гэты час знаходзіліся менавіта мядзведзі. Напрыклад, калі Я. Патоцкі прасіў 16 лістапада 1936 г. дазвол на адстрэл аднаго мядзведзя на сваіх угоддзях, то яму было адмоўлена, бо колькасць гэтых жывёл на Палессі адзначалася ўладамі як невысокая. Патоцкі звяртаў увагу на нібыта нанесеную мядзведзем шкоду — на лясных абшарах вакол яго маёнтка Радзялкавічы-Хатынічы былі знойдзены свежыя парэшткі 3 кароў і лашака, а таксама лашака, забітага ў мінулым годзе. Улады ж лічылі, што такую шкоду нанеслі іншыя жывёлы (хутчэй за ўсё ваўкі), бо мядзведзь на пачатку восені мае дастаткова расліннага пракорму[39].

Шмат увагі ўладамі надавалася таксама і рэгуляцыі колькасці птушак, напрыклад, асабліва шырока распаўсюджаным на Палессі ў міжваенны перыяд было паляванне на мясцовых дзікіх качак, якіх на навакольных балотах налічвалася аж 16 відаў, і бекасаў. Для палявання на качак шырока выкарыстоўваліся сабакі, асаблівыя прынады (штучныя качкі), а таксама адмысловыя сілкі. Акрамя таго, вялікую для іх шкоду прыносілі сяляне, якія масава забіралі яйкі з качыных гнёзд падчас правядзення тут сельскагаспадарчых работ. У глухіх палескіх мясцінах (перш за ўсё Столінскі і Лунінецкі паветы) былі шырока распаўсюджаны глушцы і цецерукі, аб паляванні на якіх існавала багатая мясцовая літаратура[40].

Асаблівая ўвага надавалася становішчу буслоў, асабліва чорных, і чапляў, якія ў даўнейшай шляхецкай Рэчы Паспалітай асабліва цаніліся з-за сваіх прыгожых пер'яў. Напрыклад, заяву саўладальніка маёнтка Страдзеч Брэсцкага павета Людвіка Лахера ад 13 мая 1935 г. аб дазволе на адстрэл 8 чорных буслоў і 15 чапляў з мэтай забеспячэння ад шкоды рыбнай гаспадаркі ўлады адхілілі, бо такі адстрэл мог быць праведзены толькі з навуковымі мэтамі і для рэгуляцыі колькасці птушак[41].

Акрамя таго вызначалася і рэгулявалася колькасць паляванняў і памер здабычы жывёл па ўсёй тэрыторыі ваяводства. Так, Брэсцкі павет падзялілі ў гэты час на 8 паляўнічых груп, пры гэтым забаранялася паляваць больш 3 разоў у сезон на абшарах адной групы і забіваць за раз больш 20 курапатак. Разам з тым 15 жніўня 1936 г. старшыня мясцовага саюза паляўнічых Мечыслаў Малажыньскі пісаў

[39] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3314, арк. 37, 40: Переписка с поветовыми старостами о предоставлении лицам права на охоту в государственных лесах; J. Niezbrzycki, *Polesie*, s. 322.

[40] M. Marczak, *Przewodnik po Polesiu*, s. 20-21.

[41] ДАБр., ф. 1, воп. 6, спр. 3305, арк. 2: Указания министерства и переписка со старостами о разрешении ведения охоты в сезоны запрещения.

членам саюза, што за час водпуску і некалькіх апошніх паляванняў заўважыў, якую вялікую шкоду маладому птаству наносяць шэрыя вароны і сарокі, таму прапаноўваў кожнаму з іх узяць на сябе абавязак адстрэліць да 1 лістапада па 10 шэрых варон і 10 сарок[42].

Асаблівую ролю ў даследаванні жывёльнага свету Палесся ў міжваенны перыяд адыгрываў Дзяржаўны заалагічны музей у Варшаве, супрацоўнікі якога мелі права адстрэльваць любых жывёл і птушак нават у ахоўны перыяд: так, 6 красавіка 1936 г. сямі яго супрацоўнікам быў выдадзены дазвол Міністэрства сельскай гаспадаркі і аграрных рэформ на адстрэл з навуковымі мэтамі любых птушак на ўсёй тэрыторыі дзяржавы, дзе дазвалялася паляванне[43].

З мэтай вывучэння шляхоў міграцыі птушак іх акальцоўвалі, а потым на карце адзначалі месцы іх далейшага знаходжання. Так, напрыклад, 13 чэрвеня 1936 г. на лугах каля Любяшова Камень-Кашырскага павета (зараз Украіна) сялянскія дзеці злавілі крумкача, акальцаванага супрацоўнікамі заалагічнага музея. Адно крыло крумкача было моцна пашкоджана (хутчэй за ўсё тэлеграфнымі правадамі) і праз некаторы час ён здох, а кальцо было перададзена ў музей[44].

Rząd buduje instytucjonalne formy współpracy legalnych organizacji z administracją. Taką platformę dialogu i wypracowywania koncepcji w założeniu mają stanowić Konsultacyjna Rada Etniczna, rady narodowościowe przy wydziałach ds. religii i narodowości w urzędach obwodowych, rada przy Centrum Kultur Narodowych. Instytucje te stanowią bardziej formę dowartościowania liderów organizacji narodowościowych niż organów mających wpływ na realną politykę.

Wdrażany od kilkunastu lat model polityki etnicznej będzie zapewne kontynuowany. Nie budzi on zauważalnych przejawów społecznej kontestacji ani wśród mniejszości narodowych, ani wśród Białorusinów. Od kilku lat w zakresie ustawodawstwa dotyczącego spraw etnicznych panuje całkowita stagnacja. W obszarze praktycznej realizacji istniejących programów dominują rutynowe działania i formy wypracowane jeszcze w XX wieku.

Summary

National minorities in the political system of Belarus

The population census data from 1989, 1999 and 2009 show a significant increase in the number of Belarusians in the national structure of Belarus, accompanied by a decrease in the most numerous nationality groups — Russians, Poles, Ukrainians and Jews. At that time, apart from the noticeable migration of the Jews, there were no significant population movements. A change in the citizens' sense of identity was accompanied by the strengthening of the institutions in the Belarusian state. The „state ideology", which included the idea of the Belarusian nation as a community of all citizens, was the most important factor in accelerating this process. This concept of Belarusian identity was accepted by many Russians, Poles, Ukrainians and representatives of other ethnic communities. The evolution of identity is an expression of state assimilation, but not of assimilation in Belarusian culture, because it was

accompanied by the process of the Russification of all the national minority languages. In the course of ten years, between 1999 and 2009, almost one in three citizens that declared Belarusian nationality changed their mind regarding their mother tongue, choosing Russian. It became a general means of communication in the domestic environment of Belarusians and Poles, who earlier preferred the Belarusian language.

Keywords: state ideology, concept of Belarusian nation, population census, national minorities, identity, assimilation

Змест

Нацыянальныя меншасці ў палітычнай сістэме Беларусі

Вынікі перапісаў насельніцтва 1989, 1999 і 2009 гадоў указваюць на выразны колькасны рост беларусаў у нацыянальнай структуры Беларусі, пры адначасовым скарачэнні ліку самых шматлікіх нацыянальных супольнасцей — расіян, палякаў і яўрэяў. У дадзены час не было, апрача заўважнай эміграцыі яўрэяў, ніякіх істотных перамяшчэнняў насельніцтва. Змена пачуцця тоеснасці грамадзянамі наступала разам з замацаваннем інстытутаў беларускай дзяржавы. Фактарам, які паскорыў гэты працэс, была «дзяржаўная ідэалогія» і вызначаная ёю канцэпцыя беларускага народа як супольнасці ўсіх грамадзян. Такую форму быцця беларусам адобрылі многія расіяне, палякі, украінцы і прадстаўнікі іншых этнічных супольнасцей. Эвалюцыя тоеснасці з’яўляецца праявай дзяржаўнай асіміляцыі, але не асіміляцыі ў беларускай культуры. У тым часе працягвалася русіфікацыя мовы ўсіх нацыянальных груп. На працягу дзесяці гадоў, з 1999 да 2009 года, амаль кожны трэці грамадзянін, якія назваў сябе беларусам, памяняў меркаванне на тэму сваёй роднай мовы на карысць рускай. Руская мова стала паўсюдным сродкам камунікацыі ў хатнім асяроддзі беларусаў і палякаў, якія раней аддавалі перавагу беларускай мове.

Ключавыя словы: дзяржаўная ідэалогія, канцэпцыя беларускага народа, перапіс насельніцтва, нацыянальныя меншасці, тоеснасць, асіміляцыя.

Eugeniusz Mironowicz – prof. dr hab., kierownik Katedry Polityki Międzynarodowej w Instytucie Historii i Nauk Politycznych Uniwersytetu w Białymstoku.

Тадэвуш Гавін
(Гродна)

Польская меншасць у Рэспубліцы Беларусь[1]

1. Перыяд парламенцкага праўлення 1991-1995 гг.

У снежні 1991 г. канчаткова быў вырашаны лёс Савецкага Саюза[2]. 8 снежня 1991 г. кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны падпісалі ў Белавежскай пушчы дамову аб спыненні існавання СССР. 25 снежня 1991 г. Міхаіл Гарбачоў у тэлевізійным звароце склаў з сябе паўнамоцтвы прэзідэнта Савецкага Саюза[3]. Беларусь атрымала гістарычны шанц на будаўніцтва незалежнай і суверэннай дзяржавы[4]. Палітычныя падзеі, звязаныя з распадам СССР, паўплывалі на паляпшэнне стаўлення ўлад у Мінску, Гродне і іншых гарадах рэспублікі да палякаў Беларусі, у тым ліку да прадстаўніка іх інтарэсаў перад органамі ўлады — Саюза палякаў на Беларусі (СПБ). Пераломным у адносінах паміж СПБ і цэнтральным кіраўніцтвам Беларусі стаў 1992 год.

9 студзеня 1992 г. кіраўнік дзяржавы Станіслаў Шушкевіч прыняў дэлегацыю Саюза палякаў на Беларусі. Сустрэча сведчыла пра тое, што часткова абноўленая некамуністычная цэнтральная ўлада РБ мела намер будаваць адносіны з нацыянальнымі меншасцямі інакш, чым раней, спрабуючы вырашаць іх праблемы, а не замоўчваць і хаваць іх ад шырокай грамадскасці. Размова з С. Шушкевічам паказала кіраўніцтву СПБ, што галоўныя пытанні, якія хвалявалі палякаў і тычыліся выкладання польскай мовы ў школах, адкрыцця польскамоўных школ, выдавання польскамоўнага друку, магчыма было вырашыць у новых палітычных умовах[5].

[1] Tekst został przesłany do redakcji w 2017 r.

[2] Падрабязней на гэту тэму гл.: Р. Г. Пихоя, *Власть. Номенклатура. Собственность. Об одной из причин распада СССР*, [у:] *Historia est testis temporum. Księga Pamiątkowa z okazji jubileuszu 90-lecia Profesorów Richarda Pipesa, Piotra Wandycza, Zbigniewa Wójcika*, red. J. Malicki, Warszawa 2017, ss. 143-166; S. Ciesielski, *Pierestrojka a kwestia narodowa — Zakaukazie i Azja Centralna*, [у:] *Nie tylko Litwa. Geneza i przebieg upadku ZSRR w roku 1991*, t. 1, red. A. Srebrakowski i G. Strauchold, Łomianki 2017, s. 11-100.

[3] М. Горбачёв, *Понять перестройку... Почему это важно сейчас*, Москва 2006, с. 351-363.

[4] Падрабязней на гэту тэму гл.: M. Ruchniewicz, *Od BSRR do Republiki Białoruś (1986-1991)*, [у:] *Nie tylko Litwa*, s. 293-326.

[5] Падрабязней на гэту тэму гл.: Т. Гавін, *Польскамоўная адукацыя ў 1988-*

Варта адзначыць, што з 1988 г. і да распаду СССР ніхто з партыйнага і савецкага кіраўніцтва Беларусі не выказаў жадання сустрэцца з беларускімі палякамі і выслухаць іх праблемы. Пры гэтым з боку СПБ былі просьбы наладжвання камунікацыі. Такое стаўленне камуністычных беларускіх улад да палякаў чарговы раз сведчыла пра тое, што „польскае пытанне" яны разглядалі як часовае, якое змогуць утаймаваць. Сустрэча кіраўніцтва СПБ з С. Шушкевічам выявіла адсутнасць у польскай арганізацыі вопыту ўдзелу ў такіх перамовах і ўмення з усяго спектра праблем, што агучваліся, выбраць галоўныя і на іх сканцэнтравацца[6].

Адхіленне ад улады камуністычнай партыі і абранне С. Шушкевіча на пасаду старшыні Вярхоўнага Савета РБ сталі важнымі падзеямі для беларускай дзяржавы[7]. Аднак шматлікія камуністы і далей займалі кіруючыя пасады ва ўсіх структурах улады — заканадаўчай, выканаўчай, судовай. Некаторыя з іх партыйныя кабінеты памянялі на кабінеты выканаўчай улады, а кабінеты ў ЦК КПБ на кабінеты ў Савеце Міністраў і Вярхоўным Савеце Беларусі. Дэмакратычныя сілы на чале з С. Шушкевічам не выкарысталі моманту распаду СССР, забароны дзейнасці КПСС і не ўвялі ў структуры ўлады новых, не звязаных са старой наменклатурай палітычных дзеячаў, якія б імкнуліся будаваць беларускую нацыянальную і незалежную дзяржаву. Гэта прывяло да паслаблення пазіцый прыхільнікаў дэмакратычных змен, у тым ліку С. Шушкевіча.

Аднак у новых палітычных умовах СПБ нашмат лягчэй было рэалізаваць свае мэты і задачы, чым да распаду СССР. Там, дзе СПБ праяўляў актыўнасць у перамовах з уладамі і ведаў, чаго ў выніку хацеў дасягнуць, улады, як правіла, ішлі на ўступкі. 21 лютага 1992 г. Сапоцкінскі пасялковы савет (большасць у ім складалі члены СПБ) у Гродзенскім раёне прыняў рашэнне аб перайменаванні вуліц у пасёлку. Так, вуліца Леніна была названая ў гонар Яна Паўла II, Кастрычніцкая — у гонар генерала Юзафа Альшыны-Вільчынскага[8],

1996 гг. у Беларусі: праблемы адраджэння і роля беларускай супольнасці Гародні, [у:] *Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст. Зборнік навуковых артыкулаў*, Мінск 2016, с. 322-323; L. Michajlik, *Spotkanie odbyło się. Co dalej?*, „Głos znad Niemna", nr 3 (14), 15.02.1992.

6 Там жа. СПБ прадставіў старшыні Вярхоўнага Савета РБ Станіславу Шушкевічу 21 праблемнае пытанне, большасць з якіх знаходзілася ў кампетэнцыі мясцовых органаў улады. Тым не менш СПБ здолеў атрымаць плён ад гэтай сустрэчы.

7 M. Ruchniewicz, *Od BSRR do Republiki Białoruś (1986-1991)*, [у:] *Nie tylko Litwa*, s. 302.

8 Генерал Юзаф Альшына-Вільчынскі — камандуючы аператыўнай групай „Гродна", адзін з удзельнікаў абароны горада ў 1939 годзе. 22 верасня 1939 г.

вуліцы Тэалінскай вернутая яе старая назва. Да таго ж назвы вуліц напісалі на дзвюх мовах — беларускай і польскай[9]. Гэта адзіны прыклад палітычнай актыўнасці палякаў, звязаны з ліквідацыяй савецкіх назваў вуліц. Палякі мелі большасць і ў іншых мясцовых саветах. Напрыклад, у Воранаўскім раёне іх пражывала больш за 85% ад агульнай колькасці насельніцтва. Але такой актыўнай дзейнасці з боку польскай меншасці тут не было. Больш за тое, у гэтым раёне, дзе на пасадзе загадчыка раённага аддзела народнай адукацыі знаходзіўся паляк, сябра СПБ, у адрозненне ад Гродна і Ваўкавыска, не былі прыкладзены намаганні для адкрыцця польскай школы[10].

Як ужо было адзначана вышэй, камуністы, якія перайшлі з партыйных камітэтаў у структуры выканаўчай і заканадаўчай улады, былі галоўнымі праціўнікамі польскага нацыянальнага адраджэння ў РБ. Адсутнасць культуры павагі да законаў штурхала іх да супрацьстаяння ўвядзенню выкладання польскай мовы ў школах і тым больш адкрыццю польскамоўных школ. Найбольш спрыяльныя ўмовы для вырашэння пытання, звязанага з адкрыццём польскай школы, склаліся ў Гродне, дзе старшынёй гарадскога выканаўчага камітэта быў Сямён Домаш, які паважаў існае заканадаўства і актыўна ўключыўся ў беларускае нацыянальнае адраджэнне[11]. Менавіта ён ад імя Гродзенскага выканаўчага камітэта ў лісце ад 6 лютага 1992 г. на адрас СПБ упэўніў польскую грамадскую арганізацыю, што да моманту пераходу дзяцей, якія навучаліся на польскай мове, з пачатковай школы ў сярэднюю пытанне аб адкрыцці польскамоўнай школы будзе вырашана[12].

вайскоўцамі Чырвонай Арміі быў расстраляны разам з начальнікам штаба і ад’ютантам на вачах у жонкі недалёка ад пасёлка Сапоцкін. Падрабязней на гэту тэму гл.: Z. Mierzwiński, *Generałowie II Rzeczypospolitej*, Warszawa 1990, s. 195-199; B. Mieszczeriakow, *Na cmentarzu w Sopoćkiniach*, „Głos znad Niemna”, nr 9 (11), październik 1991.

9 Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Ojcowizna. Odrodzenie polskości na Białorusi*, Grodno — Lublin 1993, s. 130.

10 Варта прызнаць, што віна ў тым, што палякам не дазволілі адкрыць польскую школу ў Воранаве, ляжыць не толькі на раённых уладах, якія не жадалі выконваць беларускае заканадаўства, але і на паляках: як на тых, што працавалі ў сістэме органаў мясцовай улады, так і на членах СПБ, якія не праявілі дастатковай актыўнасці і рашучасці ў вырашэнні гэтага пытання. Падобная сітуацыя была і ў г. Шчучыне, дзе загадчыкам раённага аддзела народнай адукацыі быў паляк Эдвард Дзікевіч. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki. Odrodzenie polskości na Białorusi w latach 1987-2000*, Białystok 2003, s. 225-227.

11 Раней, як адзначалася вышэй, быў старшынёй гарадскога выканаўчага камітэта Ліды.

12 R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, Grodno 1998, s. 18. У сярэдніх школах № 3 Кастрычніцкага раёна Гродна і № 21 Ленінскага раёна працавалі першыя

Рэалізацыі пастаўленых задач СПБ садзейнічала падпісанне 23 чэрвеня 1992 г. Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча „Аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве"[13]. У артыкуле 14 дакумента гаварылася: „Дагаворныя Бакі пацвярджаюць, што асобы, якія належаць да (...) польскай меншасці ў Рэспубліцы Беларусь, маюць права індывідуальна ці сумесна з іншымі членамі сваёй групы на свабоднае захаванне, развіццё і выражэнне сваёй этнічнай, культурнай, моўнай і рэлігійнай самабытнасці без якой-небудзь дыскрымінацыі і ва ўмовах поўнай роўнасці перад законам"[14].

Дагавор гарантаваў вельмі важную для польскай нацыянальнай меншасці магчымасць „ствараць, а таксама падтрымліваць дзейнасць уласных асветных, культурных і іншых устаноў, арганізацый і таварыстваў, якія могуць звяртацца за добраахвотнай фінансавай і іншай дапамогай, у тым ліку дзяржаўнай, у адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, мець магчымасць карыстацца сродкамі масавай інфармацыі, а таксама прымаць удзел у дзейнасці міжнародных няўрадавых арганізацый"[15]. Дамова таксама давала права выкарыстоўваць у напісанні польскамоўнае гучанне імя і прозвішча[16].

Магчымасці СПБ у справе адкрыцця польскіх школ і выкладання польскай мовы ў навучальных установах пашырыліся пасля прыняцця Вярхоўным Саветам Закона „Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь" ад 11 лістапада 1992 года[17].

класы з польскай мовай навучання. СПБ разглядаў іх у якасці падмурка для стварэння ў Гродне польскамоўных школ.

[13] A. Wierzbowska-Miazga, *Wybór dokumentów prawnych dotyczących mniejszości narodowych*, t. II: *Polacy na Białorusi*, Warszawa 2001, s. 254-259; K. Fedorowicz, *Polityka Polski wobec Białorusi*, [у:] *Polityka wschodnia Polski. Uwarunkowania, koncepcje, realizacja*, red. A. Gil, T. Kapuśniak, Lublin — Warszawa 2009; H. Giebień, *Polska wobec mniejszości polskiej na Białorusi w latach 1991-2016 (do października 2016). Zarys problemu*, [у:] *Polacy na Białorusi od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich*, red. T. Gawin, Warszawa 2017, s. 541-559.

[14] *Договор между Республикой Беларусь и Республикой Польша о добрососедстве и дружелюбном сотрудничестве.* Вступил в силу 30 марта 1993 г., гл. [у:] *Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*, ИПС, «ЭТАЛОН» версия 6.7, [11.10.2017].

[15] Там жа.

[16] Падрабязней на гэтую тэму гл.: A. Wierzbowska-Miazga, *Wybór dokumentów prawnych dotyczących mniejszości narodowych*, t. II: *Polacy na Białorusi*, Warszawa 2001, s. 254-259; *Договор между Республикой Беларусь и Республикой Польша о добрососедстве и дружелюбном сотрудничестве.* Вступил в силу 30 марта 1993 г., гл. [у:] *Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*, ИПС, «ЭТАЛОН» версия 6.7, [11.10.2017].

[17] „Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь", 1992, № 35, с. 550.

У пятым артыкуле закона гаварылася, што „Рэспубліка Беларусь, паважаючы правы чалавека, гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь, якія прылічваюць сябе да нацыянальных меншасцей, роўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы і свабоды, у тым ліку:

а) права на атрыманне дапамогі з боку дзяржавы ў справе развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі; б) права на вывучэнне і карыстанне роднай мовай; в) права на друк і распаўсюд інфармацыі на роднай мове; г) права на наладжванне культурных сувязей з суайчыннікамі за межамі Рэспублікі Беларусь; д) права вызнання любой рэлігіі, выканання нацыянальных і рытуальных абрадаў на роднай мове[18];

(....)

Любыя дзеянні, накіраваныя на дыскрымінацыю па нацыянальных прыкметах, стварэнне перашкод у рэалізацыі нацыянальнымі меншасцямі сваіх правоў, распальванне міжнацыянальнай варожасці, караюцца па законе"[19].

Прыведзеныя вышэй дагавор і закон фармальна давалі даволі вялікія магчымасці для польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі. Але, як паказаў час, рэалізаваць гэтыя магчымасці з-за супраціўлення мясцовых улад не паўсюль удалося. Закон 1992 г., у адрозненне ад раней прынятых савецкіх законаў, абмяжоўваў права прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей, у тым ліку і палякаў, на стварэнне ў РБ нацыянальных раёнаў і нацыянальных саветаў[20]. Паўстае пытанне, чаму новая беларуская ўлада, якая імкнулася да дэмакратызацыі палітычнага ладу, пазбавіла нацыянальныя меншасці такой магчымасці. Верагодна, па гэтым пытанні супалі меркаванні як дзеячаў беларускага адраджэння, так і народных дэпутатаў — былых прадстаўнікоў савецкай наменклатуры. Хутчэй за ўсё яны баяліся, што дазвол палякам ствараць самакіравальныя нацыянальныя раёны і сельскія саветы можа прывесці да пагрозы нацыянальнай бяспецы Беларусі. Выступленне прадстаўніка КДБ Беларусі ўпэўніла кіраўніцтва краіны і дэпутатаў у слушнасці іх меркавання па гэтым пытанні[21].

[18] Там жа; *Закон Республики Беларусь 11 ноября 1992г. № 1926-XII. О национальных меньшинствах в Республике Беларусь. С изменениями и дополнениями*, [у:] *Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*, ИПС, «ЭТАЛОН» версия 6.7, [11.10.2017].

[19] Там жа.

[20] Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі, ф. 2, воп. 5, спр. 294, арк. 1: Постановление Сентябрьского пленума ЦК КПСС о национальной политике партии в современных условиях, а также материалы к нему, 19-20.09.1989.

[21] Гл. выступленне старшыні КДБ Эдуарда Ширкоўскага на закрытым пасяджэнні Вярхоўнага Савета РБ у 1992 г. В. Карбалевич, *Место Польши в политике Беларуси*, [у:] *Наш радавод*, Гродна — Беласток 1999 (2000), кн. 8, с. 579.

У гэты перыяд (1991-1995 гг.) у Беларусі быў прыняты і шэраг іншых законаў, а таксама падпісаныя дамовы паміж РБ і РП, якія стваралі спрыяльны клімат для дзейнасці польскай нацыянальнай меншасці[22]. Праўда, вельмі часта рэалізаваць гарантаваныя законамі і міжнароднымі дагаворамі правы было складана.

Саюз палякаў на Беларусі з мэтай адраджэння польскамоўнай адукацыі ў Гродне імкнуўся дамагчыся ад улад перадачы памяшкання пад польскую школу. Вопыт перамоў упэўніў кіраўніцтва СПБ, што вырашыць гэтае пытанне так, як прапаноўваў старшыня Гродзенскага гарвыканкама, будзе дастаткова складана. Таму вясной 1993 г. СПБ змяніў тактыку, прыняўшы рашэнне, падтрыманае старшынёй Таварыства „Польская супольнасць" (Stowarzyszenie „Wspólnota Polska") прафесарам Анджэем Стэльмахоўскім, аб будаўніцтве польскай школы ў Гродне за кошт бюджэту РП. Гэтая тактыка дазваляла палякам ужо ў бліжэйшай будучыні мець сваю школу і, такім чынам, пачаць працэс аднаўлення знішчанай у 1948 г. польскамоўнай адукацыі.

Палітычная сітуацыя ў 1993 г. для СПБ была як ніколі спрыяльнай. У гэты час С. Домаш прасунуўся па службовай лесвіцы і стаў старшынёй Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта замест Дзмітрыя Арцымені, які быў праціўнікам адкрыцця польскай школы ў Гродне. Старшынёй гарадскога выканаўчага камітэта быў выбраны паляк Генрых Крупенка, які раней дапамагаў Польскаму культурна-асветніцкаму таварыству імя Адама Міцкевіча ў Гродне і СПБ. Намеснікам старшыні гарвыканкама працаваў Аляксандр Мілінкевіч, які лічыў, што беларускае нацыянальнае адраджэнне і польскае павінны адбывацца адначасова і дапаўняць адно аднаго[23].

Зусім іншая сітуацыя склалася ў Лідзе. Там, нягледзячы на патрабаванні бацькоў і дапамогу СПБ, не атрымалася, у адрозненне ад Гродна, закласці падмурак пад будучую польскую школу і стварыць у 1991-1993 гг. першыя класы з польскай мовай навучання. Ініцыяты-

[22] Спіс, назвы і змест прынятых законаў і падпісаных дагавораў гл.: A. Wierzbowska-Miazga, *Wybór dokumentów prawnych dotyczących mniejszości narodowych*, t. II: *Polacy na Białorusi*, s. 129-274.

[23] 20 верасня 2017 г. Сямён Домаш, Генрых Крупенка і Аляксандр Мілінкевіч за дапамогу СПБ у адраджэнні польскамоўнай адукацыі і выкладання польскай мовы ў дзяржаўных адукацыйных установах РБ узнагароджаныя Срэбным медалём Stowarzyszenia „Wspólnota Polska" (SWP) з Варшавы. Медалі былі ўручаныя ў Гродне старшынёй SWP Дарыушам Пятром Баніслаўскім, генеральным консулам РП у Гродне Ярославам Ксёжкам і старшынёй СПБ Анжалікай Борыс. *Nagrody i wyróżnienia na konferencji naukowej w Grodnie*, <http://znadniemna.pl/25303/nagrody-wyroznienia-konferencji-naukowej-grodnie/>, [22.09.2017].

вам палякаў супрацьдзейнічалі старшыня Лідскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір Малец і загадчык гарадскога аддзела народнай адукацыі Аркадзь Мазоўка[24]. Чаму ў двух гарадах адной вобласці склаліся супрацьлеглыя падыходы да пытання польскамоўнай адукацыі? Верагодна, кіраўніцтва Беларусі і Міністэрства народнай адукацыі далі мясцовым уладам неабмежаваныя магчымасці ў вырашэнні гэтага пытання. Пры гэтым неафіцыйна яны падтрымлівалі дзеянні тых мясцовых кіраўнікоў, якія стрымлівалі аднаўленне польскамоўнай адукацыі ў сваіх рэгіёнах. Падобнае стаўленне назіралася і ў іншых гарадах Мінскай, Брэсцкай і Віцебскай абласцей[25]. Варта адзначыць, што ўлады для рэалізацыі сваіх планаў супрацьдзеяння развіццю польскамоўнай адукацыі выкарыстоўвалі падначаленых і залежных ад іх палякаў, якіх прымушалі „добраахвотна" выступаць у мясцовым друку супраць навучання дзяцей на польскай мове. Такім чынам, у шматлікіх бацькоў з'яўляўся сумнеў адносна таго, ці варта абцяжарваць сваіх дзяцей навучаннем на польскай мове, калі пасля заканчэння такой школы ў іх не будзе будучыні ў Беларусі, як упэўнівалі аўтары некаторых артыкулаў[26].

Візіты ў Беларусь польскага прэм'ер-міністра Ганны Сухоцкай у 1992 г. і прэзідэнта Польшчы Леха Валэнсы ў 1993 г. і іх сустрэчы з кіраўніцтвам СПБ, а таксама з прадстаўнікамі польскай меншасці ў Гродне (прэм'ера) і ў Баранавічах (прэзідэнта) павялічвалі аўтарытэт СПБ не толькі сярод беларускай грамадскасці, але і ў асяроддзі ўлад, якія разумелі, што Польшча сур'ёзна адносіцца да СПБ і да польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі.

Саюз палякаў на Беларусі з асветніцкай мэтай стварыў польскамоўную газету „Глос знад Немна" („Głos znad Niemna"), зарэгістраваную Дзяржаўным камітэтам па справах друку ў Мінску 20 верасня 1990 года[27]. Газета была афіцыйна легалізаваная на паўгода раней,

[24] T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 230.

[25] Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Polskie odrodzenie na Białorusi 1988-2005*, Białystok 2010, s. 188-201.

[26] Адным з такіх праўладных актывістаў быў паляк з Ліды В. Станевіч, які напісаў артыкул *Без амбіцый?* у „Лідскай газеце" ад 8.09.1992 г. Артыкул быў надрукаваны акурат у той час, калі вырашаўся лёс першага класа з польскай мовай навучання ў Лідзе. У выніку СПБ і бацькам-палякам не ўдалося дамагчыся арганізацыі польскамоўнай адукацыі ў горадзе.

[27] Падрабязней на тэму выдавецкай дзейнасці СПБ гл.: A. Bubko, *„Magazyn Polski"*, [у:] *Polska mniejszość na Białorusi. Związek Polaków na Białorusi w 20-lecie działalności*, red. Z. J. Winnicki i T. Gawin, Białystok 2010, s. 245-266; A. Dobroński, *Grodzieńsko-białostocki „Głos znad Niemna"*, [у:] *Polska mniejszość na Białorusi*, s. 223-244.

чым адбылася рэгістрацыя самога СПБ. Перад распадам СССР такія станоўчыя для СПБ парадоксы адбываліся.

17 лютага 1994 г. старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах друку Анатоль Бутэвіч прыняў запрашэнне галоўнага праўлення СПБ наведаць арганізацыю. У выніку перамоў кіраўніцтва СПБ з міністрам было вырашана, што ўрад РБ возьме на сябе 75% выдаткаў, звязаных з выданнем газеты „Глос знад Немна". Гэта быў не толькі жэст добрай волі, але і сведчанне павагі да СПБ з боку беларускага ўрада ў асобе міністра А. Бутэвіча[28].

Канстытуцыя РБ, прынятая ў сакавіку 1994 г., прадугледжвала пераход ад парламенцкай рэспублікі да прэзідэнцкай. Вярхоўны Савет РБ прызначыў першы тур выбараў прэзідэнта Беларусі на 23 чэрвеня 1994 г. Улады незалежнай парламенцкай РБ, дзе шматлікія структуры знаходзіліся пад грамадскім кантролем, вымушаны былі ўлічваць палітычныя настроі ў грамадстве. У сувязі з гэтым яны не мелі намеру праводзіць прэзідэнцкія выбары з выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу, каб на пасаду прэзідэнта быў абраны раней ухвалены імі кандыдат. Таму ўсе кандыдаты ў прэзідэнты РБ пачалі актыўна змагацца за галасы выбаршчыкаў. Паколькі да лета 1994 г. СПБ здолеў аб'яднаць у сваіх шэрагах тысячы палякаў амаль з усіх заходніх абласцей Беларусі і г. Мінска, а таксама меў свае грамадскія структуры і ва ўсходніх абласцях, ніводны з прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта РБ не мог праігнараваць галасы беларускіх палякаў.

Прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч быў адным з кандыдатаў, які планаваў змагацца за галасы палякаў. 13 траўня 1994 г. ён накіраваў міністра адукацыі Віктара Гайсёнка на сустрэчу з галоўным праўленнем СПБ з мэтай вырашэння тых праблем, пра якія раней у сваіх лістах да ўлад пісаў Саюз палякаў на Беларусі[29]. Гэтая сустрэча, верагодна, павінна была зняць напружанасць у адносінах паміж урадам і СПБ, а таксама падрыхтаваць падмурак да бесканфліктных перамоў прэм'ер-міністра В. Кебіча з кіраўніцтвам Саюза палякаў і такім чынам дапамагчы заваяваць галасы польскай меншасці падчас прэзідэнцкай выбарнай кампаніі.

Прэм'ер-міністр В. Кебіч прыехаў з візітам у галоўнае праўленне СПБ праз чатыры дні, 17 траўня 1994 г. Разумеючы, што СПБ галоў-

[28] E. S. [E. Skrobocki], *Wizyta ministra*, „Głos znad Niemna", nr 8, 28.02 — 06.03.1993; T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 177-178. Ва ўмовах сённяшняй палітычнай сітуацыі ў Беларусі, калі ўрад цалкам адарваны ад народа і яму непадсправаздачны, цяжка ўявіць візіт міністра не толькі ў польскую грамадскую арганізацыю, але і ў любую іншую.

[29] Падрабязней на тэму гэтай сустрэчы гл.: R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, s. 30-31.

ным чынам хвалююць пытанні польскамоўнай адукацыі, В. Кебіч на сустрэчу запрасіў кіраўніцтва Гродзенскай вобласці, а менавіта: старшыню аблвыканкама С. Домаша, яго намесніка па справах адукацыі Мікалая Калацэя, старшыню гарвыканкама Г. Крупенку і загадчыка абласнога аддзела народнай адукацыі Аляксея Саўчыка. Сустрэча стала пераломнай для вырашэння праблем, звязаных з далейшым развіццём польскамоўнай адукацыі ў Беларусі[30].

Падчас перамоў было вырашана, што ў Гродне з'явяцца дзве польскія школы, адна з якіх (разам з Цэнтрам польскай культуры) будзе пабудавана на сродкі з беларускага бюджэту, другая (як і школа ў Ваўкавыску) — за кошт фінансавання РП. Гэта была канструктыўная сустрэча. Прэм'ер-міністр В. Кебіч не падымаў пытанняў, звязаных з выбарамі, хаця ўсім была зразумелая мэта яго прыезду ў Гродна і размоў з прадстаўнікамі СПБ. Развітваючыся, В. Кебіч сказаў старшыні Саюза палякаў Беларусі: „У прэзідэнцкіх выбарах, якія хутка адбудуцца, вы можаце галасаваць за каго толькі жадаеце. Але ў мяне да вас асабістая просьба — ні ў якім выпадку не галасуйце за Аляксандра Лукашэнку. Калі ён пераможа, то павядзе Беларусь у камуністычнае мінулае"[31].

Прыезд прэм'ер-міністра В. Кебіча ў Гродна і яго сустрэча з кіраўніцтвам СПБ узмацнілі пазіцыі С. Домаша, Г. Крупенкі, А. Мілінкевіча і іншых дзяржаўных дзеячаў, якія дапамагалі СПБ у дасягненні яго статутных мэт, асабліва ў справе адраджэння польскамоўнай адукацыі. З гэтага моманту іх заангажаванасць у вырашэнне „польскага пытання" была не выключна асабістай ініцыятывай і праяўленнем добрай волі, а зрабілася выкананнем палітычнай праграмы беларускага ўрада.

10 ліпеня 1994 г. на выбарах прэзідэнта РБ у другім туры перамог А. Лукашэнка[32]. Прэм'ер-міністр В. Кебіч прызнаў выбар народа. Старая ўлада сыходзіла з гонарам і павагай да беларускага заканадаўства.

[30] Падрабязней на гэту тэму гл.: Там жа, с. 32-34; Архіў СПБ, дакументы ўваходныя за 1994 г. *Протокол встречи премьера Республики Беларусь с руководством СПБ от 17 мая 1994 г.*

[31] M. Świgoń, J. Dziurbejko, *Donośna wizyta*, „Głos znad Niemna", nr 20 (106), 23-29.05.1994; T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 276.

[32] Падрабязней на тэму выбараў прэзідэнта РБ, наведвання галоўнага праўлення СПБ кандыдатамі ў прэзідэнты Александрам Лукашэнкам, Станіславам Шушкевічам і Зянонам Пазняком гл. у: „Głos znad Niemna", nr 16 (102), 25.04 — 01.05.1994: I. Artisz, *Spotkanie z Aleksandrem Łukaszenką*; J. D., [Józef Dziurbejko], *Stanisław Szuszkiewicz w Domu Polaka w Grodnie*; M. Aniszczenko, *Spotkanie z Zenonem Paźniakiem*.

Не пройдзе і некалькі гадоў, як прэзідэнт А. Лукашэнка растопча беларускае права, зменіць Канстытуцыю, неправамоцна працягне свае прэзідэнцкія паўнамоцтвы на два гады. Чарговыя прэзідэнцкія выбары будуць сфальсіфікаванымі і, такім чынам, з гаранта Канстытуцыі, грамадзянскіх правоў і свабод А. Лукашэнка ператворыцца ў іх ліквідатара[33].

Нягледзячы на заяву А. Лукашэнкі падчас сустрэчы з кіраўніцтвам СПБ 17 красавіка 1994 г. у Гродне аб тым, што „будзеце мець столькі польскіх школ, колькі вам будзе патрэбна”[34], ужо праз некалькі месяцаў пасля выбараў рэчаіснасць аказалася зусім іншай.

Беларускі ўрад праз намесніка міністра эканомікі і фінансаў у снежні 1994 г. паведаміў СПБ, што ў дзяржаўным бюджэце няма сродкаў на рэалізацыю праекта, звязанага з будаўніцтвам другой польскай школы ў Гродне. Так урад Міхаіла Чыгіра адмовіўся выконваць абавязкі папярэдняга ўрада[35].

Чарговым фактам, які пагаршаў адносіны паміж урадам і СПБ, стала тое, што міністр адукацыі РБ Васіль Стражаў (насуперак беларускаму заканадаўству) выступаў супраць канцэпцыі развіцця польскамоўнай адукацыі ў Беларусі. У інтэрв’ю газеце „Звязда” міністр паставіў пытанне: „Ці будзе правільна, калі ў Беларусі пачнуць з’яўляцца школы, у якіх усе прадметы з I па XII класы будуць выкладацца на польскай мове?”[36]. Гэта быў сур’ёзны сігнал для СПБ аб тым, што ў новай палітычнай сітуацыі аднавіць польскамоўную адукацыю ў Беларусі будзе даволі складана. Калі ўлічыць, што міністр не мог па сваёй асабістай ініцыятыве змяняць раней ухваленую беларускім урадам канцэпцыю функцыянавання польскіх школ, то, верагодна, у гэтым пытанні ён меў падтрымку з боку адміністрацыі прэзідэнта.

Вялікай стратай для СПБ было зняцце 24 снежня 1994 г. з пасады старшыні Гродзенскага выканаўчага камітэта С. Домаша[37]. З таго моманту шматлікія пытанні, звязаныя з будаўніцтвам польскіх школ

[33] А. Федута, *Лукашенко. Политическая биография*, Москва 2005, с. 242.

[34] I. Artisz, *Spotkanie z Aleksandrem Łukaszenką*, „Głos znad Niemna”, nr 16 (102), 25.04 — 01.05.1994.

[35] Падрабязней на гэту тэму гл.: R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, s. 36; Архіў СПБ, дакументы ўваходныя за 1994 г., *List wiceministra ekonomiki i finansów RB do grodzieńskiego obwodowego komitetu wykonawczego oraz prezesa ZPB*.

[36] Газета „Звязда”, 09.12.1994.

[37] Сямён Домаш падчас выбарчай кампаніі не падтрымаў Аляксандра Лукашэнку. Больш за тое, выступаў супраць яго кандыдатуры ў якасці прэзідэнта. Гэта стала асноўнай прычынай пазбаўлення яго пасады старшыні Гродзенскага аблвыканкама.

у Гродне і Ваўкавыску, неабходна было вырашаць з новым старшынёй, з якім яшчэ толькі наладжваліся працоўныя адносіны. Гэта ўскладняла дзейнасць СПБ у справе атрымання ўсіх дазволаў на будаўніцтва школ. У рэалізацыі іншых задач (не звязаных з аднаўленнем польскамоўнай адукацыі) СПБ амаль не сустракаў супраціву з боку ўлад. У перыяд 1991-1995 гг. намаганнямі СПБ і пры дапамозе Таварыства „Польская супольнасць" з Варшавы ў Гродне, Баранавічах і Браславе былі пабудаваны Польскія дамы для развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці[38]. Плённа развівалася выдавецкая справа СПБ[39]. Раз на тыдзень польскамоўныя перадачы трансліраваліся Гродзенскім абласным радыё і тэлебачаннем[40].

СПБ, нягледзячы на складанасці, звязаныя з негатыўным стаўленнем некаторых прадстаўнікоў улад да польскамоўнай адукацыі, прасоўваў ідэю выкладання польскай мовы ў школах Беларусі, развіваў культурную і выдавецкую дзейнасць. Дзякуючы намаганням членаў Саюза палякаў, у 1993 г. польская мова выкладалася ў 300 школах, пры гэтым у 81 з іх — як абавязковы прадмет. Польскую мову вывучалі 14 252 вучні. Для параўнання, у 1990 г. польская мова вывучалася ў 174 школах, з якіх толькі ў 39 — у якасці абавязковага прадмета; усяго 8252 школьнікі вучылі польскую мову[41].

Перыяд парламенцкага праўлення ў рэспубліцы ў 1991-1995 гг. для СПБ, нягледзячы на ўсе цяжкасці ў рэалізацыі статутных мэт і задач, быў найбольш спрыяльным часам. Былі відавочныя дасягненні ў справе адраджэння польскамоўнай адукацыі. Кожны год павялічвалася колькасць школ, у якіх выкладалася польская мова. Улады далі дазвол на будаўніцтва і адкрыццё польскіх школ у Беларусі. Вялася культурная дзейнасць і развіваліся сродкі масавай інфармацыі, як друкаваныя, так і электронныя. Пасля перамогі А. Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах стаўленне цэнтральнай улады і мясцовага кіраўніцтва да канстытуцыйных патрабаванняў палякаў пачало змяняцца

[38] H. Giebień, *Związek Polaków na Białorusi (BSRR-RB) w latach 1988-2004*, [у:] *Polska mniejszość narodowa w Europie Środkowo-Wschodniej. Nowe problemy i wyzwania wobec współczesnych przemian w państwach regionu*, red. Z. J. Winnicki, Wrocław 2005, s. 99-144; T. Gawin, *Stan aktualny 2010 i perspektywy rozwoju Związku Polaków na Białorusi*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi*, s. 338.

[39] Падрабязней на гэту тэму гл.: W. Śleszyński, *Polityka historyczna a mniejszość polska na Białorusi w latach 1991-2017*, [у:] *Polacy na Białorusi*, s. 521-525.

[40] Там жа, с. 524.

[41] Падрабязней на гэту тэму гл.: A. Bobryk, *Społeczne uwarunkowania funkcjonowania oświaty w języku polskim na Białorusi (1988-2017)*, [у:] *Polacy na Białorusi*, s. 483-500.

ў горшы бок. Выключэннем заставаліся гарады Гродна і Ваўкавыск. Спробы новага ўрада на чале з М. Чыгіром разгледзець праблемы нацыянальных меншасцей і распрацаваць механізм іх вырашэння былі асуджаны на правал і скончыліся безвынікова[42].

Чаму А. Лукашэнка (які публічна ўпэўніў палякаў у тым, што ён будзе садзейнічаць развіццю польскамоўнай адукацыі), яго ўрад і старая постсавецкая наменклатура ў структурах улады так негатыўна ставіліся да польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі? Прычын такога стаўлення некалькі, але можна вылучыць галоўныя. Па-першае, прэзідэнт РБ А. Лукашэнка, фарміруючы сваю адміністрацыю і новы ўрад, атачыў сябе кадрамі, дзе ўраджэнцы Беларусі былі ў меншасці[43]. У асноўным гэта былі рускія, накіраваныя сюды на працу яшчэ ў савецкі час[44]. Імкненне Польшчы ўступіць у Еўрапейскі Саюз і НАТА трактавалася імі (таксама як і кіраўніцтвам

[42] Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Віктар Ганчар, які курыраваў справы нацыянальных меншасцей, сустрэўся ў трэцяй дэкадзе жніўня 1994 г. з кіраўнікамі рэспубліканскіх арганізацый нацыянальных меншасцей. Адбыўся даволі канструктыўны для абодвух бакоў дыялог, які даваў надзею на тое, што новы ўрад будзе сур'ёзна, у межах беларускага заканадаўства вырашаць праблемы нацыянальных меншасцей. Старшыня СПБ на гэтай сустрэчы перадаў прэм'еру спіс праблемных пытанняў, для вырашэння якіх патрабавалася ўмяшальніцтва ўрада і прэзідэнта. Але спадзяванні прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей не апраўдаліся. У хуткім часе В. Ганчар быў зняты з пасады віцэ-прэм'ера і перайшоў у апазіцыю да прэзідэнта Лукашэнкі. Новы чыноўнік такой актыўнасці, як Ганчар, не праяўляў. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 283; А. Фетута, *Лукашенко. Политическая биография*, с. 189.

[43] Выхадзец з беларускай глыбінкі, напужаны нечаканай вялікай уладай, старшыня саўгаса ў Магілёўскай вобласці, які не меў палітычнага досведу кіраўніцтва абласнымі і раённымі выканаўчымі структурамі, не з'яўляўся сапраўдным прыхільнікам дэмакратыі і беларускага нацыянальнага адраджэння, па-іншаму зрабіць не мог. Не ведаючы гісторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, заходняй культуры і яе каштоўнасцей, ён не мог ажыццяўляць палітыку інтэграцыі Беларусі з Еўропай і Еўрапейскім Саюзам.

[44] У адміністрацыі прэзідэнта і ва ўрадзе быў шэраг былых савецкіх і рускіх палкоўнікаў, якія займалі адказныя пасады. Так, напрыклад, палкоўнік Уладзімір Замяталін быў віцэ-прэм'ерам урада, які курыраваў справы, звязаныя з нацыянальнымі меншасцямі. Палкоўнік Урал Латыпаў быў міністрам замежных спраў, палкоўнік Сяргей Посахаў з'яўляўся памочнікам прэзідэнта РБ у яго адміністрацыі. Расіяне ў розны час займалі пасады міністра абароны, старшыні КДБ, міністра МНС, асабістай аховы прэзідэнта. Гэты спіс можна працягваць. Больш падрабязна на гэтую тэму гл.: M. Maszkiewicz, *Problemy ideologii państwowej na Białorusi*, [у:] *Białoruś — dalsza droga ku demokracji*, red. M. Iwanow, Wrocław 2012, s. 34-71; wersja angielska tekstu: M. Maszkiewicz, *State Ideology in Belarus: Main Problems and Concepts* , „Warsaw East European Review", 2012, vol. 11, Warszawa 2013, s. 79-100.

Pacii) як пагроза для бяспекі Беларусі. У сувязі з гэтым палякі ў РБ (шмат у чым пад уплывам КДБ[45] і іншых спецыяльных службаў) разглядаліся ў якасці „пятай калоны". У асяроддзі як цэнтральнай, так і мясцовых улад ствараліся ўмовы, якія не садзейнічалі далейшаму плённаму польскаму нацыянальнаму адраджэнню. Па-другое, кожная пабудаваная і адкрытая польская школа ў Беларусі звужала б прастору так званага рускага свету[46]. А гэта, натуральна, супярэчыла інтарэсам як Расіі, так і расіян, якія жылі ў Беларусі. Па-трэцяе, дэнацыяналізаваныя беларусы ў структурах улады, якія не былі заангажаваныя ў працэс развіцця беларускамоўных школ, прытрымліваліся наступнага прынцыпу: „Няма беларускіх школ у рэспубліцы — не дазволім стварэнне і польскіх". У такіх умовах далейшае развіццё польскамоўнай адукацыі ў Беларусі можна было ажыццяўляць толькі ў рашучай канфрантацыі з уладай, пры падтрымцы законных патрабаванняў СПБ з боку шырокіх колаў беларускай грамадскасці, апазіцыйных палітычных партый і грамадскіх арганізацый.

2. Польская нацыянальная меншасць і беларуская апазіцыя

У развітых дэмакратычных дзяржавах палітычныя апазіцыйныя партыі з'яўляюцца іх неад'емнай часткай. Яны актыўна ўдзельнічаюць у палітычным і грамадскім жыцці дзяржавы, канстытуцыйным шляхам змагаюцца за галасы выбаршчыкаў і імкнуцца прыйсці да ўлады. У такіх краінах кіруючая партыя (або кіруючая кааліцыя) у выніку прайграных выбараў пераходзіць у апазіцыю, а апазіцыя становіцца на чале ўрада. Такі працэс для сучаснай дэмакратыі з'яўляецца цалкам нармальным, яму падпарадкаваныя і яго прымаюць усе члены палітычных партый, якія ўдзельнічаюць у барацьбе за ўладу. Падобная палітычная сістэма мірнага дэмакратычнага прыходу да ўлады і перадачы яе ў выпадку прайграных выбараў функцыянавала ў вельмі кароткі перыяд існавання парламенцкай Рэспублікі Беларусь (1991-1994 гг.).

Карэнным чынам сітуацыя ў Беларусі змянілася пасля абрання прэзідэнтам краіны А. Лукашэнкі ў ліпені 1994 г. У сярэдзіне 1990-х гг. ён зрабіў захады, якія абмяжоўвалі развіццё і дзейнасць палітычных

[45] Прыклады такога стаўлення з боку КДБ да палякаў прыведзеныя вышэй.

[46] Больш падрабязна на гэтую тэму гл.: Е. Холмогоров, *Русский мир, что это такое*, <http://iamruss.ru/russkij-mir-chto-eto-takoe/>, [16.09.2017]; Н. Нарочницкая, *Русский мир*, Москва 2007; яна ж, *Сосредоточение России. Битва за русский мир*, Москва 2015.

партый. Ужо праз восем месяцаў, у сакавіку 1995 г., у выніку супрацьпраўных дзеянняў новай улады ў раёнах і абласцях Беларусі апазіцыйным партыйным дзеячам была абмежаваная (або зусім адсутнічала) магчымасць патрапіць у парламент[47].

Усе наступныя выбары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001, 2006, 2010, 2015 гг.), парламенцкія (2000, 2004, 2008, 2012, 2016 гг.) і мясцовыя былі сфальсіфікаваныя і таму не прызнаныя сусветнай дэмакратычнай супольнасцю. Калі ў сярэдзіне 1990-х гг. у Беларусі дзейнічалі амаль сорак палітычных партый, то ў 2011 г. засталіся толькі пятнаццаць[48]. У сярэдзіне 1990-х гг. найбольш моцнымі і добра арганізаванымі партыямі, якія мелі свае структуры ў рэгіёнах, былі Беларускі народны фронт „Адраджэнне" (БНФ), Беларуская сялянская партыя (БСП), Народна-дэмакратычная партыя Беларусі (НДПБ), Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада (БСДГ), Беларускі сялянска-дэмакратычны саюз (БСДС), Аб'яднаная дэмакратычная партыя Беларусі (АДПБ) і Партыя народнай згоды[49]. У 1991-1992 гг. самую вялікую падтрымку беларускага электарату меў БНФ (травень 1991 г. — 7%, сакавік 1992 г. — 11,7%). Іншыя палітычныя партыі карысталіся падтрымкай у межах некалькіх працэнтаў. Пасля 1994 г. на палітычнай сцэне з'явіліся новыя партыі, трансфармаваліся старыя, але найбольш уплывовымі заставаліся БНФ, Аб'яднаная грамадзянская партыя (АГП) і БСДГ[50].

[47] Яскравым прыкладам грэбавання беларускім заканадаўствам у справе правядзення дэмакратычных выбараў у парламент з'яўляецца Гродна, дзе ў шасці акругах кандыдаты ад палітычных апазіцыйных партый (пераважна ад БНФ) у першым туры набралі большую колькасць галасоў, чым іх супернікі. Мясцовыя ўлады, напужаныя такім вынікам галасавання, выкарысталі адміністратыўны рэсурс для таго, каб выбары ў другім туры прызнаць несапраўднымі. Такім чынам горад Гродна застаўся без сваіх дэпутатаў у парламенце. Падрабязней на гэту тэму гл.: *Вярхоўны Савет у выніку II туру выбараў 10 снежня абраны, Гародня ня мае ў ім ніводнага прадстаўніка*, „Пагоня", № 47 (146), 15-21.12.1995.

[48] Падрабязней на тэму палітычнай апазіцыі ў РБ, яе дзейнасці, удзелу ў выбарах, узаемаадносін унутры і з грамадзянскай супольнасцю гл.: A. Czwołek, *Opozycja polityczna na Białorusi (1989-2010)*, Gdańsk 2013, s. 385-693.

[49] К. Коктыш, *Трансформация политического режима в Республике Беларусь 1990-1999*, Москва 2000, с. 27; *Два берега белорусской политики*, „Имя", 1995, № 1, с. 4; М. Рухович, *Блокада прорвана!*, „Белорусская трибуна", 1989, № 3, с. 1.

[50] Падрабязней на тэму стварэння новых партый, ліквідацыі існых, іх палітычнай дзейнасці ў 1994-2010 гг. гл.: A. Czwołek, *Opozycja polityczna na Białorusi (1989-2010)*, s. 183-210, 297-303.

Польскія і беларускія даследчыкі па-рознаму ацэньваюць адносіны, якія склаліся паміж СПБ (сапраўдным прадстаўніком польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі) і БНФ (самай уплывовай апазіцыйнай палітычнай партыяй). Асобныя польскія гісторыкі бачаць у БНФ арганізацыю, якая дастаткова крытычна, з прадузятасцю ставілася да свабоднага развіцця польскай нацыянальнай меншасці. Вядомым польскім даследчыкам, які прытрымліваецца такога меркавання, з'яўляецца Здзіслаў Юльян Вініцкі[51]. Падобным чынам, толькі больш радыкальна, ацэньвае беларускую апазіцыю і польскі навуковец Казімеж Францкевіч, які абапіраецца ў сваіх даследаваннях у асноўным на працы дацэнта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Тадэвуша Кручкоўскага[52].

Казімеж Францкевіч сцвярджае: „Немагчыма не заўважыць, што погляды Тадэвуша Гавіна значна адрозніваюцца ад ацэнак дзеячаў беларускай нацыянальнай апазіцыі іншымі прадстаўнікамі польскай нацыянальнай меншасці і польскімі даследчыкамі гэтай тэмы (...). Погляды Тадэвуша Гавіна характарызуюцца вялікім цярпеннем і разуменнем пачынанняў дзеячаў беларускай нацыянальнай апазіцыі, якія выцякаюць з яго вопыту і сяброўства, што магчыма ўскладняе яму больш крытычна падысці да пытання адносін гэтай жа апазіцыі да польскага нацыянальнага адраджэння"[53]. Далей Францкевіч падкрэслівае: „Нашы даследаванні паказваюць, што без комплексаў і асцярогі ставяцца да польскай нацыянальнай меншасці толькі Аляксандр Мілінкевіч і рускамоўная беларуская ліберальная апазіцыя на чале з яе лідарам Анатолем Лябедзькам"[54].

Каб зразумець стаўленне беларускіх апазіцыйных партый да польскай нацыянальнай меншасці, варта разглядаць гэтае пытанне ў дзвюх незалежных ракурсах — з аднаго боку ў плоскасці непасрэдных адносін і супрацоўніцтва паміж СПБ і апазіцыйнымі партыямі, з другога — у ракурсе ацэнкі ў беларускай гістарыяграфіі „польскага пытання".

[51] Z. J. Winnicki, *Współczesna doktryna i historiografia białoruska (po roku 1989) wobec Polski i polskości*, Wrocław 2003, s. 80-81, 96; ён жа, *Białoruskie środowiska niepodległościowe wobec polskiego odrodzenia narodowego w BSRR-RB. Uwagi*, [у:] *Nie tylko Litwa*, s. 327-352.

[52] T. Kruczkowski, *Polacy na Białorusi na tle historii i współczesności*, Słonim 2003, s. 249.

[53] K. Frąckiewicz, *Białoruska opozycja narodowa a problematyka „odrodzenia" polskości w BSSR-RB*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi 1988-2009. Ocena minionego dwudziestolecia*, red. Z. J. Winnicki i T. Gawin, Białystok 2009, s. 178.

[54] Там жа, с. 178.

Трэба прызнаць, што на пачатку польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі структуры БНФ і іх асяроддзе з трывогай, а часам і варожа рэагавалі на ініцыятывы СПБ[55]. Для такога стаўлення было як мінімум дзве прычыны. Па-першае, страх перад прыхільнымі адносінамі каталіцка-польскага захаду Беларусі да Польшчы, і, такім чынам, перад „паланізацыяй" Гродзеншчыны і меркаваным імкненнем маладой суверэннай Польшчы да вяртання страчаных у выніку пакта Рыбентропа-Молатава, а таксама ялцінскіх пагадненняў тэрыторый. Другой прычынай была рэальная асцярога, звязаная з магчымым аб'яднаннем паўночна-заходніх раёнаў Гродзеншчыны з Польскім аўтаномным краем у Літве. Гэта значыць, боязь стварэння на беларуска-літоўскім памежжы своеасаблівай формы польскай нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі[56]. Кіраўнікі Літвы і Беларусі Вітаўтас Ландсбергіс і С. Шушкевіч два разы абмяркоўвалі гэтае пытанне, каб выпрацаваць сумесныя дзеянні, якія б перашкаджалі стварэнню такой аўтаноміі[57].

БНФ як прадстаўнік нацыянальна свядомай часткі беларускага грамадства змагаўся з савецкай і постсавецкай наменклатурай за стварэнне беларускай суверэннай, незалежнай і дэмакратычнай дзяржавы, за наданне беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай. Пры гэтым не вёў барацьбы з Саюзам палякаў на Беларусі (як памылкова сцвярджаюць некаторыя польскія даследчыкі), не выступаў супраць польскага нацыянальнага адраджэння, аднаўлення раней ліквідава-

[55] Так, адзін з прыкметных дзеячаў БНФ у Гродне Валеры Задаля лічыў, што, калі палякі хочуць мець польскія школы, то, калі ласка, за свой кошт няхай будуюць, друкуюць падручнікі, утрымліваюць настаўнікаў. Больш падрабязна на гэту тэму гл.: В. Задаля, *Удивляться или возмущаться?*, „Гродненская правда", 13.10.1989; Выбраныя дакументы з папкі Тадэвуша Малевіча на тэму польска-беларускіх дачыненняў у Беларусі ў канцы 80-х — пачатку 90-х гг., апублікаваныя у: Z. J. Winnicki, *Współczesna doktryna i historiografia białoruska (po roku 1989) wobec Polski i polskości*, Wrocław 2003, s. 117-119, 121-123.

[56] P. Masłowski, *Próba utworzenia polskiej autonomii narodowo-terytorialnej na Wileńszczyźnie litewskiej 1989-1991*, [у:] *Kraje Europy Środkowej i Wschodniej na drodze przemian*, red. J. Kupczak, J. Albin, Wrocław 2004, s. 210 — 255.

[57] <http://kresy24.pl/showArticles/article_id/54/>, [15.10.2016]. У папярэднім раздзеле былі прыведзеныя прыклады спроб уцягнуць палякаў Беларусі ў палітычныя гульні, якія пачала Масква супраць Літвы. Пытанне стварэння польскай нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі, верагодна, разглядалася Гарбачовым і Масквой даволі сур'ёзна. У канцы 1980-х і ў 1990-1991 гг. Зянон Пазняк (лідар БНФ) неаднаразова падкрэсліваў, што БНФ падтрымліваў імкненні палякаў Беларусі да нацыянальна-культурнай аўтаноміі, але пры гэтым таксама папярэджваў, што ён і яго арганізацыя не дапусцяць стварэн-

най польскамоўнай адукацыі і выкладання польскай мовы ў школах. Наадварот, у гэты цяжкі для СПБ час, звязаны з атрыманнем усіх неабходных дазволаў на будаўніцтва і адкрыццё польскіх школ у Беларусі, лідары БНФ, як у Мінску, так і ў Гродне, падтрымлівалі СПБ[58].

Узнікае пытанне: калі БНФ не быў супраць аднаўлення польскамоўнай адукацыі ў Беларусі, то чаму ў польскай гістарыяграфіі гаворыцца пра яго антыпольскую пазіцыю? Адказ заключаецца ў тым, што асобныя польскія навукоўцы і беларускія даследчыкі, якія пішуць на польскай мове, прадузята ацэньваюць дзейнасць апазіцыі ў Беларусі і несумленна даследуюць падзеі, звязаныя з гэтым пытаннем[59]. Так, напрыклад, Казімеж Францкевіч, спасылаючыся на публікацыю Тадэвуша Кручкоўскага[60], піша: „У перыяд урадаў Станіслава Шушкевіча — Зянона Пазняка беларускія ўлады, як цэнтральныя, так і мясцовыя, якія ў большасці складаліся з нацыянальна свядомых беларусаў, заблакіравалі будаўніцтва польскіх школ у Гродне, Лідзе, Навагрудку і Воранаве”[61]. Праглядаючы старонку 249 працы Кручкоўскага, на якую спасылаецца Францкевіч, такога сцвярджэння мы не знайшлі. Памылковым у Францкевіча з'яўляецца і інфармацыя пра знаходжанне ва ўрадзе Зянона Пазняка. Праўдзівае ў выснове польскага даследчыка толькі тое, што будаўніцтва польскіх школ у Лідзе і Навагрудку заблакіравалі ўлады[62]. Але гэта былі прадстаўнікі старой камуністычнай наменклатуры, якія займалі кіруючыя пасады

ня на тэрыторыі Беларусі польскай нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі. Варта прызнаць, што СПБ не даваў ніякіх нагодаў для абвінавачванняў у спробах стварэння польскай нацыянальна-тэрытарыяльнай аўтаноміі. Але гэтае пытанне настолькі было балючым для БНФ, што кожны раз падчас сустрэч на ўзроўні кіраўніцтва БНФ і СПБ яно падымалася з боку старшыні Фронту.

58 Падрабязней на гэту тэму гл.: R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, s. 93.

59 Праблема ў тым, што ўсе публікацыі асобных аўтараў (якія не маюць ніякага дачынення да БНФ) з выступамі супраць адраджэння польскамоўнай адукацыі і выкладання польскай мовы ў школах успрымаюцца праціўнікамі супрацоўніцтва паміж БНФ і СПБ у якасці бэнээфаўскіх нападак на СПБ. Больш падрабязна на гэту тэму гл.: П. Капчык, *Каго рыхтуем: партнёраў ці „перабежчыкаў”?*, „Настаўніцкая газета”, № 91, 12.11.1994; М. Кузняцоў, *Беларуская карта Польшчы*, „Чырвоная змена”, № 129, 01.12.1994; У. Хількевіч, *Хлеб з маслам будзе толькі ў адукаваных...*, „Звязда”, № 253, 09.12.1994; С. Посохов, *Давайте научим орудия стрелять маслом, или Мир живёт по законам выгоды и силы*, „Народная газета”, № 18, 26.01.1995.

60 T. Kruczkowski, *Polacy na Białorusi na tle historii i współczesności*, s. 249.

61 K. Frąckiewicz, *Białoruska opozycja narodowa a problematyka „odrodzenia” polskości w BSSR—RB*, s. 162.

62 М. Гаравы, *Суд адмовіў палякам*, „Пагоня”, № 39 (416), 17.06.1999.

ў гэтых гарадах, напрыклад, старшыні Лідскага гарадскога выканаўчага камітэта У. Малец і Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта Анатоль Ліс.

Тадэвуш Кручкоўскі ў сваёй працы (*Polacy na Białorusi na tle historii i współczesności*, Słonim 2003) на старонцы 242 увёў у навуковы ўжытак непраўдзівы тэзіс аб тым, што ў пачатку і сярэдзіне 1990-х гг. у пытаннях адукацыі, культуры і палітыкі, датычных польскай нацыянальнай меншасці, вызначальную ролю адыгрываў БНФ, які ў той час знаходзіўся ў апазіцыі да беларускага ўрада. Развіваючы гэтую тэму, Т. Кручкоўскі сцвярджае, што менавіта ўрад В. Кебіча заблакіраваў развіццё польскамоўнай адукацыі ў Беларусі. Адначасова ён зусім беспадстаўна прыпісвае прыняцце рашэння пра аднаўленне гэтай адукацыі А. Лукашэнку[63].

Уводзячы гэтае сцвярджэнне ў навуковы ўжытак, Т. Кручкоўскі не спасылаецца на крыніцы. Пры гэтым варта звярнуць увагу, што Т. Кручкоўскі, калі СПБ вёў з уладамі Беларусі перамовы, а часам і барацьбу (пікеты, дэманстрацыі) за аднаўленне польскамоўнай адукацыі, знаходзіўся за межамі Беларусі[64], апроч таго, не ўваходзіў у кіраўніцтва СПБ і, такім чынам, не мог ведаць усіх падрабязнасцей, звязаных з дзейнасцю ў справе польскага адраджэння. Тым не менш, несумленны падыход да гэтага пытання стаў прычынай таго, што шматлікія польскія навукоўцы выкарыстоўваюць сцвярджэнні Т. Кручкоўскага і выбудоўваюць вобраз беларускай дэмакратычнай апазіцыі, які не адпавядае рэчаіснасці.

Часта здараецца так, што не да канца прадуманае выказванне або сцвярджэнне можа пасля зрабіцца падставай для памылковых ацэнак даследчыкамі той ці іншай падзеі. Так, у красавіку 1993 г. адзін з лідараў БНФ у Гродне, журналіст і дэпутат гарадскога савета Валеры Задаля на старонках незалежнай беларускамоўнай газеты „Пагоня" напісаў: „На Гродзеншчыне разыгрываюцца ў цяперашні час расійская і польская карты (...). Замест былых камітэтаў КПБ у кожным раёне вобласці створаныя рэгулярныя органы Саюза палякаў на Беларусі (...). Неабходна даць гэтаму адпор"[65]. Нягледзячы на тое, што пазней В. Задаля змяніў сваё стаўленне да СПБ і да самай сваёй смерці (11 красавіка 2007 г.) у артыкулах у газеце „Пагоня" і іншых выданнях

63 T. Kruczkowski, *Polacy na Białorusi na tle historii i współczesności*, s. 242.

64 У 1989-1992 гг. Тадэвуш Кручкоўскі навучаўся ў аспірантуры Інстытута славяназнаўства і балканістыкі Расійскай акадэміі навук у Маскве.

65 Z. J. Winnicki, *Współczesna doktryna*, s. 81.

падтрымліваў польскае нацыянальнае адраджэнне, польскія даследчыкі не бралі гэтага пад увагу, а актуалізавалі яго пазіцыю супраць СПБ. Каб адлюстраваць, як змяніліся адносіны В. Задалі да польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі дастаткова прывесці толькі два са шматлікіх яго выказванняў на гэту тэму ў газеце „Пагоня". Так, 27 красавіка 1999 г. ён пісаў: „Вось за гэты пікет і за гэтае вось справядлівае патрабаванне пабудовы і адкрыцця польскай школы ў Наваградку беларускі суд і пакараў Гавіна"[66]. У газеце за 27 мая 1999 г. ён сцвярджаў: „Палякі Гродна такія самыя грамадзяне як мы, беларусы, і маюць права на правядзенне сваіх мерапрыемстваў і арэнду гарадскіх памяшканняў, а адмова ім у гэтым з'яўляецца супрацьпраўным"[67].

Падобная сітуацыя склалася і з Алегам Трусавым, намеснікам старшыні камісіі па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны ў Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь, актыўным сябрам БНФ. Адказваючы па просьбе С. Шушкевіча на не да канца прадуманыя патрабаванні СПБ[68], перададзеныя старшыні Вярхоўнага Савета, ён не выказаў да праблем палякаў Беларусі разумення і талерантнасці[69]. Польская гістарыяграфія пра гэтае і іншыя выказванні А. Трусава памятае[70], але зусім не згадвае, што СПБ у канчатковым выніку здолеў наладзіць з ім канструктыўныя адносіны. Сёння ніхто з даследчыкаў польскага адраджэння ў Беларусі не ўзгадвае, што А. Трусаў 11 лістапада 1992 г. на прыёме ў польскім пасольстве ў Мінску публічна заявіў пра падтрымку выкладання польскай мовы ва ўсіх школах Гродзенскай вобласці як абавязковага школьнага прадмета[71].

Узаемаадносіны СПБ з усімі палітычнымі апазіцыйнымі партыямі, якія змагаліся за дэмакратыю і выкананне правоў чалавека ў Беларусі, будаваліся ў духу разумення і павагі. СПБ мог разлічваць на іх дапамогу ў справе адраджэння польскамоўнай адукацыі і выкладан-

[66] А. Лабовіч [Валеры Задаля], *Старшыня Саюза палякаў Тадэвуш Гавін аштрафаваны на 115 млн. рублей*, „Пагоня", № 30 (407), 27.04.1999.

[67] В. Задаля, *Палякам няма месца ў Гродне*, „Пагоня", № 36 (413), 27.05.1999.

[68] Падчас сустрэчы 9 студзеня 1992 г. дэлегацыі СПБ са старшынёй Вярхоўнага Савета РБ Станіславам Шушкевічам апошняму перададзены ліст з 21 праблемным пытаннем адносна замаруджвання польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі. СПБ прасіў С. Шушкевіча пра ўмяшальніцтва і дапамогу. Падрабязней на тэму ліста гл.: Архіў СПБ, выходныя дакументы за 1992 г.

[69] Змест ліста гл.: R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, s. 21.

[70] Z. J. Winnicki, *Współczesna doktryna*, s. 122-123.

[71] T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 189; ён жа, *Zwycięstwa i porażki*, s. 476-477.

ня польскай мовы ў школах. Так, публічную акцыю, арганізаваную на цэнтральнай плошчы Гродна 19 красавіка 1995 г. з патрабаваннямі будаўніцтва другой польскай школы за сродкі беларускага бюджэту, падтрымаў БНФ, а адзін з яго лідараў, народны дэпутат РБ Мікалай Маркевіч, непасрэдна ўдзельнічаў у мерапрыемстве[72].

СПБ, у сваю чаргу, таксама дапамагаў беларускім апазіцыйным палітычным партыям, калі была такая неабходнасць. Прыкладам можа быць арганізаваны СПБ 15-19 чэрвеня 1998 г. візіт парламенцкай дэлегацыі[73] на чале з Сямёнам Шарэцкім у польскі парламент у Варшаву і сустрэча С. Шарэцкага з прэзідэнтам Польшчы Аляксандрам Квасьнеўскім[74].

Дэпутаты разагнанага А. Лукашэнкам Вярхоўнага Савета таксама падтрымлівалі польскую нацыянальную меншасць у Беларусі. А. Лябедзька (лідар АГП) і Уладзімір Нісцюк (старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета РБ па справах друку) на пасяджэнні Камітэта ПАСЕ ў Вене ў канцы студзеня 1999 г. паднялі пытанне парушэння правоў палякаў у Беларусі і папрасілі Вярхоўнага камісара па справах нацыянальных меншасцей Макса ван дэр Стула ўзяць вырашэнне гэтай праблемы пад асабісты кантроль[75].

Каб не склалася ўражанне, што СПБ узаемадзейнічаў і падтрымліваў партнёрскія адносіны толькі са структурамі БНФ у Гродне, варта прывесці ў якасці прыкладу адну са шматлікіх сустрэч з лідарамі БНФ з Мінска. 19 лістапада 1999 г. Галоўнае праўленне СПБ наведаў Вячаслаў Сіўчык, змагар за свабоду, суверэнітэт і дэмакратыю ў Беларусі, сябра як Вінцука Вячоркі, так і З. Пазняка, старшынь БНФ. Гэты чалавек за сваю палітычную і апазіцыйную дзейнасць неаднаразова арыштоўваўся, сядзеў у турме. Пасля сустрэчы з кіраўніцтвам СПБ у інтэрв'ю газеце „Глос знад Немна" В. Сіўчык сказаў: „Мы заўсёды высока цанілі арганізацыі, якія выказвалі салідарнасць з нацы-

72 R. Karaczun, *Wiec protestacyjny w Grodnie. Krzyk rozpaczy*, „Głos znad Niemna", nr 17, 01.05—07.05.1995.

73 Аляксандр Лукашэнка пасля праведзенага ў 1996 г. рэферэндуму незаконна распусціў Вярхоўны Савет РБ і прызначыў у парламент паслухмяных дэпутатаў. Польшча і Парламенцкая асамблея Савета Еўропы працягвалі прызнаваць Вярхоўны Савет Беларусі на чале з Сямёнам Шарэцкім.

74 Падрабязней на тэму візіту беларускіх парламентарыяў у польскі Сейм і Сенат гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 391-392. Пасля саміту АБСЕ ў Стамбуле прайшла яшчэ адна іх сустрэча ў канцы снежня 1999 г., на якой прэзідэнт Польшчы праінфармаваў Шарэцкага пра працу саміта. Падрабязней на гэту тэму гл.: У. Глод, *Кваснеўскі сустрэўся з Шарэцкім*, „Пагоня", № 69 (446), 23.12.1999.

75 Там жа, s. 436.

янальнымі вызваленчымі сіламі, у тым ліку і Саюз палякаў на Беларусі. На працягу дзесяці гадоў сваёй дзейнасці гэтая арганізацыя даказала, што стаіць на пазіцыях дзяржаўнасці Беларусі. (...) Пакуль ва ўладзе ў Беларусі будзе заставацца сённяшняе кіраўніцтва, да таго часу будуць працягвацца антыпольскія дзеянні. Выратаваць нас зможа толькі салідарнасць. Калі мы ўсе зразумеем, дзеля чаго змагаецца тая ці іншая група нашага грамадства, калі будзем падтрымліваць іх канстытуцыйныя патрабаванні, то пераможам хутчэй. Я хацеў бы, каб гэтая барацьба была сумеснай”[76].

Сапраўдная салідарнасць самых уплывовых палітычных партый (БНФ і АГП) з СПБ праявілася ў ліпені 2005 г., калі міліцыя і спецыяльныя службы незаконна і гвалтоўна выселілі Галоўнае праўленне Саюза палякаў на чале з Анжалікай Борыс з яго адміністратыўнага будынка[77]. В. Вячорка, А. Лябедзька і А. Мілінкевіч з гэтай нагоды выступілі з заявай, у якой выказвалі падтрымку СПБ і А. Борыс, і асудзілі дзеянні беларускіх улад[78]. За некалькі месяцаў да гэтага лідар АГП А. Лябедзька і намеснік старшыні партыі БНФ Віктар Івашкевіч рашэнне Міністэрства юстыцыі ад 12 траўня 2005 г. пра ануляванне вынікаў VI з’езда СПБ назвалі „чысткай”, бо ў кіраўніцтва Саюза прыйшлі непажаданыя для беларускіх улад людзі[79].

Падсумоўваючы вынікі супрацоўніцтва СПБ з беларускімі апазіцыйнымі партыямі, можна адзначыць, што, нягледзячы на пастаянную працу, якая праводзілася беларускімі ўладамі і іх агентурай унутры СПБ[80], яны не здолелі раскалоць грамадзянскую супольнасць і раз’яднаць СПБ і апазіцыйныя арганізацыі (у першую чаргу БНФ). Усе абвінавачванні БНФ у варожым стаўленні да СПБ і чыненні перашкод польскаму нацыянальнаму адраджэнню, якія сустракаюцца ў польскай гістарыяграфіі і публіцыстыцы, з’яўляюцца не да канца абгрунтаванымі.

76 TZ [Tatiana Zaleska], *Budujemy europejską Białoruś. Rozmowa z wiceprzewodniczącym BFN Wiaczasławem Siuczykiem*, „Głos znad Niemna”, nr 48 (395), 03.12.1999.

77 Беларускія ўлады не прызналі дэмакратычныя выбары, якія адбыліся 12 сакавіка 2005 г. на VI з’ездзе СПБ, калі на пасаду старшыні замест Тадэвуша Кручкоўскага была абрана Анжаліка Борыс. Ануляваўшы вынікі выбараў сілавым метадам з дапамогай беларускага АМАПу, вярнулі Кручкоўскага на пасаду старшыні.

78 Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi. Historia niszczenia niezależności 1988-2005*, Białystok 2006, s. 200.

79 Там жа, с. 137-139: *Oświadczenie Ministerstwa Spraw Zagranicznych w sprawie decyzji władz Republiki Białoruś o uznaniu za nielegalny Zjazdu Związku Polaków*

Пры гэтым у беларускай гістарыяграфіі, а таксама з боку асобных апазіцыйных грамадскіх і палітычных дзеячаў і прадстаўнікоў беларускай нацыянальна свядомай інтэлігенцыі да польскай нацыянальнай меншасці існуюць розныя стаўленні. Па сённяшні дзень застаецца шэраг супярэчнасцей паміж польскай нацыянальнай меншасцю і яе апанентамі[81]. Самымі балючымі пытаннямі з'яўляюцца сумненні адносна існавання палякаў у Беларусі і выкарыстанне польскай мовы ў літургіі Каталіцкага касцёла.

I. *Сумненні адносна існавання палякаў у Беларусі*

Меркаванне апанентаў СПБ па гэтым пытанні наступнае: у Беларусі няма і не было палякаў, а тыя, хто сябе лічыць такімі, з'яўляюцца „апалячанымі" і „акаталічанымі" беларусамі[82]. Варта пры гэтым адзначыць, што нават савецкая ўлада, якая не мела сімпатый да палякаў, праводзячы перапіс насельніцтва ў СССР, у графе „нацыянальнасць" пісала „палякі", а не „апалячаныя беларусы", „рускія" або „ўкраінцы". Апроч таго, такое трактаванне палякаў у беларускай гістарыяграфіі з'яўляецца парушэннем заканадаўства, якое лічыць прыналежнасць грамадзяніна Рэспублікі Беларусь да нацыянальнай меншасці спра-

na Białorusi, który odbył się w Grodnie w dniach 12 i 13 marca 2005 r.; *Oświadczenie Zarządu Stowarzyszenia „Wspólnota Polska" w sprawie unieważnienia Zjazdu Związku Polaków na Białorusi.*

80 Былы пасол Польшчы ў Мінску Марыюш Машкевіч лічыць, што прадстаўніком агентуры як улады, так і спецыяльных службаў у СПБ быў Тадэвуш Кручкоўскі, які ўзначальваў СПБ у 2000-2005 гг. і не прызнаў свайго паражэння на выбарах. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi. Historia niszczenia niezależności*, s. 197-198.

81 Супярэчнасці, якія існуюць у дадзенай плоскасці, грунтоўна разгледжаныя і апісаныя прафесарам Вроцлаўскага ўніверсітэта Здзіславам Юльянам Вініцкім. Тут будуць прыведзеныя толькі некаторыя з іх, якія граюць вельмі важную ролю ў справе далейшага польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі. Падрабязней на гэту тэму гл.: Z. J. Winnicki, *Białoruskie środowiska niepodległościowe wobec polskiego odrodzenia narodowego w BSRR-RB. Uwagi*, [у:] *Nie tylko Litwa*, s. 327-352.

82 Больш падрабязна на гэту тэму: H. Giebień, *Polska wobec mniejszości polskiej na Białorusi w latach 1991-2016 (do października 2016). Zarys problemu*, [у:] *Polacy na Białorusi*, s. 550; яна ж, *Działalność Związku Polaków na Białorusi w latach 1987-2005 na tle sytuacji społeczno-politycznej w Białoruskiej Socjalistycznej Republice Radzieckiej (Republice Białoruś)*, Wrocław 2014, s. 299-331; M. Koprowski, *Wojna polsko-białoruska z „kompleksem" w tle*, „Najwyższy Czas", 2005, nr 33-34. Найбольш зняважальнымі з'яўляюцца публічныя заявы некаторых беларускіх навукоўцаў, у якіх яны называюць карэннае польскае насельніцтва Беларусі „касцельнымі" палякамі.

вай яго асабістага свабоднага выбару[83]. Да прыхільнікаў меркавання пра адсутнасць у Беларусі палякаў, верагодна, можна аднесці яскравую прадстаўніцу беларускай грамадзянскай супольнасці, лаўрэатку Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святлану Алексіевіч. У інтэрв'ю польскай газеце „Rzeczpospolita" ад 5 студзеня 2017 г. на пытанне, ці патрэбнае польскае тэлебачанне ў Беларусі, яна адказала: „Такая тэлевізія тут не патрэбная. Яе будзе глядзець невялікая група людзей, у лепшым выпадку каталікі з Заходняй Беларусі". Варта адзначыць, што ў Беларусі па афіцыйных звестках налічваецца амаль 300 тысяч палякаў. Узнікае пытанне, ці ведае С. Алексіевіч пра тое, што ў Беларусі побач з іншымі нацыяльнасцямі жывуць палякі, ці яна свядома (як і некаторыя прадстаўнікі беларускай грамадзянскай супольнасці) лічыць, што ёсць толькі апалячаныя і акаталічаныя беларусы.

У дачыненні да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей такога меркавання не існуе: габрэй, які нарадзіўся ў Беларусі, лічыцца габрэем, татарын — татарынам, літовец — літоўцам. А вось паляк — гэта апалячаны беларус[84]. Прыхільнікі тэорыі адсутнасці палякаў у Беларусі садзейнічаюць тым, хто змагаецца за пашырэнне „рускага свету", вызваляючы для яго прастору коштам непрызнання палякаў.

II. *Выкарыстанне польскай мовы ў літургіі Каталіцкага касцёла*[85]

Саюз палякаў на Беларусі лічыць палітыку выцяснення польскай мовы з літургіі Каталіцкага касцёла[86] незаконнай, нічым не абгрунтаванай. Яна праводзіцца насуперак інтарэсам большасці вернікаў–палякаў. Калі часткова можна зразумець тыя беларускія апазіцыйныя палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, якія выступаюць за бе-

[83] *Закон РБ „О национальных меньшинствах в Республике Беларусь" от 11 ноября 1992 г., № 1926-XII*, „Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь", 1992, № 35, с. 550.

[84] Падрабязней на гэту тэму гл.: K. Frąckiewicz, *Białoruska opozycja narodowa a problematyka „odrodzenia" polskości w BSSR-RB*, s. 171-172; Z. J. Winnicki, *Współczesna doktryna*, s. 204.

[85] Гэтае пытанне грунтоўна разгледжана Казімежам Францкевічам у працы *Białoruska opozycja narodowa a problematyka „odrodzenia" polskości w BSSR-RB*, s. 162-171.

[86] На 1 студзеня 2016 г. у Беларусі існавалі 470 прыходаў, працавалі 414 ксяндзоў, 164 з якіх былі замежнікамі, 1 мітрапаліт, 8 біскупаў. Кіраўніцтва ажыццяўляецца пры дапамозе Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі, якая была створана на падставе рашэння Ватыкана. Больш падрабязна на гэту тэму гл.: E. Jarmusik, *Kościół katolicki w życiu społeczno-politycznym i kulturalnym Białorusi w latach 1991-2016*, [у:] *Polacy na Białorusi*, s. 463.

ларусізацыю Касцёла, лічачы яго адным са шматлікіх беларускіх інстытутаў, то зусім незразумелая роля іерархаў Каталіцкага касцёла ў Беларусі і святароў, якія насуперак волі вернікаў пераходзяць на беларускую мову за кошт ліквідацыі польскай[87]. Ужо робіцца правілам, калі ў некаторых касцёлах Беларусі раней абвешчаную ў раскладзе польскамоўную службу святар без усялякага ўзгаднення з вернікамі праводзіць па-беларуску[88].

Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч шматразова заяўляў у сваіх публічных выступленнях, што галоўнай яго задачай з'яўляецца будаўніцтва беларускага Каталіцкага касцёла. Пры гэтым падкрэсліваў, што абавязкова трэба памятаць і пра тых вернікаў, якія размаўляюць на іншых мовах[89]. Моўная палітыка Т. Кандрусевіча прывяла да чаканых для яго вынікаў. У адным са сваіх інтэрв'ю ў верасні 2016 г. ён казаў, што ў Мінска-Магілёўскай епархіі (222 прыходы, 610 490 вернікаў)[90] толькі ў 16% прыходаў служба праводзіцца на польскай мове, ва ўсіх астатніх — на беларускай[91]. Варта адзначыць, што ў шматлікіх касцёлах польская мова выцяснялася насуперак жаданням вернікаў[92]. Вядомы польскі даследчык, прафесар кс. Раман Дзванкоўскі таксама заўважыў, што элімінацыя польскай мовы з касцёлаў Беларусі адбы-

[87] СПБ заўсёды паслядоўна прытрымліваўся меркавання, што ў касцёле павінна быць месца як для польскай мовы, так і для беларускай. Выбар, на якой мове маліцца, залежыць толькі ад вернікаў, а не ад палітычных і грамадскіх дзеячаў, дзяржаўных органаў або духавенства.

[88] У верасні 2015 г. у Нясвіжы экскурсія СПБ з Гродна, якая прыехала на абвешчаную ў раскладзе службу на польскай мове, малілася не на сваёй роднай мове. Як выявілася пасля службы, малады ксёндз, выпускнік Пінскай духоўнай семінарыі, слаба ведаў польскую мову і не быў гатовы праводзіць богаслужэнне па-польску.

[89] E. Jarmusik, *Kościół katolicki w życiu społeczno-politycznym i kulturalnym Białorusi w latach 1991-2016*, [у:] *Polacy na Białorusi*, s. 463-477.

[90] <http://catholic.by/2/ru/belarus/dioceses/minsk-mohilev2.html>, [19.10.2016].

[91] Тадеуш Кондрусевич: *Я первый совершу мессу на китайском языке*, <http://www.belaruspartisan.org/life/356223/>, [19.09.2016].

[92] 5 лютага 2000 г. дэлегацыя СПБ на чале з яго старшынёй, занепакоеная выцясненнем польскай мовы з касцёлаў ва ўсходніх абласцях Беларусі, падняла гэтае пытанне на сустрэчы з кардыналам Казімірам Свёнткам (старшынёю Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі ў 1999-2006 гг.) у яго рэзідэнцыі ў Пінску. Сустрэча адбылася па просьбе СПБ. Дэлегацыя праінфармавала кардынала К. Свёнтка пра вядомыя СПБ факты парушэння святарамі права палякаў маліцца на іх роднай мове і прасіла яго садзейнічаць справе талерантнага стаўлення да вернікаў-палякаў з боку ксяндзоў. Кардынал К. Свёнтак паабяцаў вырашыць гэтае пытанне. Старшыня СПБ пасля гэтай сустрэчы напісаў наступнае ў сваім дзённіку: „У цяперашні час у Каталіцкім касцёле ксёндз-кардынал і біскупы — палякі, пры гэтым праблемы, датыч-

ваецца насуперак волі вернікаў[93]. Польскі грамадскі дзеяч у Беларусі Тадэвуш Малевіч, падтрымліваючы гэтае меркаванне, сцвярджае, што Каталіцкі касцёл у Беларусі захаваўся ў савецкі камуністычны час, дзякуючы вернікам-палякам і святарам, якія ў асноўным таксама мелі польскае паходжанне[94]. Ён задае пытанне іерархам Касцёла: чаму зараз, калі свабодна можна вызнаваць веру, справядлівыя патрабаванні палякаў маліцца на сваёй роднай мове не выконваюцца святарамі?[95] Сёння, як лічыць беларускі даследчык Эдмунд Ярмусік, у Беларусі няма іншага больш беларусізаванага інстытута, чым Каталіцкі касцёл[96].

Пры гэтым варта пагадзіцца, што святар падчас літургіі імкнецца звяртацца да вернікаў на больш зразумелай для іх мове. Такімі для пераважнай большасці католікоў з’яўляюцца руская і беларуская. Адсутнасць ведання польскай мовы як старэйшым, так і маладым пакаленнямі палякаў з’яўляецца наступствам палітыкі іх русіфікацыі на Беларусі як у даваенны, так і ў пасляваенны час, а таксама сведчыць

ныя польскай мовы ў касцёле, не змяншаюцца, а наадварот павялічваюцца. Баюся (і ўсё на гэта ўказвае), што так, як зараз змагаемся з уладамі за ўвядзенне выкладання польскай мовы ў школах, то ў будучым можа быць так (калі не зменіцца палітыка Касцёла), што вымушаныя будзем змагацца за польскамоўную імшу ў касцёлах Гродна і ваколіц”. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 504-505.

[93] K. Frąckiewicz, *Białoruska opozycja narodowa a problematyka „odrodzenia” polskości w BSSR—RB*, s. 167; R. Dzwonkowski SAC, *Język polski w kościołach Białorusi i Ukrainy*, „Ład. Katolicki dwutygodnik społeczny”, Warszawa, 13.12.1992, s. 6; ён жа, *Problemy Kościoła katolickiego obrządku łacińskiego w byłym ZSRR*, „Zeszyty Naukowe KUL”, 1994, nr 1-2, s. 35-43; I. Kabzińska-Stawarz, *Polacy na Białorusi*, „Przegląd Wschodni”, 1994, t. 2, z. 3, s. 35-43.

[94] Ксёндз-арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч у ацэнцы дапамогі Польшчы і накіраваных з Польшчы святароў ідзе яшчэ далей. 20 верасня 2016 г. у сваім выступленні на польскім радыё заявіў: „Мы вельмі ўдзячныя польскім святарам, якія збудавалі тут шмат храмаў. Без дапамогі польскіх ксяндзоў і манашак немагчыма было б уявіць сабе такога развіцця Касцёла ў Беларусі”. Тут варта нагадаць іерарху Каталіцкага касцёла ў Беларусі, што Польшча прысылала ксяндзоў і садзейнічала будаўніцтву касцёлаў з імкненнем дапамагчы польскай меншасці ў Беларусі. У прынцыпе, як паказаў час, беларускіх палякаў выкарыстоўвалі для таго, каб атрымаць дапамогу з Польшчы ў справе аднаўлення Каталіцкага касцёла, а калі гэтая задача была выкананая, пачалося актыўнае выцясненне польскай мовы з літургіі, што адбываецца і па сённяшні дзень.

[95] Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Malewicz, *O języku w Kościele*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi*, s. 185-190.

[96] E. Jarmusik, *Kościół katolicki w życiu społeczno-politycznym i kulturalnym Białorusi w latach 1991-2016*, [у:] *Polacy na Białorusi*, s. 471.

пра адсутнасць цікаўнасці да вывучэння польскай мовы сёння. Каталіцкі касцёл у гэтых умовах, каб пазбегнуць русіфікацыі, у пераважнай большасці выпадкаў выбірае для літургіі беларускую мову.

Мова падчас службы для палякаў мае вялікае значэнне[97], і польскія грамадскія арганізацыі робяць усё, каб не дапусціць там, дзе вернікі гэтага не жадаюць, выцяснення польскай мовы з касцёла. Удзел у польскамоўным набажэнстве для шматлікіх палякаў з'яўляецца спосабам падкрэсліць сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі[98].

Пры гэтым варта прызнаць, што Касцёл не зможа адрадзіць ні беларускай, ні польскай мовы ў беларускім грамадстве. У сярэднім практыкуючыя каталікі прыходзяць у касцёл адзін раз на тыдзень, удзельнічаюць у службе на працягу адной гадзіны. Гэтага недастаткова, каб вернікі пачалі цалкам размаўляць на беларускай ці польскай мовах, калі ў штодзённым жыцці яны выкарыстоўваюць выключна рускую мову. Адрадзіць свае родныя мовы беларусам і палякам дапаможа толькі выкладанне на іх у дзяржаўных навучальных установах, палякам таксама будзе спрыяць шырока разгалінаваная сетка польскіх грамадскіх школ у Беларусі. Такім чынам, галоўнай задачай для польскай нацыянальнай меншасці на дадзены момант з'яўляецца далейшае развіццё польскамоўнай адукацыі і выкладання польскай мовы як навучальнага прадмета ў школах[99].

Такім чынам, стаўленне беларускіх апазіцыйных партый і грамадскіх арганізацый да польскай нацыянальнай меншасці і СПБ змянялася ад адкрытай варожасці да суіснавання і супрацоўніцтва[100]. Узаемадзеянне і супрацоўніцтва назіраецца і ў цяперашні час, дзякуючы актыўнасці старшыні СПБ А. Борыс[101]. Такія стасункі ў сённяшніх

[97] Больш падрабязна на гэту тэму: R. Dzwonkowski SAC, O. Gorbaniuk, J. Gorbaniuk, *Postawy katolików obrządku łacińskiego na Białorusi wobec języka polskiego*, Lublin 2004.

[98] Там жа.

[99] У сённяшняй палітычнай сітуацыі, калі ўлады дэзынтэгравалі СПБ, падпарадкавалі сабе яго частку і прымусілі працаваць па іх правілах (у выніку якіх у РБ не дадалося ніводнай польскай школы), рашэнне гэтага пытання Анжалікай Борыс з'яўляецца немагчымым. У такіх умовах СПБ павінен працаваць на будучыню, звязаную з прыходам да ўлады прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Таму так важна для СПБ працягваць супрацоўніцтва з імі.

[100] Падрабязней на гэту тэму гл. T. Gawin, Zwycięstwa *i porażki*, s. 236, 259, 272, 478-479.

[101] У лістападзе-снежні 2016 г. узнікла пагроза скарачэння фінансавання з боку польскага міністэрства замежных спраў незалежнага беларускага тэлевізій-

палітычных умовах асабліва неабходныя і важныя (прыклад Літвы паказаў, што не заўсёды нават у дэмакратычных дзяржавах правы польскай нацыянальнай меншасці цалкам выконваюцца) для таго, каб у вырашальны момант трансфармацыі палітычнага ладу ў Беларусі беларускія палякі не апынуліся ў ролі выключна прасіцеляў, у якую СПБ спіхнуў рэжым А. Лукашэнкі.

3. Польская меншасць у перыяд цэнтралізацыі палітычнага жыцця ў Беларусі

У хуткім часе пасля таго, як А. Лукашэнка стаў прэзідэнтам Беларусі, палітычная сітуацыя ў сферы грамадзянскіх правоў і свабод карэнным чынам змянілася. Беларускае заканадаўства, якое гарантавала палякам свабоднае развіццё нацыянальнай культуры, мовы і польскамоўнай адукацыі, пачало каштаваць не больш за паперу, на якой яно было надрукаванае. Як ужо адзначалася, у выніку палітычных змен у Беларусі польскае нацыянальнае адраджэнне магло адбывацца выключна ва ўмовах жорсткага супрацьстаяння і канфрантацыі палякаў як з цэнтральнай, так і з мясцовай выканаўчай уладамі.

Не лепшым чынам выглядала сітуацыя і з беларускім нацыянальным адраджэннем. Восенню 1994 г. па просьбе бацькоў у школах пачаўся масавы пераход з беларускай на рускую мову навучання. Працэс падтрымліваўся ўладамі. Міністр адукацыі (не беларус па паходжанні)

нага канала „Белсат”, які трансліруе свае перадачы на Беларусь з Польшчы. Скарачэнне фінансавання можа прывесці да спынення працы канала. У такой сітуацыі шэраг польскіх і беларускіх палітыкаў выступілі ў абарону „Белсата”, паколькі яго ліквідацыя спрыяла б абмежаванню ўплыву беларускіх дэмакратычных сіл на грамадзянскую супольнасць у Беларусі, якая знаходзіцца ў сферы татальнай расійскай і афіцыйнай беларускай прапаганды. Такія вядомыя палітычныя і грамадскія дзеячы Беларусі, як Зянон Пазняк, Станіслаў Шушкевіч, Аляксандр Мілінкевіч, Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч, Уладзімір Някляеў, лаўрэатка Нобелеўскай прэміі Святлана Алексіевіч і іншыя выступілі са зваротам да прэзідэнта Польшчы і польскага ўрада ў абарону „Белсата”. Пад гэтым зваротам падпісалася і Анжаліка Борыс. Лёгка можна ўявіць, якое было б стаўленне да палякаў у Беларусі з боку беларускіх дзеячаў, якія змагаюцца за незалежную, дэмакратычную і суверэнную беларускую дзяржаву, калі б А. Борыс адмовілася падтрымаць тэлеканал „Белсат”. *Drastyczne obcięcie dotacji dla TV Biełsat! Romaszewska: Decyzja oznacza likwidację stacji. To jakiś okrutny żart!*, <http://znadniemna.pl/20181/drastyczne-obciecie-dotacji-dla-tv-bielsat-romaszewska-decyzja-oznacza-likwidacje-stacji-jakis-okrutny-zart/>, [6.10.2017]; *Зенон Позняк написал письмо президенту Польши*, <https://charter97.org/ru/news/2016/12/31/236139/>, [28.09.2017].

В. Стражаў гэтаму не перашкаджаў. Праз некалькі гадоў вялікая праца па пераводзе школ Гродна на беларускую мову навучання, якая ажыццяўлялася кіраўніцтвам горада і вобласці ў 1991-1994 гг., а таксама беларускімі грамадскімі дзеячамі, была цалкам зведзена да нуля[102].

У канцы 1994 г. ужо стала зразумела, што стаўленне беларускіх улад да канстытуцыйных патрабаванняў палякаў у справе развіцця іх нацыянальнага адраджэння змяняліся ў горшы бок. Верагодна цэнтральнае кіраўніцтва ў Мінску паставіла перад сабой мэту не дапусціць у Беларусі аднаўлення польскамоўнай адукацыі. Інакш кажучы, зняць з сябе адказнасць за абяцанні, дадзеныя па гэтым пытанні папярэднім урадам В. Кебіча. Для абгрунтавання афіцыйнай адмовы будаваць польскія школы ў Беларусі ўладам неабходна было падрыхтаваць адпаведнае меркаванне ў беларускім грамадстве. Гэтую задачу выконвалі цэнтральны і мясцовы друк.

Такія агульнарэспубліканскія газеты, як „Советская Белоруссия"[103], „Чырвоная змена"[104], „Настаўніцкая газета"[105], „Звязда"[106] пачалі рэгулярна атакаваць СПБ. У артыкулах перш за ўсё выказваўся сумнеў у неабходнасці адкрыцця ў Беларусі польскіх школ, прызнання былых салдат АК удзельнікамі вайны з нямецкімі фашыстамі і надання ім статусу ветэранаў вайны. Саюз палякаў на Беларусі абвінавачваўся ў тым, што хоча стварыць культурна-тэрытарыяльную аўтаномію, а з часам далучыць яе да Польшчы[107]. Памочнік прэзідэнта Беларусі Сяргей Посахаў на высокім дзяржаўным узроўні прадэманстраваў яскравы прыклад неталерантнага стаўлення да беларускіх

[102] Зняцце Сямёна Домаша з пасады старшыні Гродзенскага аблвыканкама гэты працэс толькі ўзмацніла. Новы старшыня Аляксандр Дубко пераводу школ з беларускай мовы на рускую не перашкаджаў, хаця як кіраўнік вобласці мог прыпыніць гэты працэс. Верагодна, гэта была палітыка, якая ўкаранялася цэнтральнай уладай.

[103] В. Саласюк, *Конференция, которой могло и не быть, но которая всё-таки оказалась необходима*, „Советская Белоруссия", № 218 (18 992), 13.10.1994; М. Ковалёв, *Не давать Аковцам почивать на лаврах*, „Советская Белоруссия", № 263-264 (19 037 — 19 038), 03.12.1994; ён жа, *Чужие на своей земле*, „Советская Белоруссия", № 235 (19 009), 01.11.1994.

[104] М. Кузняцоў, *Беларуская карта Польшчы*, „Чырвоная змена", № 129 (13 846), 01.12.1994.

[105] П. Капчык, *Каго рыхтуем: партнёраў ці „перабежчыкаў"?*, „Настаўніцкая газета", № 91 (4449), 12.11.1994.

[106] У. Хількевіч, *Хлеб з маслам будзе толькі ў адукаваных*, „Звязда", № 253 (22 524), 9.12.1994.

[107] Падрабязней на гэтую тэму гл: T. Malewicz, *Związek Polaków a Stowarzyszenia mniejszości narodowych*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi. Związek Polaków na Białorusi w 20-lecie działalności*, s. 267-270.

палякаў, калі эксгумацыю і перапахаванне польскіх вайскоўцаў, расстраляных Чырвонай Арміяй у Гродне ў 1939 г., назваў мерапрыемствам, якое паграджае цэласнасці Беларусі. Польшча і палякі ў РБ былі прадстаўлены ў артыкулах афіцыйных газет як сіла, што марыць пра Польшчу „ад мора да мора”[108].

Звяртаючы ўвагу на перыяд напісання гэтых антыпольскіх артыкулаў (кастрычнік 1994 г. — студзень 1995 г.), можна прыйсці да высновы, што гэта была арганізаваная ўладамі і добра прадуманая кампанія, мэта якой — не дапусціць нават частковага аднаўлення польскамоўнай адукацыі. Актыўным праваднікам гэтай кампаніі быў ужо згаданы міністр адукацыі В. Стражаў, які паставіў пад сумнеў неабходнасць існавання ў Беларусі школ з польскай мовай навучання[109]. Такім чынам дзяржаўны чыноўнік выказаў пагарду беларускаму заканадаўству, у якім палякам, як і іншым нацыянальным меншасцям, гарантавалася права навучацца на роднай мове. Для СПБ гэта быў сігнал пра складанасці, якія чакаюць яго ў дзейнасці па аднаўленні польскамоўнай адукацыі ў РБ.

Пасля абрання прэзідэнтам РБ А. Лукашэнка правёў чыстку ва ўсіх структурах цэнтральнай і мясцовай улады. Ва ўрад пачалі масава вяртацца былыя партыйныя і савецкія дзеячы, вядомыя сваім негатыўным стаўленнем да польскага нацыянальнага адраджэння[110]. СПБ не мог як раней разлічваць на разуменне і добразычлівыя адносіны з боку цэнтральнай улады ў справе будаўніцтва і адкрыцця польскіх школ.

Трапна заўважыў Аляксандр Фядута ў 1995 г. у артыкуле „Хворы зуб беларускай дэмакратыі”, што афіцыйная беларуская прапаганда і палітычная эліта яшчэ пацішу, але з кожным разам усё гучней і смялей вызнаюць антыпаланізм. Фядута пісаў: „Сёння яны патрабуюць польскія школы, заўтра — нацыянальна-культурную аўтаномію, паслязаўтра — паўнавартасную, а там і да самавызначэння дойдзе. Не дапусцім Карабах у Беларусі!”[111]

[108] С. Посохов, *Давайте научим орудия стрелять маслом, или Мир живёт по законам выгоды и силы,* „Народная газета”, № 18 (1035), 26.01.1995.

[109] Т. Гавін, *Польскамоўная адукацыя ў 1988-1996 гг. у Беларусі: праблемы адраджэння і роля беларускай супольнасці Гародні*, [у:] *Гарадзенскі соцыум*, с. 327-328.

[110] Яркім прыкладам такога чыноўніка з’яўляецца Марыя Бірукова (да распаду СССР яна была другім сакратаром Гродзенскага абкама партыі), якая была прызначана на пасаду намесніка старшыні Гродзенскага аблвыканкама і пачала курыраваць адукацыю ў вобласці.

[111] А. Федута, *Больной зуб белорусской демократии*, „Белорусская деловая газета”, № 13 (174), 21.02.1995.

Нягледзячы на тое, што ўрад РБ адмовіўся ад раней узятых на сябе абавязкаў па будаўніцтве другой школы ў Гродне, СПБ спрабаваў вырашыць гэтае пытанне. Вельмі важнай для СПБ у гэтай сітуацыі была падтрымка яго патрабаванняў з боку беларускіх дэмакратычных сіл і палітычных партый, асабліва Беларускага народнага фронту. 12 студзеня 1995 г. М. Маркевіч, сябра БНФ і народны дэпутат, упершыню ў гісторыі беларускага парламента, выступаючы па „польскім пытанні", падтрымаў будаўніцтва двух польскіх школ у Гродне і адной у Ваўкавыску. Ён звярнуў увагу дэпутатаў на тое, што „грошы на будаўніцтва адной школы ў Гродне і адной у Ваўкавыску знайшліся, дзякуючы падтрымцы гэтага пытання грамадскімі арганізацыямі ў Польшчы. Ці азначае гэта, – працягваў у сваім выступленні М. Маркевіч, – што палякі павінны заўсёды самастойна займацца пошукам фінансавых сродкаў за мяжой дзяржавы, лаяльнымі грамадзянамі і падаткаплацельшчыкамі якой з'яўляюцца? Гэта падобна на дыскрымінацыю польскай супольнасці, асабліва калі ўлічыць тое, што руская супольнасць свае школы мае"[112].

Вельмі важным і дастаткова сур'ёзным фактам, які падкрэсліў у сваім выступленні народны дэпутат М. Маркевіч, было тое, што цэнтральнае кіраўніцтва Беларусі свядома праводзіла палітыку, накіраваную на парушэнне заканадаўства ў выкананні абавязкаў перад польскай нацыянальнай меншасцю. Больш за тое, М. Маркевіч публічна абвінаваціў асобных высокапастаўленых палітыкаў (не называючы іх прозвішчы) у распальванні нацыянальнай варожасці ў Беларусі[113]. Такім чынам, праблемы СПБ былі вынесены на ўзровень беларускага парламента.

У новых палітычных умовах у краіне СПБ не здолеў пазбегнуць канфрантацыі з цэнтральнай уладай. Так, будаўніцтва польскай школы ў Гродне, якое пачалося 24 верасня 1995 г., стала магчымым дзякуючы шэрагу фактараў. Па-першае, гэта рашучая і бескампрамісная барацьба СПБ, накіраваная на рэалізацыю дадзенай мэты[114]. Па-дру-

112 Падрабязней на гэту тэму гл.: Т. Гавін, *Польскамоўная адукацыя ў 1988-1996 гг. у Беларусі: праблемы адраджэння і роля беларускай супольнасці Гародні*, [у:] *Гарадзенскі соцыум*, с. 328-329. Поўны тэкст выступлення Мікалая Маркевіча ў парламенце гл.: Архіў СПБ, уваходзячыя дакументы за 1995 г.; R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, s. 40-41; „Głos znad Niemna", nr 4 (142), 30.01. — 05.02.1995.

113 R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, s. 40-41.

114 Ціск на цэнтральную ўладу праз пікетаванне перад беларускім парламентам, правядзенне ў Гродне шматтысячнага мітынгу 19 красавіка 1995 г., накіраванне ў Мінск лістоў, петыцый і рэзалюцый з патрабаваннямі будаўніцтва

гое, нягледзячы на markup рознага кшталту рознагалоссі, звязаныя з будаўніцтвам польскіх школ у вобласці, старшыня Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Дубко падтрымліваў ініцыятыву СПБ[115]. Падтрымка А. Дубко, а таксама прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі і Беларускага народнага фронту бясспрэчна дапамаглі рэалізаваць ідэю будаўніцтва польскіх школ у Гродзенскай вобласці[116].

На этапе ўзвядзення польскай школы ў Гродне выразна выявіліся супрацьлеглыя падыходы да польскамоўнай адукацыі з боку цэнтральнай улады ў Мінску і мясцовай у Гродне. Калі ў Гродне абласная ўлада на чале з А. Дубко і гарадская на чале з Г. Крупенкам разумелі патрабаванні СПБ і спрабавалі іх вырашыць, то ў Мінску адміністрацыя прэзідэнта і сам прэзідэнт ігнаравалі просьбы палякаў, нават не давалі пісьмовых адказаў на іх лісты, перакладаючы, такім чынам, усю адказнасць за вырашэнне польскага пытання на ўрад. Чаму ўлады Мінска і Гродна па-рознаму ставіліся да праблем польскай меншасці? Можна меркаваць, што цэнтральнае кіраўніцтва ў Мінску і сапраўды баялася, што развіццё польскамоўнай адукацыі прывядзе да парушэння суверэнітэту краіны, яе тэрытарыяльнай цэласнасці і да звужэння прасторы ўплыву „рускага свету”. Апроч таго, пачаўшы працэс актыўнай русіфікацыі беларускіх школ, улады ў Мінску не маглі адначасова падтрымліваць польскамоўную адукацыю.

Што тычыцца ўлад Гродна, то іх прадстаўнікі паходзілі з мясцовага беларускага насельніцтва, якое жыло побач з палякамі на працягу дзесяцігоддзяў. Яны вельмі добра разумелі, што ўсе гэтыя інсінуацыі ў адрас палякаў былі штучнымі і не мелі нічога агульнага з рэчаіснасцю. Па

польскіх школ. Падрабязнасці барацьбы СПБ за будаўніцтва школ гл.: R. Karaczun, *Wiec protestacyjny w Grodnie. Krzyk rozpaczy*, „Głos znad Niemna”, nr 17 (155), 01-07.05.1995.

115 T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 299; ён жа, *Польскамоўная адукацыя ў 1988-1996 гг. у Беларусі: праблемы адраджэння і роля беларускай супольнасці Гародні*, [у:] *Гарадзенскі соцыум*, с. 328-329.

116 Дзесяць вядомых палітычных і грамадскіх дзеячаў Гродзенскай вобласці розных нацыянальнасей (беларусы, рускія і палякі) — Мікола Маркевіч, Яўген Скрабоцкі, Таццяна Маліноўская, Аляксей Пяткевіч, Сяргей Габрусевіч, Канстанцін Жынь, Анатоль Майсяёнак, Мікалай Лук’янаў, Міхаіл Горлаў, Галіна Восіпава — падпісалі петыцыю аб падтрымцы законных патрабаванняў будаўніцтва дзвюх польскіх школ у Гродне. Петыцыя 8 студзеня 1995 г. была накіравана ў Вярхоўны Савет РБ. Падрабязней на гэтую тэму гл.: Т. Гавін, *Польскамоўная адукацыя ў 1988-1996 гг. у Беларусі: праблемы адраджэння і роля беларускай супольнасці Гародні*, [у:] *Гарадзенскі соцыум*, s. 299-300; Архіў СПБ, выходныя дакументы за студзень 1995 г.; R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, s. 38-39.

просьбе старшыні СПБ А. Дубко 31 кастрычніка 1995 г. падпісаў ліст ва ўрад М. Чыгіра, у якім утрымлівалася просьба аб вырашэнні пытання будаўніцтва другой школы ў Гродне за сродкі беларускага бюджэту[117]. Адчуваючы на сабе, як змянілася палітычная сітуацыя ў Беларусі і стаўленне да палякаў, Г. Крупенка (паляк[118] па нацыянальнасці) гэты ліст не падпісаў[119]. Верагодна, гэта зрабілася козырам у руках беларускай цэнтральнай улады ў Мінску, каб пытанне будаўніцтва другой польскай школы ў Гродне зняць з парадку дня. Так узнік падзел па „польскім пытанні" і ў асяроддзі мясцовай улады. Пасля рэферэндумаў 1995 і 1996 гг. адбыліся сур'ёзныя змены ў Канстытуцыі РБ, якія яшчэ больш умацавалі рэжым А. Лукашэнкі і тым самым пагоршылі ўмовы дзейнасці СПБ.

Калі прадстаўнікі вышэйшай улады лічылі, што СПБ можа пагражаць суверэнітэту Беларусі, то, натуральна, гэта актывізавала дзейнасць КДБ, накіраваную на дэзынтэграцыю арганізацыі і яе паслабленне, каб перашкодзіць далейшаму развіццю польскага нацыянальнага адраджэння, а ў рэшце рэшт яго зусім прыпыніць. Супрацьдзеянне КДБ стала настолькі відавочным, што СПБ вымушаны быў на гэта адрэагаваць. 12 лютага 1997 г. Саюз палякаў на Беларусі даслаў ва ўрад скаргу на дзеянні супрацоўнікаў КДБ[120].

117 Падрабязней на гэту тэму гл.: Т. Гавін, *Польскамоўная адукацыя ў 1988-1996 гг. у Беларусі: праблемы адраджэння і роля беларускай супольнасці Гародні*, [у:] *Гарадзенскі соцыум*, с. 328.

118 Калі ў 1994 г. ырашалася пытанне будаўніцтва першай польскай школы ў Гродне у беларускі ўрад быў скіраваны сумесны ліст ад мясцовай улады і СПБ з абгрунтаваннем неабходнасці з'яўлення польскай школы. Пад лістом падпісаліся старшыня аблвыканкама Сямён Домаш, старшыня гарвыканкама Генрых Крупенка і старшыня СПБ Тадэвуш Гавін. Гэта было прыкладам партнёрскіх адносін паміж СПБ і мясцовым кіраўніцтвам, а таксама вяршыняй талерантнасці і ўзаемаразумення ў вырашэнні праблем, звязаных з адраджэннем польскамоўнай адукацыі. Не прайшло і двух гадоў, як Генрых Крупенка, баючыся страціць сваю пасаду, стаў больш асцярожным у прыняцці падобных рашэнняў.

119 Гэта не дапамагло яму застацца на пасадзе. У верасні 1996 г. прэзідэнт А. Лукашэнка сваім указам вызваліў Г. Крупенку ад пасады старшыні Гродзенскага гарадскога выканкама. Падрабязней на гэту тэму гл.: *Указ Президента Республики Беларусь № 348 от 3 сентября 1996 года*, [у:] *Сборник Декретов и Указов Президента РБ за 1996 год*, Минск 1997. У абгрунтаванні Указа Прэзідэнта напісана: „За грубае парушэнне службовых абавязкаў, якое праявілася ў ігнараванні меркавання грамадзян Беларусі (...)". Верагодна мелася на ўвазе, што Г. Крупенка праігнараваў меркаванне тых грамадзян Беларусі, якія былі супраць будаўніцтва і адкрыцця польскай школы ў Гродне. У выніку гэта і было прычынай пазбаўлення яго пасады. T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 333.

120 Змест ліста гл.: Архіў СПБ, папка з выходнай карэспандэнцыяй за 1997 г.: Письмо председателя СПБ к вице-премьеру белорусского правительства В. Русакевичу; T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 349-350.

Наступным сур'ёзным сігналам з боку Мінска, які паказваў змены стаўлення да нацыянальных меншасцей, стаў вывад Каардынацыйнага савета па справах нацыянальных меншасцей (старшынёй яго быў віцэ-прэм'ер урада) з Савета Міністраў і падпарадкаванне яго Дзяржаўнаму камітэту па справах рэлігіі і нацыянальных меншасцей[121]. Члены Каардынацыйнага савета (як правіла, кіраўнікі нацыянальных аб'яднанняў), такім чынам былі пазбаўлены магчымасці наўпрост прадстаўляць свае інтарэсы і праблемы перад урадам РБ. Варта заўважыць, што ў Каардынацыйным савеце з прадстаўнікоў усіх нацыянальных меншасцей толькі СПБ падымаў пытанні, якія датычыліся правоў палякаў у Беларусі. Пасля таго як 21 верасня 1996 г. урачыста адкрылася польская школа ў Гродне[122], СПБ вельмі рашуча працягнуў барацьбу за будаўніцтва другой школы ў горадзе, а таксама школ у Ваўкавыску і Навагрудку[123].

У 1997 г. цэнтральная ўлада Беларусі мела дакладна выпрацаваную пазіцыю па пытанні далейшага развіцця польскамоўнай адукацыі. Яна імкнулася не толькі прыпыніць гэты працэс, галоўнай мэтай стала яго ліквідацыя. Пацвярджэннем гэтага з'явілася выказванне старшыні Дзяржаўнага камітэта па справах друку Уладзіміра Замяталіна на сустрэчы з кіраўніцтвам СПБ у ліпені 1997 г. у Мінску. Ён заявіў: „У бліжэйшай гістарычнай перспектыве ў Беларусі не будзе ні польскіх, ні беларускіх, ні якіх-небудзь іншых школ, акрамя рускіх"[124]. Такая заява расійскага „асадніка" ў беларускім урадзе была тым больш небяспечнай, што праз некалькі дзён пасля гэтай сустрэчы ён заняў пасаду намесніка старшыні Савета Міністраў РБ і пачаў курыраваць сферу адукацыі.

Намесніца старшыні Гродзенскага аблвыканкама па справах ідэалогіі, былая партыйная чыноўніца Марыя Бірукова, як ужо адзначалася, свядома перашкаджала не толькі будаўніцтву польскіх школ, але

[121] R. Karaczun, *W obronie naszych racji*, „Głos znad Niemna", nr 7 (249), 17-23.02.1997.

[122] Падрабязней на гэту тэму гл.: R. Karaczun, *Odrodzona szkoła*, с. 60-87.

[123] Падрабязна і змястоўна тэму дзейнасці СПБ адносна польскага нацыянальнага адраджэння ў перыяд цэнтралізацыі палітычнага жыцця ў Беларусі адлюстравала Гэлена Глагоўская ў сваёй працы. Гл.: H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku. Od Imperium Rosyjskiego do Unii Europejskiej*, Białystok 2012, s. 456-516.

[124] Архіў СПБ, уваходныя дакументы за 1997 г.: *Notatka ze spotkania delegacji ZPB z Władimirem Zamietalinem, przewodniczącym Komitetu do spraw Druku w lipcu 1997 r.*; T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 284.

і выкладанню польскай мовы ў школах як вучэбнага прадмета, абавязковага для вывучэння згодна з праграмамі. У адказ на ініцыятыву СПБ пабудаваць польскую школу ў Навагрудку яна ў снежні 1997 г. заявіла, што ў Навагрудку не будзе польскай школы[125]. Асабістая непрымірымая пазіцыя Біруковай па пытанні адраджэння польскамоўнай адукацыі ў Гродзенскай вобласці стала адной з асноўных прычын таго, што шматлікія праекты будаўніцтва польскіх школ не былі ў выніку рэалізаваны[126]. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама А. Дубко некалькі разоў адмяняў свае ўласныя станоўчыя рашэнні, звязаныя з развіццём польскамоўнай адукацыі, менавіта пад ціскам М. Біруковай, якая мела па гэтым пытанні падтрымку ў Мінску ў асобе У. Замяталіна.

Да канца 1997 г. стала зразумела, што пабудаваць польскую школу ў Навагрудку і другую ў Гродне будзе практычна немагчыма. Вырашэнне пытання польскамоўнай адукацыі ўладамі было зведзена да будаўніцтва і адкрыцця толькі дзвюх польскіх школ: у Гродне і Ваўкавыску. Больш за тое, фінансаванне іх будаўніцтва цалкам забяспечвала Польшча. Чаму беларускія ўлады, як цэнтральныя, так і мясцовыя, перашкаджалі аднаўленню польскамоўнай адукацыі ў Беларусі? Чаму М. Бірукова, якая з'яўлялася мясцовай беларускай, не толькі была супраць адкрыцця польскіх школ, але не займалася развіццём беларускамоўнай адукацыі? Ключ да адказу на гэтыя пытанні знаходзіўся ў Мінску. Урад РБ і прэзідэнт нібыта праводзілі беларускую нацыянальную палітыку, але насамрэч гэтая палітыка была цалкам прарасійскай. У прынцыпе, іначай і не магло быць, таму што пытаннямі адукацыі займаўся згаданы расійскі „асаднік" У. Замяталін. Калі б урад і прэзідэнт сапраўды планавалі развіццё беларускага нацыянальнага адраджэння, то такія людзі, як У. Замяталін, не курыравалі б справы адукацыі. Не падтрымліваючы беларускамоўнае навучанне, кіраўніцтва краіны тым больш не падтрымлівала польскамоўную адукацыю.

Пры гэтым СПБ працягваў дзейнасць, накіраваную на адкрыццё польскіх школ. Саюз палякаў на Беларусі імкнуўся ўсё ж схіліць улады да будаўніцтва другой школы ў Гродне (за кошт беларускага бюджэту) і ў Навагрудку (за сродкі Польшчы). У гэтай дзейнасці СПБ падтрымлівала беларуская дэмакратычная грамадскасць. Вядомы ў Беларусі палітычны аналітык А. Фядута (які нарадзіўся ў Гродне і таму даволі добра ведаў і адчуваў нацыянальныя праблемы рэгіёна)

[125] Архіў СПБ, уваходныя дакументы за 1997 г.: *Notatka z obrad Komitetu Organizacyjnego Obchodów 200 rocznicy urodzin Adama Mickiewicza w grudniu 1997 r.*; T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, c. 284.

надрукаваў 12 чэрвеня 1998 г. у „Беларускай дзелавой газеце” артыкул пад назвай „O Litwo, Ojczyzna moja”. У гэтым артыкуле А. Фядута як сведка нагадаў абяцанні, якія даў яшчэ кандыдат у прэзідэнты А. Лукашэнка падчас перадвыбарнай сустрэчы ў СПБ. Між іншым ён напісаў: „Палякі (...) лічаць Беларусь сваёй Радзімай. Што яны хочуць? (...) Хочуць жыць тут і заставацца сабой — беларускімі грамадзянамі польскай нацыянальнасці. Хочуць выканання пастаноў канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якія гарантуюць права грамадзян атрымліваць адукацыю на роднай мове. Хочуць справядлівасці. Нават калі будуць вымушаныя за ўласныя грошы фінансаваць рэканструкцыю чарговай кацельні ў чарговым горадзе, як гэта было ў Ваўкавыску[127]. Не просяць улады аб дапамозе, просяць, каб ім не перашкаджалі”[128].

Актыўная дзейнасць СПБ у справе аднаўлення раней знішчанай савецкай уладай польскамоўнай адукацыі прымусіла кіраўніцтва РБ прыняць меры супрацьдзеяння гэтаму. Дзяржаўны камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцей распрацаваў прапановы, накіраваныя на дэзынтэграцыю СПБ і паслабленне яго дзейнасці. Прапановы для зацвярджэння былі накіраваны ў беларускі ўрад 3 траўня 1999 г.[129], і па сённяшні дзень яны з’яўляюцца асноўнымі ў барацьбе супраць актыўнай працы СПБ. Забягаючы наперад, варта прызнаць, што, выконваючы гэтыя палажэнні, улады дасягнулі дэзынтэграцыі СПБ у 2005 г.

[126] Марыя Бірукова гэтыя папрокі лічыла неабгрунтаванымі і несправядлівымі. Падрабязней на гэту тэму гл.: H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 512-513.

[127] Ваўкавыскія ўлады, каб прымусіць Польшчу адмовіцца ад фінансавання будаўніцтва польскай школы, прыдумалі рэканструкцыю бліжэйшай гарадской кацельні за сродкі польскага боку, бо, сцвярджалі яны, не хапала магутнасці кацельні для падключэння планаванай польскай школы. Іншымі словамі, улады вырашалі гарадскую праблему за кошт шматтысячных укладанняў у доларах з боку Польшчы. Гэту ўмову Польшча па просьбе СПБ прыняла і выканала. У іншым выпадку вырашэнне пытання, звязанага з будаўніцтвам школы, магло зацягнуцца або зусім адкласціся. Падобная сітуацыя склалася і ў Гродне ў 1995 г., калі ўлады дазвалялі ўзвядзенне польскай школы толькі ў выпадку будаўніцтва новага свінакомплексу для Гродзенскага раёна, паколькі побач са школай ён размяшчацца не мог. Толькі пасля доўгіх перамоў з Аляксандрам Дубко праблему атрымалася вырашыць без інвеставання ў будаўніцтва свінакомплексу.

[128] А. Федута, *„O Litwo, Ojczyzna moja”*, „Белорусская деловая газета”, 12.06.1998.

[129] Падрабязней на гэту тэму гл.: C. Bieńkowski, *Stosunek władz centralnych RB do fenomenu odrodzenia polskiego. Zarys tendencji polityki wobec polskiej mniejszości narodowej*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi 1988-2009. Ocena minionego dwudziestolecia*, s. 152-160; T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 268-277; ён жа, *Zwycięstwa i porażki*, s. 450-455.

Прыведзеныя факты яскрава дэманструюць цынічнасць і двудушнасць Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцей у выкананні беларускага заканадаўства. Замест дапамогі ў рэалізацыі канстытуцыйных правоў польскай нацыянальнай меншасці камітэт супрацьстаяў гэтаму. Практычна ён ажыццяўляў дзяржаўную праграму па ліквідацыі ўсялякай актыўнасці СПБ у справе аднаўлення польскамоўнай адукацыі, а таксама выцяснення выкладання польскай мовы на ўзровень факультатыўнага прадмета і навучання ў гуртках.

Тым не менш у 1997/1998 навучальным годзе польская мова ў розных формах выкладалася ў 325 школах Беларусі. Усяго яе вывучалі 19353 вучні, з якіх толькі 7145 чалавек вучылі польскую мову як прадмет школьнай праграмы. У 1996 г. адкрылася польская школа ў Гродне. У 1998 г. пачалося будаўніцтва польскай школы ў Ваўкавыску, якая ўжо ў верасні 1999 г. была ўрачыста адкрыта[130].

Адраджаючы польскамоўную адукацыю, СПБ ставіў сабе за мэту адкрыццё польскіх школ таксама ў Брэсце, Мінску, Навагрудку. Класы з выкладаннем усіх прадметаў на польскай мове, якія існавалі ў гэтых гарадах, былі добрым падмуркам[131]. Мэта з'яўлялася дасягальнай, але для гэтага ў пералічаных гарадах (за выключэннем Навагрудка) не хапіла палякаў, якія былі б гатовыя яе рэалізоўваць. Кіраўнікі абласных структур СПБ у Мінску Канстанцін Тарасевіч і ў Брэсце Станіслаў Трацяк такія амбітныя мэты баяліся ставіць перад сабой[132]. Адміністратыўны націск на іх з боку Галоўнага праўлення СПБ не даў чаканых вынікаў.

Зусім інакш склалася сітуацыя ў Навагрудку, дзе актыўнасць у стварэнні класаў з польскай мовай навучання праяўляў мясцовы аддзел СПБ на чале з Соф'яй Барадын. У 1997 г., дзякуючы плённай працы Саюза палякаў на Беларусі, планавалася падпісанне дагавора з уладамі горада на будаўніцтва польскай школы. Але праведзеныя цэнтральным кіраўніцтвам у Мінску кадравыя змены гэтую магчы-

[130] Архіў СПБ, *Teczka z dokumentami dotyczącymi sytuacji z polskością na Białorusi przygotowanymi na posiedzenie komisji Senackiej do Spraw Emigracji i Polaków za granicą w marcu 1998 r.*; T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 284-285.

[131] U. Piwowar-Lesman, *Czuję się oszukany — radni nie chcą polskiej szkoły w Nowogródku*, „Trybuna", nr 139 (3135), 15.06.2000; M. Dobrynin, *Szkolnictwo polskie na Litwie, Białorusi i Ukrainie po drugiej wojnie światowej. Uwagi*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi 1988-2009*, s. 179-186.

[132] Пазней гэтыя грамадскія дзеячы пачалі падтрымліваць беларускія ўлады ў справе дэзынтэграцыі СПБ. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia niszczenia niezależności*, s. 153-154.

масць перакрэслілі. Новапрызначаны старшыня Навагрудскага райвыканкама А. Ліс катэгарычна адмовіўся падпісаць гэты дагавор. Галоўнае праўленне СПБ рабіла ўсё, каб сітуацыю выправіць. Калі справа канчаткова зайшла ў тупік, СПБ падаў у суд на кіраўніцтва раёна за парушэнне канстытуцыйных правоў палякаў — жыхароў Навагрудка. Раённы суд у Навагрудку і абласны ў Гродне ніякіх парушэнняў з боку мясцовых улад не выявілі[133]. Пасля гэтых судовых пасяджэнняў стала відавочна, што кіраўніцтва ў Мінску вырашыла канчаткова спыніць развіццё польскамоўнай адукацыі[134].

Была яшчэ адна прычына, якая дапамагла мясцовым уладам у Навагрудку, Гродне і цэнтральным у Мінску выключыць пытанне будаўніцтва польскай школы ў Навагрудку з парадку дня. Супраць з'яўлення гэтай школы публічна выступаў генеральны консул РП у Гродне Сільвестар Шостак[135]. Улады падчас сустрэч з кіраўніцтвам СПБ увесь час падкрэслівалі, што супраць будаўніцтва школы ў Навагрудку выступаюць не толькі яны, але і польскі консул[136]. Варта заўважыць, што такія паводзіны С. Шостака супярэчылі інтарэсам не толькі СПБ, але і Польшчы[137].

Кіраўніцтва СПБ спрабавала вырataваць сітуацыю, інфармуючы пра гэты інцыдэнт сусветныя і еўрапейскія структуры, якія займаліся правамі чалавека[138]. Такія дзеянні СПБ не падтрымала Польш-

[133] Суды, якія залежалі ад выканаўчай улады ў РБ, іншага рашэння не маглі прыняць.

[134] Падрабязней на тэму барацьбы за адкрыццё польскай школы ў Навагрудку гл.: T. Gawin, *Polska mniejszość narodowa na Białorusi w latach 1987-2005 a dyplomacja polska*, [у:] *Polska dyplomacja na Wschodzie w XX — początkach XXI wieku: praca zbiorowa*, red. H. Stroński i G. Sieroczyński, Olsztyn — Charków 2010, s. 509-511; ён жа, *Zwycięstwa i porażki*, s. 361-531, ён жа, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 456-486.

[135] *List prezesa ZPB do Ministra Spraw Zagranicznych RP Włodzimierza Cimoszewicza*, [у:] T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 542-544; ён жа, *Polska mniejszość narodowa na Białorusi w latach 1987-2005 a dyplomacja polska*, [у:] *Polska dyplomacja na Wschodzie w XX — początkach XXI wieku*, s. 509.

[136] U. Piwowar-Lesman, *Czuję się oszukany — radni nie chcą polskiej szkoły w Nowogródku*, „Trybuna", nr 139 (3135), 15.06.2000.

[137] Падрабязней на гэту тэму гл.: Там жа; *List prezesa ZPB do Ministra Spraw Zagranicznych RP Włodzimierza Cimoszewicza*, [у:] T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 542-544; ён жа, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 485-486.

[138] Архіў СПБ, выходныя дакументы за 1999 год: *Письмо председателя СПБ № 01-5/112 от 10.02.1999 г. к Верховному Комиссару по делам национальных меньшинств госп. Максу ван дер Стулу, г. Гаага, Голландия*; Там жа, выходныя дакументы за 1998 г.: *Ліст старшыні СПБ да амбасадара Ганса-Георга Віка кіраўніка місіі АБСЕ ў Беларусі ад 15 верасня 1998 г.*; T. Gawin, *Polska mniejszość narodowa na Białorusi w latach 1987-2005 a dyplomacja polska*, [у:] *Polska dyplomacja na Wschodzie w XX — początkach XXI wieku*, s. 509.

ча. Па ўсёй верагоднасці, пасіўнасць польскіх афіцыйных структур у пытанні будаўніцтва польскай школы ў Навагрудку і адсутнасць падтрымкі з іх боку ў рэалізацыі гэтага праекта маюць карані ў выказванні прэзідэнта Польшчы Л. Валэнсы 29 чэрвеня 1993 г. на сустрэчы з актывам СПБ у Баранавічах, дзе прысутнічалі і прадстаўнікі беларускай улады. На просьбу дапамагчы ў будаўніцтве польскай школы ў Навагрудку, скіраваную старшынёй мясцовага аддзела СПБ С. Барадын да прэзідэнта РП, апошні адказаў дакладна наступнае: „Не буду тут ствараць другі Карабах і ўводзіць танкі, паколькі гэтая зямля і без таго насычаная крывёю”[139]. Ніхто з прадстаўнікоў беларускай улады, якая супрацiўлялася адраджэнню польскамоўнай адукацыі, ніколі не карыстаўся падобнымі аргументамі.

У лістападзе 2000 г. адбыліся сур'ёзныя кадравыя змены ў кіраўніцтве СПБ. На V пазачарговым з'ездзе старшынёй арганізацыі быў абраны дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Т. Кручкоўскі[140]. Польская дыпламатыя ў Беларусі ўскладала на гэтую кандыдатуру вялікія надзеі, разлічваючы на лепшыя вынікі дзейнасці СПБ, асабліва ў сферы польскамоўнай адукацыі. Дыпламаты былі упэўненыя ў тым, што ўсе цяжкасці СПБ былі звязаныя з асобай дзеючага старшыні Саюза палякаў, які нібыта палітызаваў працу арганізацыі. Верагодна, такога меркавання прытрымлівалася польскае Міністэрства замежных спраў. Яно спадзявалася, што замена старшыні СПБ на чалавека больш памяркоўнага ў стасунках з уладамі і не ангажаванага ў палітычную дзейнасць дазволіць наладзіць партнёрскія адносіны з беларускім кіраўніцтвам і вырашыць задачы арганізацыі.

Як паказала развіццё падзей, надзеі на гэты выбар ускладалі і беларускія ўлады, якія разлічвалі такім чынам цалкам падначаліць сабе самую вялікую грамадскую арганізацыю ў Беларусі. У пачатку 2001 г. падчас афіцыйнага візіту ў Гродна прэзідэнт РБ А. Лукашэнка на сустрэчы з актывам наменклатурных работнікаў Гродзенскай вобласці заявіў: „У сучасны момант грамадска-палітычная сітуацыя ў Гродзенскай вобласці нармалізавалася, паколькі да кіраўніцтва Саюзам палякаў прыйшлі «нармальныя людзі»”[141].

[139] T. Malewicz, *Wewnętrzne i zewnętrzne przyczyny podziałów w Związku Polaków na Białorusi (albo jak zmarnowano ZPB)*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi 1988-2009*, s. 114.

[140] Падрабязней пра сітуацыю ў СПБ у 2000 г. і звязаныя з ёй кадравыя змены гл.: H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 485-487; *V Zjazd SZ ZPB. Ważna i wielka sprawa*, „Głos znad Niemna”, nr 47, 24.11.2000.

[141] Змест гэтай заявы перадаў аўтару дадзенага артыкула былы старшыня Гродзенскага гарвыканкама Генрых Крупенка, які прысутнічаў на сходзе актыву

Новы старшыня пасля абрання яго на пасаду кіраўніка СПБ зрабіў недаравальную для такога ўзроўню грамадскага дзеяча публічную заяву аб тым, што СПБ больш не будзе супрацоўнічаць з беларускай грамадзянскай супольнасцю, яе грамадскімі арганізацыямі і палітычнымі партыямі[142]. Такім чынам, праблему, якая так доўга непакоіла беларускія ўлады, ён вырашыў адной заявай. Пры гэтым ён не атрымаў і нават не паспрабаваў атрымаць ад улады пэўныя выгады для арганізацыі. Адной з іх мог быць дазвол на будаўніцтва польскай школы ў Навагрудку.

СПБ у перыяд 2000-2005 гг. адмовіўся ад працягу барацьбы за будаўніцтва польскай школы ў Навагрудку. Таксама не рэалізаваў ніводнай інвестыцыі, звязанай з будаўніцтвам і адкрыццём Польскіх дамоў. У 2005 г. наклад газеты „Глос знад Немна" ў параўнанні з 2000 г. упаў больш чым у два разы. У 2002 г. абласное тэлебачанне спыніла трансляцыю штотыднёвых польскамоўных перадач[143]. Як слушна заўважыў Войцех Сляшынскі, „згодніцкая палітыка часоў Тадэвуша Кручкоўскага не спрыяла значнаму павелічэнню актыўнасці арганізацыі ў сферы культурна-адукацыйнай дзейнасці (...). Улады абмяжоўвалі ўплыў на маладое пакаленне, пасля 2000 г. у Беларусі не была адкрыта ніводная польская школа"[144].

Як бачна з прыведзеных фактаў, спадзяванні на Т. Кручкоўскага з боку польскай дыпламатыі, Польшчы і польскіх грамадскіх дзеячаў (якія бачылі праблему развіцця польскага нацыянальнага адраджэння ў Беларусі ў 1995-2000 гг. у палітызацыі СПБ[145]) не спраўдзіліся[146].

Гродзенскай вобласці. Гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 328; ён жа, *Nasz los zależy od nas*, „Rzeczpospolita", 02.05.2002.

142 *Фрагменты выступления Тадеуша Кручковского на V Съезде СПБ*, „Głos znad Niemna", nr 47, 24.11.2000, s. 5.

143 Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Stan aktualny i perspektywy rozwoju Związku Polaków na Białorusi*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi. Związek Polaków na Białorusi w 20-lecie działalności*, s. 276-277.

144 Падрабязней на гэту тэму гл.: W. Śleszyński, *Polityka historyczna a mniejszość polska na Białorusi w latach 1991-2016*, [у:] *Polacy na Białorusi 1917-2017. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich*, red. T. Gawin, Warszawa 2017, s. 531.

145 Менавіта дзякуючы палітычнай актыўнасці ў 1995-2000 гг. СПБ дасягнуў найбольшых вынікаў у сваёй дзейнасці. У гэты перыяд кіраўніцтва СПБ падтрымлівала працоўныя кантакты як з цэнтральнай уладай у Мінску, так і з мясцовым кіраўніцтвам. Як ужо адзначалася вышэй, у перыяд супрацоўніцтва СПБ з беларускімі грамадскімі арганізацыямі і палітычнымі партыямі, у тым ліку дзякуючы іх падтрымцы, атрымалася пабудаваць і адкрыць дзве польскія школы ў Беларусі: адну ў Гродне (1996), другую ў Ваўкавыску (1999). Таксама ўзведзеныя або адаптаваныя да культурна-адукацыйнай

Пазбавіўшыся ад сапраўды адданых польскаму нацыянальнаму адраджэнню дзеячаў[147], ён не толькі не развіў дзейнасць СПБ, але і страціў тыя пазіцыі ў беларускім грамадстве, якія раней былі заваяваныя.

Вопыт дзейнасці СПБ у справе адстойвання правоў палякаў (галоўным чынам у сферы польскамоўнай адукацыі) выразна паказаў, што арганізацыя развівалася і дасягала мэты толькі тады, калі была ў стане даказаць уладам сваю рашучасць і гатоўнасць не толькі да перамоў, але і да правядзення публічных пратэстаў. Калі сіла, якую дэманстраваў СПБ, была значнай, то ўлады ішлі на ўступкі. Іншымі словамі, спрацоўваў прынцып: не сіла ў законе, а закон у сіле. На вачах у беларускай і польскай супольнасці ўлады публічна дэманстравалі (асабліва ў перыяд 2000-2005 гг.), што ў дачыненні да палякаў Беларусі, якія імкнуліся аднавіць і развіваць польскамоўную адукацыю, беларускае заканадаўства не дзейнічае.

4. Праблема польскай меншасці ў польска-беларускіх міждзяржаўных адносінах

Рэспубліка Беларусь — адносна маладая еўрапейская дзяржава, якая не мае багатых дыпламатычных традыцый. У пачатку XX ст. спрабавала іх пабудаваць Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), абвешчаная ў сакавіку 1918 г. Але гэтыя спробы былі спынены эміграцыяй урада БНР у выніку польска-савецкай вайны[148]. Беларуская Савецкая Сацы-

дзейнасці 14 Польскіх дамоў, у якіх дзейнічалі ў тым ліку польскія грамадскія школы. У гэты час ствараюцца штотыднёвыя польскамоўныя перадачы на радыё і тэлебачанні Гродна. Поспеху дасягнула газета „Глос знад Немна", якая ў 2000 г. мела 8330 падпісчыкаў. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Stan aktualny i perspektywy rozwoju Związku Polaków na Białorusi*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi*, s. 271-286.

146 Падрабязней на гэту тэму гл.: M. Maszkiewicz, *Między bezpieczeństwem a tożsamością. Rosyjskie, ukraińskie i białoruskie interpretacje idei i koncepcji w polskiej polityce wschodniej (1990-2010)*, Wrocław 2013, s. 434-436, 476-479.

147 У 2001 г. Анджэй Кусяльчук быў пазбаўлены пасады галоўнага рэдактара газеты „Глос знад Немна", крыху пазней звольненыя журналісты Анджэй Пісальнік і Анджэй Пачобут. Пасля гэтага газета пачала страчваць сваю папулярнасць, наклад яе пастаянна змяншаўся, а наступныя галоўныя рэдактары не садзейнічалі таму, каб газета адпавядала патрабаванням чытачоў. У выніку газета спыніла сваё існаванне, што з'яўляецца вялікай стратай для польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі па сённяшні час. Апроч таго, ад дзейнасці ў кіраўніцтве СПБ былі адхіленыя актыўныя дзеячы, намеснікі старшыні арганізацыі Юзаф Пажэцкі і Веслаў Кеўляк. Гэты спіс можна працягваць.

148 Падрабязней на гэту тэму гл.: D. Michaluk, *Białoruska Republika Ludowa 1918-1920. U podstaw białoruskiej państwowości*, Toruń 2010; яна ж, *Беларуская На-*

ялістычная Рэспубліка (БССР) на працягу сваёй больш чым сямідзесяцігадовай гісторыі самастойную замежную палітыку не праводзіла[149]. БССР па сутнасці не з'яўлялася суверэннай дзяржавай, фактычна яна мела статус адміністратыўнай адзінкі Савецкага Саюза[150].

Развіццё падзей у СССР у 1990-1991 гг. было выгадным для Польшчы. Ажыццяўлялася яе даўняя стратэгічная мара мець буфер на мяжы, якая аддзяляла Польшчу ад Расіі[151]. Ролю буфера ў гэтым геапалітычным раскладзе сіл павінны былі граць маладыя незалежныя дзяржавы, у тым ліку Беларусь. У інтарэсах Польшчы была распрацоўка канцэпцыі стаўлення да былых савецкіх рэспублік, якія межавалі з ёй або знаходзіліся блізка да яе тэрыторыі[152]. Гэта было асноўнай прычынай таго, што Польшча адна з першых прызнала незалежнасць Беларусі[153].

Першапачатковы перыяд двухбаковых дыпламатычных адносін паміж Польшчай і Беларуссю да распаду Савецкага Саюза (у 1989-1991 гг.) быў складаны. Так, візіт польскага міністра замежных спраў Кшыштафа Скубішэўскага ў кастрычніку 1990 г. у Мінск не прынёс чаканых вынікаў[154]. Гэта здарылася з-за некалькіх прычын, але галоўным з'яўлялася тое, што Беларусь у прыняцці міжнародных рашэнняў працягвала азірацца на Маскву[155].

родная Рэспубліка у 1918-1920 гг. Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці, Смаленск 2015.

149 E. Mironowicz, *Polityka zagraniczna Białorusi 1990-2010*, Białystok 2011, s. 13.

150 E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, Warszawa 2007, s. 253-275.

151 Падрабязней на тэму сучасных беларуска-польскіх адносін гл.: Z. J. Winnicki, *Cywilizacyjno-kulturowe uwarunkowania współczesnych relacji białorusko-polskich*, [у:] *Polska i Białoruś we współczesnej Europie*, red. nauk. J. Tymanowski, A. Daniluk, J. Bryll, Warszawa 2015, s. 227-158.

152 M. Menkiszak, M. Piotrowski, *Polska polityka wschodnia*, [у:] *Polityka zagraniczna RP 1989-2002*, red. R. Kuźniar, K. Szczepanik, Warszawa 2002.

153 Афіцыйна дыпламатычныя адносіны паміж Польшчай і Беларуссю былі наладжаны 2 сакавіка 1992 г. падчас візіту міністра замежных спраў Пятра Краўчанкі ў Варшаву. M. Kępka, *Stosunki polsko-białoruskie*, „Rocznik Polskiej Polityki Zagranicznej", 1992, s. 148-149.

154 Падрабязней на гэту тэму гл.: H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 384-385. K. Fedorowicz, *Białoruś w polskiej polityce wschodniej*, [у:] *Stosunki polsko-białoruskie. Historia i polityka*, t. I, Siedlce 2009, s. 89-90; K. Skubiszewski, *Polityka zagraniczna i odzyskanie niepodległości. Przemówienia oświadczenia, wywiady 1989-1993*, Warszawa 1997, s. 124; *Да візіту К. Скубішэўскага*, „Свабода. Беларуская газэта", кастрычнік 1990, № 11; В. Кебич, *Искушение властью. Из жизни премьер-министра*, Минск 2008, с. 188-189.

155 Падрабязней на гэту тэму гл.: E. Mironowicz, *Polityka zagraniczna Białorusi 1990-2010*, s. 37-39; A. Chodubski, *Stosunki polsko-białoruskie w latach dziewięć-*

Пасля жнівеньскага путчу ў Маскве Вярхоўны Савет БССР 25 жніўня 1991 г. прыняў дэкларацыю аб незалежнасці. 19 верасня гэтага года назва краіны змененая на Рэспубліку Беларусь і зацверджаная нацыянальная сімволіка — герб Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг. Гэты час быў спрыяльны для падпісання паміж Польшчай і Беларуссю дэкларацыі „Аб добрасуседстве”[156], што і адбылося 10 кастрычніка 1991 г. у Варшаве. Дэкларацыю падпісалі прэм’ер-міністр Рэспублікі Беларусь В. Кебіч і прэм’ер-міністр Польшчы Ян Кшыштаф Бялецкі. Трэба адзначыць, што дэкларацыя „Аб добрасуседстве” нічым не адрознівалася ад той, якая планавалася да падпісання падчас візіту міністра К. Скубішэўскага ў Мінск. Такім чынам, пасля аслаблення пазіцый СССР у свеце пачала зніжацца залежнасць Беларусі ад Масквы[157].

Дэкларацыя пацвярджала прынцыпы непарушнасці пасляваенных межаў, тэрытарыяльнай цэласнасці, мірнага вырашэння спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы, забеспячэння правоў і асноўных свабод чалавека, а таксама, што было вельмі важна як для беларускай, так і для польскай нацыянальных меншасцей, бакі абавязваліся прытрымлівацца міжнародных нормаў па іх абароне. Гэтая дэкларацыя была першым дакументам, які рэгуляваў адносіны паміж Польшчай і Беларуссю. Таксама яна адкрыла шлях для наладжвання сталых дыпламатычных узаемаадносін, што адбылося 2 сакавіка 1992 года[158].

Безумоўна, падрыхтоўка дэкларацыі і яе падпісанне ў Варшаве садзейнічалі паляпшэнню адносін паміж беларускімі ўладамі і Саюзам палякаў на Беларусі. 1 верасня 1991 г. у Гродне ўпершыню пасля вайны адкрыліся два першыя класы з вывучэннем усіх прадметаў на польскай мове, якія сталі падмуркам для будаўніцтва польскай школы. Павялічылася колькасць школ, у якіх польская мова выкладалася ў якасці абавязковага прадмета школьнай праграмы. 22 верасня 1991 г. СПБ атрымаў ад улад Гродзенскага раёна дазвол на ўсталя-

dziesiątych, [у:] *Polska polityka zagraniczna w procesie przemian po 1989 roku*, red. A. Żukowski, Olsztyn 1999, s. 148; H. Głogowska, *Białoruś w polityce polskiej między Niemcami a Rosją*, [у:] *Polska między Niemcami a Rosją*, red. T. Wallas, Poznań 1999, s. 176; R. Radzik, *Kim są Białorusini?*, Toruń 2002, s. 188-207.

156 H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 392.

157 Падчас візіту Вячаслава Кебіча ў Варшаву меў ён сустрэчу з прэзідэнтам Польшчы Лехам Валэнсам і выступленне ў польскім парламенце. Падрабязней на гэту тэму гл.: В. Кебич, *Искушение властью*, с. 312-313.

158 M. Kępka, *Stosunki polsko-białoruskie*, „Rocznik Polskiej Polityki Zagranicznej”, 1992, s. 149-150.

ванне на могілках у пасёлку Сапоцкін помніка генералу Юзафу Альшыне-Вільчынскаму, яго ад'ютанту і 31 вайскоўцу, якія загінулі 22 верасня 1939 г. у баях з чырвонаармейцамі[159]. Таксама ўпершыню за пасляваенны час 9–10 лістапада 1991 г. у г. Баранавічы прайшоў фестываль польскай песні для дзяцей і моладзі. СПБ у сваёй дзейнасці ўжо не адчуваў неабгрунтаванага супраціву з боку цэнтральнай і мясцовай улады, як гэта было раней[160]. Пацяпленне ў адносінах паміж Беларуссю і Польшчай стварала спрыяльны клімат для польскага нацыянальнага адраджэння ў РБ.

Беларусь, атрымаўшы незалежнасць, спрабавала пры падтрымцы і дапамозе Польшчы пераарыентаваць сваю замежную палітыку, вырашыць некаторыя эканамічныя праблемы[161]. Але эканамічна слабая Польшча, якая толькі некалькі гадоў таму пазбавілася камуністычнага праўлення, да таго ж мела на сваёй тэрыторыі раскватараваныя расійскія войскі і баялася ўскладненняў у адносінах з Расіяй, змагла толькі часткова дапамагчы Беларусі[162]. Гэтай дапамогі было недастаткова для таго, каб Беларусь здолела будаваць незалежную ад Расіі эканамічную і замежную палітыку.

1992 год быў насычаны двухбаковымі беларуска-польскімі кантактамі на ўзроўні прэм'ер-міністраў. У гэты год падпісаныя пагадненні, якія зацвярджалі галоўныя прынцыпы транспамежнага супрацоўніцтва. Таксама былі адкрытыя амбасады Беларусі ў Польшчы (амбасадар Уладзімір Сянько) і Польшчы ў Беларусі (амбасадар Альжбета Смулкова), адбыўся візіт у Мінск польскага прэм'ер-міністра Ганны Сухоцкай, а ў Гродне была арганізаваная яе сустрэча з польскім актывам[163].

Найбольш важнай падзеяй у беларуска-польскіх адносінах стаў візіт у Варшаву (23-25 чэрвеня 1992 г.) старшыні Вярхоўнага Савета РБ С. Шушкевіча, падчас якога з прэзідэнтам Польшчы быў падпісаны двухбаковы дагавор „Аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве"[164].

159 B. Mieszczeriakow, *Na cmentarzu w Sopoćkiniach*, „Głos znad Niemna", nr 9 (11), październik 1991.

160 Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 161- 209.

161 Якія былі праблемы гл.: E. Mironowicz, *Polityka zagraniczna Białorusi 1990-2010*, s. 39-40.

162 Падрабязней на гэту тэму гл.: Там жа, с. 40-41.

163 Падрабязней на гэту тэму гл.: H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 385-402, 581.

164 A. Wierzbowska-Miazga, *Wybór dokumentów prawnych dotyczących mniejszości narodowych*, t. II: *Polacy na Białorusi*, s. 254-259.

Варта адзначыць, што ў дагаворы шмат увагі надавалася нацыянальным меншасцям: польскай у Беларусі і беларускай у Польшчы (артыкулы 13-16). Польская меншасць паводле артыкула 14 атрымала права (індывідуальна ці сумесна з іншымі членамі сваёй групы) на свабоднае захаванне, развіццё і выяўленне сваёй этнічнай, культурнай, моўнай і рэлігійнай самабытнасці без якой-небудзь дыскрымінацыі і ва ўмовах поўнай роўнасці перад законам. Апроч таго, што артыкул 15 гарантаваў магчымасць аднаўлення польскамоўнай адукацыі ў Беларусі, польская нацыянальная меншасць атрымала права ствараць, а таксама падтрымліваць дзейнасць уласных асветных, культурных і іншых устаноў. У артыкуле 16 гаварылася, што бакі будуць развіваць канструктыўнае супрацоўніцтва ў галіне абароны правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей, разглядаючы яго як фактар умацавання ўзаемаразумення і добрасуседскіх адносін паміж беларускім і польскім народамі[165].

Беларусь даволі сур’ёзна ставілася да падрыхтоўкі і падпісання дагавора „Аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве”. Так, напярэдадні афіцыйнага візіту ў Варшаву С. Шушкевіч прыехаў у Гродна (17 чэрвеня 1992 г.). Верагодна, ён вырашыў абмеркаваць з кіраўніцтвам Гродзенскай вобласці ўсе пытанні, якія тычыліся дзейнасці польскай нацыянальнай меншасці, паколькі тут пражывала больш за 75% усіх палякаў Беларусі[166].

[165] Падрабязней на гэту тэму гл.: Там жа, с. 255-257.

[166] Для размовы са Станіславам Шушкевічам быў запрошаны ў абласны выканаўчы камітэт старшыня СПБ. Ён прадставіў у чарговы раз усе тыя пытанні польскай меншасці, рашэнне якіх патрабавала ўмяшальніцтва як урада РБ, так і кіраўніка краіны. Верагодна, падчас перамоў у Варшаве польскі бок закрануў пытанне пра перадачу памяшкання пад польскую школу ў Гродне. Абгрунтаваннем такога меркавання можа лічыцца наступны факт. Калі беларуская дэлегацыя знаходзілася ў Варшаве, старшыні СПБ патэлефанавалі старшыня таварыства „Wspólnota Polska” і міністр адукацыі Польшчы праф. Анджэй Стэльмахоўскі. Размова датычылася выключна аднаго пытання: ці пагодзіцца СПБ на прапанову беларускіх улад аб перадачы пад польскую школу ў Гродне будынка былога абкама КПБ. СПБ ад гэтай прапановы адмовіўся, бо будынак абкама — гэта архітэктурны і гістарычны помнік (т.зв. Новы замак, былы каралеўскі палац), які не прыстасаваны для размяшчэння там школы. Таксама гэта магло выклікаць незадаволенасць і пратэсты з боку беларускай інтэлігенцыі і грамадскіх арганізацый, партый, у тым ліку і БНФ. Такім чынам, прыняцце гэтай прапановы магло пазбавіць СПБ падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасці. Магчыма, прыезд С. Шушкевіча ў Гродна меў на мэце ўзгадніць з кіраўніцтвам вобласці пытанне перадачы Новага замка пад польскую школу.

Перыяд 1992-1995 гг. у адносінах паміж Беларуссю і Польшчай быў даволі насычаным і плённым[167]. 28-29 чэрвеня 1993 г. у Беларусь прыязджаў прэзідэнт Польшчы Л. Валэнса. Падчас візіту ён сустрэўся са старшынёй Вярхоўнага Савета С. Шушкевічам, прэм'ер-міністрам В. Кебічам, міністрам замежных спраў Пятром Краўчанкам, выступіў у беларускім парламенце, а таксама ўдзельнічаў у сустрэчы з палякамі ў Баранавічах і Навагрудку[168]. У Баранавічах Л. Валэнса асобна сустрэўся з Галоўным праўленнем СПБ, якое агучыла тыя праблемы польскай меншасці, у вырашэнні якіх СПБ спадзяваўся на дапамогу як прэзідэнта, так і польскага ўрада. Напярэдадні сустрэчы з Л. Валэнсам не абышлося без спрэчных і напружаных момантаў, якія прадэманстравалі, наколькі кіраўніцтва Брэсцкай вобласці і г. Брэста, у параўнанні з уладамі Гродзенскай вобласці, кансерватыўна і непрыхільна ставілася да беларускіх палякаў. Польскі бок прапанаваў, каб самалёт, на якім павінен быў прыляцець у Баранавічы прэзідэнт Л. Валэнса, сустракалі, акрамя кіраўнікоў Брэсцкай вобласці, прадстаўнікі СПБ. Улады выступілі супраць гэтай прапановы[169]. СПБ у знак пратэсту заявіў, што, паколькі сустрэча Л. Валэнсы ў гарадскім Доме культуры абвешчана як сустрэча з палякамі, арганізацыя не жадае, каб там прысутнічалі прадстаўнікі кіраўніцтва Брэсцкай вобласці. У выніку першы сакратар польскай амбасады ў Мінску Марэк Галкоўскі вырашыў гэтае спрэчнае пытанне, узяўшы з сабой дэлегацыю СПБ на сустрэчу Л. Валэнсы на ваенным аэрадроме ў Баранавічах[170].

Размова з Л. Валэнсам не прынесла тых вынікаў, на якія разлічваў СПБ. Падчас сустрэчы ў праўленні баранавіцкага аддзела арганізацыі прэзідэнту быў перададзены афіцыйны ліст з пералікам праблем польскай меншасці, якія маглі быць вырашаны з дапамогай польскага

[167] Каляндар падзей, звязаных з візітамі і сустрэчамі беларускіх і польскіх афіцыйных асоб, а таксама спіс мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў гэты перыяд беларускай нацыянальнай меншасцю ў Польшчы і польскай у Беларусі, гл.: H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 581-587.

[168] Там жа, с. 403-404.

[169] Калі ў лістападзе 1992 г. у Гродна на сустрэчу з актывам СПБ і палякамі Гродзеншчыны прылятала прэм'ер-міністр Польшчы Ганна Сухоцка, то старшыня Гродзенскага абласнога выканкама Дзмітрый Арцыменя сам патэлефанаваў старшыні СПБ і прапанаваў разам сустрэць у аэрапорце прэм'ера Польшчы. Падрабязней на тэму сустрэчы гл.: L. Michajlik, I. Artisz, J. Dziurbejko, *Jesteśmy Polakami — to brzmi dumnie,* „Głos znad Niemna", nr 24 (34), 16-31.12. 1992; T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 236-237.

[170] Падрабязней на гэту тэму гл.: I. Artisz, J. Dziurbejko, *Spotkania*, „Głos znad Niemna", nr 30 (64), 26.07. — 01.08.1993; T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 255-257.

боку. Прэзідэнт Л. Валэнса дакумент прыняў і перадаў яго міністру Мечыславу Вахоўскаму. У выніку ніякай рэакцыі на гэты ліст не было[171].

Пасля таго як А. Лукашэнка ў ліпені 1994 г. стаў прэзідэнтам Беларусі, беларуска-польскія кантакты і супрацоўніцтва працягваліся[172]. У тэлеграме на яго імя з нагоды перамогі на выбарах Л. Валэнса пісаў: „Існаванне незалежнай беларускай дзяржавы з'яўляецца для Польшчы ўмовай падтрымкі стабільнасці ў Цэнтральнай Еўропе"[173]. Маршалак польскага Сейма Юзаф Алексы, які прысутнічаў на інаўгурацыі прэзідэнта Беларусі 20 ліпеня 1994 г., у сваім выступленні заявіў: „Польшча зацікаўлена ў тым, каб разам з Беларуссю ісці па шляху пераўтварэнняў да інтэграцыі з Еўропай"[174]. Візіт у кастрычніку 1994 г. польскай парламенцкай дэлегацыі ў Мінск, у лістападзе — старшыні прэзідыума Вярхоўнага Савета РБ Мечыслава Грыба ў Польшчу і яго сустрэчы з прэзідэнтам Польшчы, прэм'ер-міністрам, маршалкамі Сейма і Сената, візіт у Польшчу ў студзені 1995 г. А. Лукашэнкі (з нагоды 50-годдзя вызвалення канцлагера Асвенцім) і яго сустрэча з Л. Валэнсам давалі надзеі на тое, што польска-беларускае супрацоўніцтва будзе развівацца[175].

Плённыя двухбаковыя адносіны паміж Беларуссю і Польшчай у перыяд з 1991 да 1995 г., і ў першую чаргу непасрэдныя кантакты паміж кіраўнікамі краін і прадстаўнікамі ўрадаў, станоўча ўплывалі на развіццё дзейнасці СПБ. У гэты час СПБ здолеў атрымаць дазвол на будаўніцтва дзвюх польскіх школ у Гродне і адной у Ваўкавыску, дамагчыся адкрыцця Цэнтра польскай культуры ў Гродне. Таксама ўлады не перашкаджалі будаўніцтву Польскіх дамоў у Беларусі для арганізацыі ў іх культурна-адукацыйнай дзейнасці. У 1995 г. у Гродне пачалося ўзвядзенне першай у Беларусі школы з польскай мовай навучання. Культурна-адукацыйная і выдавецкая дзейнасць СПБ перыядычна фінансавалася беларускімі ўладамі. Гэта быў час, калі СПБ разглядаўся беларускім кіраўніцтвам, асабліва ў Гродне, у якасці пар-

171 Там жа, s. 257.

172 Новая кіруючая кааліцыя ў Польшчы Саюз дэмакратычнай лявіцы — Польская сялянская партыя ў гэтых кантактах усё больш азіралася на Расію, гл.: M. Habowski, *Stosunki Białorusi z Polską*, [у:] *Białoruś w stosunkach międzynarodowych*, red. I. Topolski, Lublin 2009, s. 241; Гл.: E. Mironowicz, *Polityka zagraniczna Białorusi 1990-2010*, s. 44.

173 „Biuletyn Białoruski", 1994, nr 1, s. 16.

174 Там жа, с. 7.

175 H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 405-407.

тнёра для супрацоўніцтва, накіраванага на развіццё незалежнай і суверэннай Беларусі.

Кожная сустрэча на вышэйшым узроўні кіраўніцтва Беларусі і Польшчы станоўча ўплывала на дзейнасць СПБ. Не была выключэннем і сустрэча прэзідэнтаў гэтых краін 30 сакавіка 1996 г. у Віскулях у Белавежскай пушчы. Пасля яе прэзідэнт А. Квасьнеўскі ў Генеральным консульстве Польшчы сустрэўся з прадстаўнікамі беларускай дэмакратычнай апазіцыі. А ўвечары на прыёме ў польскім консульстве прысутнічалі старшыні Брэсцкага і Гродзенскага аблвыканкамаў, туды ж быў запрошаны старшыня СПБ. У грамадскай дзейнасці вельмі часта бывае так, што на працягу некалькіх месяцаў арганізацыя не можа дамовіцца з уладамі па якім-небудзь пытанні, а пасля выпадковая сустрэча ў нефармальнай абстаноўцы вырашае ўсе праблемы[176].

З восені 1996 г. двухбаковыя беларуска-польскія адносіны пачалі пагаршацца. Канстытуцыйны рэферэндум 24 лістапада 1996 г., а перад гэтым зняцце з пасады старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах Віктара Ганчара выклікалі занепакоенасць не толькі ў беларускай дэмакратычнай супольнасці, але таксама пратэсты ў Польшчы[177]. Акрамя польскіх афіцыйных структур і палітыкаў, з заявамі з нагоды палітычнай сітуацыі, якая склалася ў Беларусі, выступіў і старшыня Саюза беларусаў у Польшчы Яўген Вапа[178].

Пасля рэферэндуму 1996 г. уся ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належала аднаму чалавеку — прэзідэнту А. Лукашэнку. Створаны ім

[176] У 1996 г. СПБ атрымаў пісьмовыя пагрозы з боку мясцовых улад у Гродне: калі СПБ не пабудуе за кошт польскага бюджэту новую свінаферму замест той, якая знаходзілася побач з пляцоўкай пад польскую школу, то горад не дасць дазволу на адкрыццё школы пасля заканчэння яе будаўніцтва. На працягу некалькіх месяцаў не атрымлівалася вырашыць гэтае пытанне такім чынам, каб дэмантаж і перавод свінафермы рабіліся за сродкі яе ўладальніка. На ўрачыстай вячэры ў Брэсце падчас размовы паміж старшынямі СПБ і Гродзенскага аблвыканкама гэтае пытанне было вырашанае. Аляксандр Дубко ўпэўніў, што больш ніхто не будзе турбаваць СПБ па гэтай праблеме і слова стрымаў. Магчыма пра гэта яшчэ раней дамовіліся прэзідэнты і таму Дубко так лёгка пагадзіўся аплаціць усе выдаткі, звязаныя з фермай, з бюджэту Гродзенскай вобласці. А магчыма была і іншая прычына: разуменне кіраўніком вобласці, наколькі неэтычнай з'яўлялася спроба ўлад вырашыць пытанне будаўніцтва свінафермы за кошт польскага боку. Падрабязней на гэту тэму гл. T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 327-329.

[177] Падрабязней на гэту тэму гл.: H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 413-423; E. Mironowicz, *Polityka zagraniczna Białorusi 1990-2010*, s. 93-101.

[178] E. Wappa, *Oświadczenie*, „Czasopis", 1996, nr 12, s. 2.

марыянетачны парламент гэту ўладу павінен быў легітымізаваць у вачах беларускай і замежнай супольнасці. У выніку рэферэндуму тэрмін прэзідэнцкіх паўнамоцтваў быў працягнуты на два гады. З гэтага часу ўсе дзеянні Лукашэнкі накіраваныя выключна на ўтрыманне ўлады. Паколькі Польшча не толькі крытыкавала згортванне дэмакратыі ў Беларусі, але і аказвала як маральную падтрымку, так і матэрыяльную дапамогу[179] беларускай дэмакратычнай апазіцыі, то гэта не магло не паўплываць на беларуска-польскія адносіны і стаўленне беларускіх улад да СПБ.

Змены ў адносінах да палякаў Беларусі з боку прэзідэнта А. Лукашэнкі выявіліся падчас яго візіту ў Гродна ў жніўні 1996 г. На пытанні старшыні СПБ, які прысутнічаў на сустрэчы з прэзідэнтам, не было дадзена ніводнага адказу[180]. Больш за тое, адразу пасля візіту, 3 верасня 1996 г., знятыя з пасад і звольненыя старшыня Гродзенскага выканаўчага камітэта Г. Крупенка і загадчыца Ленінскага раённага аддзела адукацыі Людміла Маляўка, якія падтрымлівалі будаўніцтва польскай школы ў Гродне[181].

З гэтага часу (з восені 1996 г.) стала зразумела, што ўлады будуць супрацьдзейнічаць будаўніцтву другой польскай школы ў Гродне і адкрыццю такіх школ у іншых гарадах Беларусі.

У 1997-1999 гг. улады пачалі праводзіць працу, накіраваную на дэзынтэграцыю СПБ, мяркуючы, што калі яны змогуць падзяліць і падпарадкаваць сабе самую актыўную і вялікую польскую грамадскую арганізацыю, то шматлікія праблемы, звязаныя з яе актыўнасцю, знікнуць[182]. У гэтай працы па дэзынтэграцыі СПБ прэзідэнт і ўрад разлічвалі на КДБ і Дзяржаўны камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцей[183]. Кіраўніцтва СПБ, нягледзячы на тое, што беларуска-

[179] Адным з прыкладаў такой дапамогі можна лічыць фінансаванне беларускага транспамежнага радыё ў Польшчы „Рацыя" і беларускага тэлевізійнага канала „Белсат".

[180] Падрабязней на гэту тэму гл.: R. Karaczun, *Jak w Grodnie witano Prezydenta*, „Głos znad Niemna", nr 34 (224), 26.08—01.09.1996.

[181] *Указ президента РБ № 348 от 3 сентября 1996 года*, [у:] *Сборник Декретов и Указов Президента РБ за 1966 год*, Минск 1997.

[182] М. Гаравы, *Палякаў збіраюцца заклікаць „к порядку"*, „Пагоня", № 37 (414), 3.06.1999. У дадзеным артыкуле разглядаецца ліст Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцей, накіраваны ў Савет Міністраў РБ, у якім даволі дакладна напісана, што трэба зрабіць, каб паслабіць актыўную дзейнасць СПБ і прывесці яго да дэзынтэграцыі.

[183] Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Polska mniejszość narodowa na Białorusi w latach 1987-2005 a dyplomacja polska*, [у:] *Polska dyplomacja na Wschodzie w XX — początkach XXI wieku*, s. 513; ён жа, *Historia niszczenia niezależności*

польскія адносіны пагаршаліся, працягвала камунікаваць як з цэнтральнай, так і з мясцовымі ўладамі, каб дасягнуць пастаўленых мэт развіцця польскага адраджэння[184].

СПБ у пэўнай ступені з'яўляўся закладнікам у Беларусі, ён адказваў за палітыку Польшчы і крытыку беларускага рэжыму. 22 студзеня 1999 г. Сейм Польшчы прыняў „Пасланне да народа Беларусі", у якім выказаў маральную падтрымку Вярхоўнаму Савету 13 склікання[185]. У пасланні гаварылася пра павагу да ўсіх дэмакратычных сіл, якія змагаліся з рэжымам[186]. У адказ беларускі ўрад з мэтай ціску на Польшчу заявіў пра магчымасць не перарэгістраваць СПБ[187]. Усю віну за гэта ўлады ўскладалі на СПБ, які ў сваёй дзейнасці (як сцвярджаў Камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцей) парушаў беларускае заканадаўства. Камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцей накіраваў ліст у Міністэрства юстыцыі РБ з прапановай адмовіць СПБ у перарэгістрацыі[188].

Вяршыняй незадаволенасці кіраўніцтва Беларусі падтрымкай з боку Польшчы беларускай грамадзянскай супольнасці, а таксама дзейнасцю СПБ з'явілася публічнае выступленне А. Лукашэнкі 18 верасня 1999 г. у тэатры оперы і балета ў Мінску з нагоды 60-годдзя далучэння Заходняй Беларусі да БССР. Ён заявіў: „Сотня-другая ў Гродне і іншых гарадах Беларусі, якія высока аплачваюцца Захадам, спрабуюць навязаць уладам польскае пытанне, мы ім гэта не дазволім зрабіць"[189]. Верагодна сам прэзідэнт А. Лукашэнка не верыў у тое, што казаў. У падрыхтаваным да друку Беларускім тэлеграфным агенцтвам (БелТА) артыкуле гэты фрагмент яго выступлення адсутнічаў[190].

Związku Polaków na Białorusi (1988-2005), [у:] *Białoruś — trudna droga do demokracji*, red. M. Iwanow, Wrocław 2006, s. 83-103.

184 Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, с. 364, 368, 372-373.

185 Г. Барбарыч, *Палякі салідарныя з апазіцыяй*, „Пагоня", № 6 (383), 26.01.1999.

186 H. Głogowska, *Stosunki polsko-białoruskie w XX wieku*, s. 418-419.

187 У 1999 г. беларускімі ўладамі была абвешчана планавая перарэгістрацыя ўсіх грамадскіх арганізацый і палітычных партый.

188 Міністэрства юстыцыі перарэгістравала СПБ, пры гэтам заявіла, што не знайшло ў дзейнасці СПБ парушэнняў беларускага заканадаўства і статута арганізацыі. T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, с. 446-447; AK [Andrzej Kusielczuk], *Viktoria! Dwudziestego czwartego września Związek Polaków na Białorusi został ponownie zarejestrowany*, „Głos znad Niemna", nr 39 (386), 1.10.1999.

189 А. Лукашенко, *Единство Беларуси: Освящённое историей и устремлённое в будущее*, Минск 1999, с. 20-21.

190 БелТА, *Уз'яднанне Беларусі стала гістарычным справядлівым дзеяннем*, „Звязда", № 180 (2378), 21.09.1999; *Воссоединение Беларуси стало исторически справедливым деянием*, „Рэспублика", № 231 (2174), 21.09.1999.

Гэтая заява прэзідэнта была дырэктыўным указаннем структурам заканадаўчай і выканаўчай улады аб тым, якім чынам трэба будаваць адносіны з СПБ. Таксама гэта быў сігнал для кіраўніцтва Польшчы, які сведчыў, што працяг дапамогі беларускай грамадзянскай супольнасці паўплывае на абмежаванне свабоды дзейнасці СПБ. Сур'ёзны канфлікт паміж прэзідэнтамі Польшчы і Беларусі адбыўся ў Стамбуле падчас сустрэчы лідараў 52 краін — членаў АБСЕ. Лукашэнка ў сваім выступленні крытыкаваў Польшчу і яе прэзідэнта А. Квасьнеўскага за ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы Беларусі[191].

Напружаныя адносіны паміж Беларуссю і Польшчай, якія пастаянна пагаршаліся, а таксама заява А. Лукашэнкі на святкаванні 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР былі асноўнымі прычынамі таго, што 15 лістапада 1999 г. СПБ атрымаў ліст ад улад Гродна, у якім паведамлялася, што няма неабходнасці будаваць другую польскую школу ў горадзе[192]. З гэтага часу амаль усе адукацыйныя ініцыятывы СПБ не падтрымліваліся ўладамі. Змена старшыні СПБ, як было ўжо адзначана вышэй, павінна была, на думку польскай дыпламатыі, вырашыць гэту праблему. Але, як паказаў час, такая ракіроўка не прынесла чаканых вынікаў[193].

[191] Падрабязней на гэту тэму гл.: П. Мажэйка, *Лукашэнка зноў выкарыстаў палякаў*, „Пагоня", № 65 (442), 25.11.1999; AD [Andrzej Dubikowski], *Bezpieczny świat w nowym milenium. Słowa już padły, czekamy na czyny*, „Głos znad Niemna", nr 47 (394), 26.11.1999; N. Malinowska, *Bezpieczna Europa. Udział w szczycie OBWE delegacji z Białorusi*, „Głos znad Niemna", nr 46 (393), 19.11.1999.

[192] Архіў СПБ, уваходныя дакументы за 1999 год; AD [Andrzej Dubikowski], *Bezpieczny świat w nowym milenium. Słowa już padły, czekamy na czyny*, „Głos znad Niemna", nr 47 (394), 26.11.1999.

[193] Узнікаюць пытанні, чаму старшыня СПБ Тадэвуш Кручкоўскі, які быў прыхільнікам інтэграцыі Беларусі з Расіяй (M. Maszkiewicz, *Między bezpieczeństwem, a tożsamością*, s. 476-477) адкрыта дэклараваў сваё непрыхільнае стаўленне да беларускага нацыянальнага руху, падтрымліваў палітыку беларускіх улад і падпарадкаваў ім дзейнасць СПБ, на пасадзе кіраўніка самай моцнай арганізацыі, гатовай змагацца за польскае нацыянальнае адраджэнне, не змог атрымаць ад улад прэферэнцый у справе развіцця польскамоўнай адукацыі ў РБ. Чаму ўсё тое, што з такімі вялікімі цяжкасцямі было здабыта Саюзам палякаў на Беларусі, за перыяд яго праўлення альбо было страчана, альбо знаходзілася на стадыі ліквідацыі? Адказаць на гэтыя пытанні магчыма толькі ў выніку правядзення грунтоўнага даследавання. Вядома адно: мэта, якую ставілі перад сабой беларускія ўлады (зніжэнне актыўнасці СПБ у справе адраджэння польскамоўнай адукацыі) была дасягнутая. Незалежна ад таго, як развіваліся беларуска-польскія адносіны, улады мелі падначаленае ім кіраўніцтва СПБ. Гэта значыць, што дзейнасць польскай арганізацыі рэгламентавалася беларускімі ўладамі, яна не мела магчымасці самастойна прасоўваць ініцыятывы, звязаныя з нацыянальным адраджэннем.

Сітуацыю павінна была змяніць Анжаліка Борыс, якая 12 сакавіка 2005 г. на VI з'ездзе СПБ была абрана на пасаду старшыні арганізацыі. Беларускія ўлады разумелі, што пасля абрання А. Борыс яны страцяць магчымасць не толькі накіроўваць дзейнасць СПБ у патрэбнае ім рэчышча, як было раней, але і кантраляваць яго. Іншымі словамі, новае кіраўніцтва СПБ не будзе, як раней, бясспрэчна ім падпарадкоўвацца. Гэта стала галоўнай прычынай прызнання рашэння VI з'езда несапраўдным насуперак беларускаму заканадаўству і Статуту СПБ[194].

Гэтыя падзеі яшчэ больш абвастрылі адносіны паміж Польшчай і Беларуссю. Працягам пагаршэння беларуска-польскіх стасункаў стала правядзенне пры падтрымцы беларускіх улад і пры дапамозе Т. Кручкоўскага паўторнага з'езда СПБ 27 жніўня 2005 г. у Ваўкавыску, на якім на пасаду старшыні СПБ абралі Юзэфа Лучніка. Такім чынам, умяшальніцтва ўлады стварыла сітуацыю, пры якой дзейнічаў адзін Саюз палякаў на Беларусі і два яго кіраўніцтвы: адно на чале з А. Борыс, другое — з Ю. Лучнікам. Польшча прызнала кіраўніцтва А. Борыс, а беларускія ўлады — Ю. Лучніка[195].

У гэтай сітуацыі ў ролі пераможцаў выступілі ўлады Беларусі. Яны змаглі дэзынтэграваць самую вялікую ў РБ не толькі нацыянальную, але і грамадскую арганізацыю. Пры гэтым улады і звязаныя з імі беларускія даследчыкі, а таксама дзяржаўныя прапагандысты беспадстаўна абвінавацілі ў дэзынтэграцыі СПБ дэлегатаў з'езда, якія абралі А. Борыс нібыта з парушэннямі беларускага заканадаўства і Статута СПБ[196]. У польскай гістарыяграфіі некаторыя даследчыкі не толькі

[194] Падрабязней на тэму ўмяшальніцтва беларускіх улад у падрыхтоўку VI з'езда СПБ, падтрымкі Тадэвуша Кручкоўскага ў справе паўторнага абрання яго на пасаду старшыні СПБ гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi. Historia niszczenia niezależności 1988-2005*, s. 114-134; T. Malewicz, *Wewnętrzne i zewnętrzne przyczyny podziałów w Związku Polaków na Białorusi (albo jak zmarnowano ZPB)*, [у:] *Polska mniejszość na Białorusi 1988-2009*, s. 116-117.

[195] Падрабязней на тэму падтрымкі СПБ Анжалікі Борыс Польшчай, а таксама падтрымкі кіраўніцтва Юзэфа Лучніка з боку беларускіх улад, ролі ў гэтым спецыяльных службаў, у тым ліку КДБ, адміністрацыі прэзідэнта РБ, усіх органаў выканаўчай улады і СМІ, гл.: Там жа, с. 200-286; M. Maszkiewicz, *Między bezpieczeństwem, a tożsamością*, s. 477-478.

[196] На самой справе гэта была загадзя спланаваная і добра падрыхтаваная беларускімі ўладамі і сілавымі службамі спецыяльная аперацыя па перадачы кіраўніцтва СПБ у рукі чалавека, зацверджанага ўладамі. Анжаліка Борыс такім чалавекам не з'яўлялася, таму паўсталі ўсе праблемы, звязаныя з выбарам яе на пасаду старшыні СПБ. На карысць прыведзенага сцвярджэння сведчыць факт узнагароды вышэйшых кіраўнікоў адміністрацыі прэзідэн-

прытрымліваюцца падобнага меркавання, але, больш за тое, дэзынтэграцыю СПБ звязваюць з выбарам А. Борыс на пасаду старшыні СПБ, з ангажаваннем яе і асобных членаў СПБ у палітычную дзейнасць у Беларусі[197]. Гэтае сцвярджэнне, як трапна заўважыў тагачасны маршалак польскага Сейма Уладзімеж Цімашэвіч, не мае нічога агульнага з рэчаіснасцю, паколькі, як ён заявіў: „На пасаду старшыні СПБ была выбрана польская настаўніца з Гродна дагэтуль палітычна не актыўная"[198].

Нелегальнае кіраўніцтва СПБ на чале з Анжалікай Борыс (менавіта такі статус улады яму прыпісалі) больш не магло легальна праводзіць сваю дзейнасць у кірунку актыўнага адраджэння польскамоўнай адукацыі ў Беларусі. „Арганізацыя" Ю. Лучніка, як паслухмяная беларускай уладзе марыянетка, не праяўляла (і не павінна была праяўляць) ініцыятывы ў развіцці польскай культурна-адукацыйнай працы. Час паказаў, што кіраўніцтва Беларусі не памылілася ў выбары, паколькі праўладная польская арганізацыя не толькі не прасунулася ўперад у справе польскага адраджэння, але і страціла тое, што незаконна прысвоіла[199].

та, цэнтральнага і мясцовага апаратаў КДБ, МУС, юстыцыі і іншых органаў улады з фармулёўкай „За ўзорную падрыхтоўку і правядзенне на найвышэйшым узроўні мерапрыемстваў, якія ўмацоўваюць стабільнасць у сферы міжнародных адносін". Так кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Віктар Шэйман, які падпісаў загад аб узнагароджванні, назваў мерапрыемствы, накіраваныя на дэзынтэграцыю СПБ. Падрабязней на тэму зместу загада, а таксама спіса ўзнагароджаных дзяржаўных і спецыяльных служачых гл.: A. Poczobut, *Decydenci i marionetki*, „Głos znad Niemna", nr 21 (677), 22.09.2005; T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 408-410.

197 Падрабязней на гэту тэму гл.: M. Zasada, *Polska-Białoruś — sąsiedztwo skazane na niepowodzenie?*, [у:] *Polska i Białoruś we współczesnej Europie*, s. 138-140; J. Maroszek, *Działalność Związku Polaków na Białorusi pod kierownictwem Józefa Łucznika 2005-2009*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi 1988-2009*, s. 102-107.

198 Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi. Historia niszczenia niezależności 1988-2005*, s. 133-134.

199 Забраўшы пры падтрымцы беларускіх улад друкаваны орган СПБ „Głos znad Niemna", які меў у лепшыя часы сваёй дзейнасці каля 10 тысяч падпісчыкаў, СПБ пад кіраўніцтвам Мечыслава Лысага зрабіў яго банкрутам, хаця першапачаткова ўлады абяцалі фінансавую дапамогу для яго выдання. Заняпад газеты чарговы раз адлюстроўвае тое, наколькі беларускія ўлады былі незацікаўленыя не толькі ў развіцці польскай грамадскай дзейнасці, але таксама і ў развіцці польскамоўнага друку ў РБ.

Першая спроба нармалізаваць сітуацыю ў СПБ была зроблена польскім МЗС сумесна з беларускім бокам восенню 2008 г., але яна праваліласяя. Польскі цэнтральны друк абвінаваціў міністэрства замежных спраў у Варшаве ў тым, што яно рэалізуе па ўказцы Лукашэнкі яго план па наладжванні спраў у СПБ[200]. Другой спробай нармалізацыі дзейнасці СПБ стала сустрэча міністра замежных спраў Польшчы Радаслава Сікорскага з прэзідэнтам Беларусі А. Лукашэнкам у лютым 2010 г. у Кіеве[201]. Размова, якая датычылася выключна палякаў у Беларусі і СПБ, доўжылася каля гадзіны. Пасля сустрэчы Сікорскі заявіў: „Прэзідэнт Беларусі ўпэўніў мяне ў тым, што можа быць створана група экспертаў, якая за кароткі тэрмін знойдзе рашэнне, што будзе задавальняць абодва бакі"[202]. Сікорскі звярнуўся да польскіх палітыкаў і СМІ з прапановай, каб яны ў сваіх выступленнях і публікацыях не абвастралі адносіны з Беларуссю, а таксама сітуацыю, якая склалася ў СПБ. Толькі такім чынам, лічыў міністр, магчыма было выпрацаваць спрыяльныя і карысныя для польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі рашэнні[203].

За некалькі дзён да гэтай сустрэчы прэзідэнт Польшчы Лех Качынскі прыняў дэлегацыю СПБ на чале з Анжалікай Борыс і выказаў сваю салідарнасць з арганізацыяй, а таксама заклікаў Еўрапейскі Саюз прызнаць СПБ пад кіраўніцтвам А. Борыс[204].

Усе спробы нармалізаваць беларуска-польскія адносіны (а таксама сітуацыю ў СПБ) па сённяшні дзень не прывялі да чаканага канструктыўнага выніку. На гэта было некалькі прычын. Трагічная смерць Л. Качынскага 10 красавіка 2010 г. у авіяцыйнай катастрофе пад Смаленскам прывяла да страты самага вернага справам СПБ высокага ўзроўню дзяржаўнага дзеяча. Сфабрыкаваныя асяроддзем А. Лукашэнкі чарговыя прэзідэнцкія выбары ў 2010 г. выклікалі негатыўную рэакцыю ў дэмакратычнай сусветнай супольнасці, у тым ліку ў Польшчы. Гэта зноў рэзка пагоршыла польска-беларускія адносіны і справы СПБ[205].

[200] Падрабязней на гэту тэму гл.: H. Giebień, *Polska wobec mniejszości polskiej na Białorusi w latach 1991-2016 (do października 2016). Zarys problemu*, [у:] *Polacy na Białorusi*, s. 551-559; „Rzeczpospolita", 20.09.2008 і 22.09.2008; M. Maszkiewicz, *Między bezpieczeństwem a tożsamością*, s. 387.

[201] Быў запрошаны на інаўгурацыю прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча.

[202] <http://www.newsweek.pl/swiat/sikorski-z-lukaszenka-o-polakach-na-bialorusi,54318,1,1.html>, [27.10.2016].

[203] Там жа.

[204] <http://www.newsweek.pl/polska/spotkanie-andzeliki-borys-z-prezydentem-kaczynskim,54157,1,1.html>, [27.10.2016].

[205] Пытанне нармалізацыі сітуацыі ў СПБ было настолькі сур'ёзным, што знай-

Пасля прыходу да ўлады ў Польшчы ў кастрычніку 2015 г. палітычнай партыі „Права і справядлівасць" аднавіліся беларуска-польскія перамовы на ўзроўні міністраў замежных спраў[206]. У пачатку 2016 г. з польскага боку распачаліся спробы нармалізацыі адносін з Беларуссю. 22 сакавіка 2016 г. адбыліся візіт міністра замежных спраў Польшчы Вітальда Вашчыкоўскага ў Мінск і яго сустрэча з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем. На прэс-канферэнцыі пасля сустрэчы міністр В. Вашчыкоўскі заявіў: „Польшча гатовая дапамагчы Беларусі ва ўсіх накірунках будаўніцтва сучаснай, добра кіраванай, бяспечнай і суверэннай дзяржавы". Падчас сустрэчы міністраў закраналіся праблемы польскай нацыянальнай меншасці ў Беларусі[207]. Вашчыкоўскі адзначыў, што бакі дамовіліся далей размаўляць па гэтым пытанні і весці практычны дыялог[208]. На наступны дзень польскі міністр сустрэўся з прэзідэнтам А. Лукашэнкам. Пацяпленне беларуска-польскіх адносін, якое было ініцыявана міністрам В. Вашчыкоўскім, ужо 20 ліпеня 2016 г. прынесла першы сур'ёзны вынік у выглядзе падпісанай у Варшаве дамовы „Аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі паміж Беларуссю і Польшчай"[209]. Важным аспектам для СПБ і палякаў у Беларусі ў гэтым дакуменце было тое, што беларускі бок абавязваўся стварыць усе неабходныя ўмовы для развіцця польскай адукацыі. Дамова пашырыла магчымасці для актыўнай дзейнасці ў сферы польскамоўнай адукацыі для польскіх грамадскіх арганізацый.

сці рашэнне, якое б задавальняла абодва бакі канфлікту, было вельмі складана. Польскія грамадскія дзеячы, якія пераследаваліся і арыштоўваліся на 15-30 сутак (Юзаф Пажэцкі, Анджэй Пачобут, Мечыслаў Яскевіч, Анджэй Пісальнік, Веслаў Кеўляк) не жадалі сядаць за стол перамоў з тымі, хто здрадзіў усяму таму, за што яны змагаліся на працягу існавання СПБ. Калі Анжаліка Борыс, Анжаліка Арэхва, Анджэй Пачобут, Мечыслаў Яскевіч, Анджэй Пісальнік, Юзэф Пажэцкі і іншыя польскія грамадскія дзеячы змагаліся за права палякаў развіваць сваю культурна-адукацыйную дзейнасць, то Юзэф Лучнік, Станіслаў Сямашка, Казімір Знайдзінскі і іншыя былі ўцягнуты беларускімі ўладамі ў палітычную дзейнасць, падтрымлівалі рэжым А. Лукашэнкі і не займаліся адукацыйнымі праблемамі польскай меншасці. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Stan aktualny 2010 i perspektywy rozwoju Związku Polaków na Białorusi*, s. 271, przyp. 1, s. 286, przyp. 37.

206 Да гэтага восем год у Польшчы ва ўладзе знаходзілася правячая кааліцыя Грамадзянская платформа — Польская сялянская партыя.

207 Трактаваць гэта варта як дыялог пра стан і лёс СПБ.

208 <http://www.polskieradio.pl/5/3/Artykul/1598030,Witold-Waszczykowski-w-Minsku-Polska-gotowa-pomoc-Bialorusi>, [30.10.2016].

209 Дамову падпісалі намеснік міністра замежных спраў РБ Алена Купчына і намеснік міністра замежных спраў РП Марэк Зюлкоўскі.

Афіцыйны візіт маршалка Сената Польшчы Станіслава Карчэўскага ў Мінск 5 снежня 2016 г. і яго сустрэчы са старшынямі абедзвюх Палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і прэзідэнтам А. Лукашэнкам сталі чарговай спробай ліквідацыі дэзынтэграцыі СПБ, але чаканых вынікаў для польскага боку не прынеслі. Пры гэтым С. Карчэўскі сказаў, што ўлады Беларусі ведаюць праблему і гатовы яе вырашаць[210]. Варта заўважыць, што гатоўнасць беларускага боку не ішла далей за выстаўленне невыканальнага патрабавання да Польшчы і СПБ Анжалікі Борыс аб аб'яднанні дзвюх арганізацый у адну, падкантрольную ўладам Беларусі[211]. Візіт маршалка Сената праблему дэзынтэграцыі СПБ не вырашыў, але стварыў спрыяльны клімат для правядзення IX з'езда СПБ у Гродне 10 снежня 2016 г. Яго дэлегаты ўпершыню з 2005 г. не зазналі прэвентыўных арыштаў, запужванняў і затрыманняў[212].

Як адзначалася вышэй, дамова „Аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі паміж Беларуссю і Польшчай" давала магчымасці для адра-

[210] Падрабязней на гэту тэму гл.: R. Szoszyn, *Białoruś: Ważą się losy Związku Polaków*, <http://www.rp.pl/Polityka/311019934-Bialorus-Waza-sie-losy-Zwiazku-Polakow.html#ap-1>, [4.11.2016]; *Polacy na Białorusi nie dadzą sobą manipulować! Nie — dla pomysłu połączenia z KGB-owskim związkiem*, <https://reporters.pl/3305/polacy-na-bialorusi-nie-dadza-soba-manipulowac-nie-dla-pomyslu-polaczenia-z-kgb-owskim-zwiazkiem/>,[8.11.2016]; *Karczewskiego i Miasnikowicza rozmowy o ZPB*, <http://znadniemna.pl/19971/karczewskiego-miasnikowicza-rozmowy-o-zpb/>, [5.12.2016]; *Marszałek Senatu RP spotkał się z Łukaszenką*, <http://znadniemna.pl/19958/marszalek-senatu-rp-spotkal-sie-lukaszenka/>, [5.12.2016]; *Co dalej ze Związkiem Polaków na Białorusi*, <https://www.magnapolonia.org/lukaszenka-do-karczewskiego-zawsze-zylismy-w-zgodzie-i-przyjazni-mamy-bliska-a-czasem-wspolna-historie/>, [12.12.2016]; A. Poczobut, *Ciepły człowiek i zabójstwa polityczne*, <http://wyborcza.pl/7,75968,21090890,cieply-czlowiek-i-zabojstwa-polityczne.html>, [12.12.2016]; В. Сямашка, *К. Паўлік: Беларусь і Польшча шмат у чым адна адной могуць падставіць плячо!*, <http://www.racyja.com/palityka/konrad-paulik-belarus-i-polshcha-shmat/>, [21.11.2016].

[211] Падрабязней на гэту тэму гл.: *Спикер Сената Польши: Мы не будем „торговать" независимыми СМИ, белорусской оппозицией и польским национальным меньшинством*, <http://www.moyby.com/news/249463>, [30.12.2016]; *Polacy na Białorusi nie dadzą sobą manipulować! Nie — dla pomysłu połączenia z KGB-owskim związkiem*, <https://reporters.pl/3305/polacy-na-bialorusi-nie-dadza-soba-manipulowac-nie-dla-pomyslu-polaczenia-z-kgb-owskim-zwiazkiem/>, [8.11.2016].

[212] Адзіным дэлегатам з'езда, якога беларускія ўлады з дапамогай ціску на касцельныя ўлады не дапусцілі да ўдзелу, быў ксёндз Аляксандр Шэмет, капелан, духоўны бацька Саюза палякаў на Беларусі з 1990 г. R. Szoszyn, *Andżelika Borys jednoczy Polaków na Białorusi*, „Rzeczpospolita", 12.12. 2016.

джэння польскамоўнай адукацыі. Перашкодай для іх рэалізацыі стала ігнараванне пытання польскамоўнай адукацыі кіраўніцтвам СПБ, падпарадкаванага беларускім уладам. Гэтая „польская арганізацыя" ўжо 12 гадоў сваёй бяздзейнасцю свядома стрымлівае развіццё польскай культурна-адукацыйнай дзейнасці ў РБ, што шкодзіць як польскай нацыянальнай меншасці, так і польскаму дзяржаўнаму інтарэсу. Слабасць іншых польскіх арганізацый, якія існуюць у Беларусі, выкліканая нізкай актыўнасцю і недастатковай харызматычнасцю іх лідараў, дазваляе ўладам тармазіць іх культурніцкія і адукацыйныя ініцыятывы.

Працу па развіцці польскай культурна-адукацыйнай дзейнасці пастаянна ажыццяўляў дэзынтэграваны СПБ пад кіраўніцтвам у розны час Анжалікі Борыс, Анжалікі Арэхвы і Мечыслава Яскевіча[213]. Гэтая дзейнасць праходзіла ў складаных палітычных умовах супрацьстаяння з боку беларускіх улад. Таму вельмі важным з'яўляецца пытанне нармалізацыі сітуацыі ў СПБ, ліквідацыі яго дэзынтэграцыі[214]. Толь-

[213] Падрабязней на гэту тэму гл.: Архіў СПБ Анжалікі Борыс: Sprawozdanie za lata działalności Związku Polaków na Białorusi 2012-2016 wygłoszone na IX Zjeździe ZPB 10 grudnia 2016 r. przez prezesa ZPB Mieczysława Jaśkiewicza; Sprawozdanie prezesa Rady Naczelnej ZPB za lata 2012-2016 Andżeliki Borys z dnia 10 grudnia 2016 r.; Заява IX З'езду „Саюза палякаў на Беларусі" ад 10 снежня 2016 г.; Заявление IX Съезда Общественного Объединения „Союз поляков на Беларуси" о нормализации отношений с органами власти; Обращение делегатов IX Съезда Общественного Объединения „Союз поляков на Беларуси" к президенту Республики Беларуси А. Г. Лукашенко „О строительстве школы с польским языком обучения в г. Гродно"; Oświadczenie IX Zjazdu „Związku Polaków na Białorusi" o sytuacji polskiej społeczności na Białorusi; List delegatów IX Zjazdu ZPB do premier Rządu Rzeczypospolitej Polskiej Beaty Szydło. Пра дзейнасць СПБ у 2005-2010 гг., а таксама ў 2010-2012 гг. гл.: Справаздачы старшынь СПБ Анжалікі Борыс і Анжалікі Арэхвы перад дэлегатамі VII і VIII з'ездаў СПБ. O działalności legalnie wybranych władz ZPB na VI Zjeździe ZPB w marcu 2005 r., гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 410-418.

[214] Пасол Польшчы ў РБ Конрад Паўлік 9 лістапада 2016 г. у інтэрв'ю Радыё „Рацыя" заявіў: „Гэта праблема на нашым парадку дня пастаянна. Цягам апошняга візіту Вітальда Ваўшчыкоўскага было ж сумесна заяўлена, што бакі гатовыя абмяркоўваць і вырашаць УСЕ пытанні ў любых сферах. Але не ў мітынговым запале, а, як мне здаецца, крок за крокам у цішыні кабінетаў. Веру, што даможамся канкрэтных вынікаў". Падрабязней на гэту тэму гл.: В. Сямашка, *Конрад Паўлік: Беларусь і Польшча шмат у чым адна адной могуць падставіць плячо!*, <http://www.racyja.com/palityka/konrad-paulik-belarus-i-polshcha-shmat/>, [21.11.2016]; М. Карневіч, *„Нас называюць „лукашэнкаўцамі" і не прызнаюць", — афіцыйны Саюз палякаў пра магчымае аб'яднанне зь неафіцыйным*, <https://www.svaboda.org/a/28106431.html>, [21.11.2016].

кі адзіны, незалежны і аб’яднаны агульнымі мэтамі і задачамі СПБ пры падтрымцы Польшчы і беларускай грамадзянскай супольнасці зможа вырашыць з беларускімі ўладамі пытанне пра далейшае будаўніцтва і адкрыццё польскіх школ у Рэспубліцы Беларусь.

5. Канцэпцыя беларускага народа ў дзяржаўнай ідэалогіі і польская этнічная супольнасць

Беларусь — гэта краіна міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды. Так у сваіх публічных выступах і афіцыйных дакументах называюць яе прадстаўнікі беларускай улады[215]. Яны сцвярджаюць, што ў Беларусі няма ніякіх перадумоў і падстаў для ўзнікнення канфліктаў на нацыянальнай, расавай або моўнай глебе. І галоўнай мэтай дзяржавы з’яўляецца далейшае захаванне такой сітуацыі[216].

Важным фактарам, які забяспечвае мірнае суіснаванне і гарманічнае развіццё розных нацыянальных супольнасцей, лічыцца нацыянальная палітыка беларускай дзяржавы. У афіцыйных справаздачах улады гэтая палітыка выглядае даволі прыстойна. Не ведаючы рэчаіснасці, можна прыйсці да высновы, што Беларусь — гэта выспа дабрабыту ў Еўропе для ўсіх нацыянальнасцей. На самой справе гэта зусім не так. На практыцы ўлады Беларусі праводзяць дыскрымінацыйную нацыянальную і моўную палітыку нават у дачыненні да тытульнай нацыі РБ — беларусаў[217].

[215] Падрабязней на гэту тэму гл.: E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, [у:] *Polityka etniczna współczesnych państw Europy Środkowo-Wschodniej*, red. H. Chałupczak, R. Zenderowski, W. Baluk, Lublin 2015, s. 97-148; *Этноконфессиональная ситуация в Республике Беларусь.* Аналитические и справочные материалы. Национальное собрание Республики Беларусь, <http://www.sovrep.gov.by/index.php/.531.2869...0.0.0.html>, [28.10.2016].

[216] Для ідэалагічнай апрацоўкі і пераканання маладога пакалення ў тым, што сучасная беларуская нацыя фарміравалася ва ўмовах пастаяннага ўзаемадзеяння з іншымі нацыямі, а гэта, у сваю чаргу, абумовіла этнічную талерантнасць беларусаў, выкарыстоўваюцца беларускія школьныя падручнікі. *Национальная политика в Республике Беларусь*, [у:] *Учебное пособие для 11 класса общеобразовательных учреждений*, <http://userdocs.ru/pravo/920/index.html?page=17>, [4.11.2016].

[217] Пацвярджэннем гэтага тэзіса з’яўляецца, напрыклад, тое, што ў Гродне, дзе пераважную большасць насельніцтва складаюць беларусы, па сённяшні дзень няма ніводнай беларускамоўнай школы. У 2016 г. на больш чым 300 тысяч насельніцтва ў горадзе працавала толькі адна беларускамоўная група ў дзіцячым садку, другая, дзякуючы актыўнасці бацькоў, павінна адкрыцца ў 2017 г. *Гродненская семья добивается открытия белорусской группы в детском саду*, <https://charter97.org/ru/news/2016/11/1/229679/>, [07.08.2017].

Права беларускіх палякаў на навучанне на польскай мове пастаянна абмяжоўваецца ўладамі. Польскі грамадскі дзеяч і журналіст Анджэй Пачобут з Гродна заявіў на гэты конт наступнае: „На некалькі соцень тысяч палякаў у РБ дзейнічаюць па-ранейшаму толькі дзве польскія школы. Але і тут улада выкарыстоўвае абмежаванні. У гэтым годзе (2016 г. — Т. Г.) у польскай школе ў Гродне павінны былі быць тры першыя класы, столькі было жадаючых, але ўлады дазволілі сфарміраваць толькі два. Апроч таго, ліквідавалі адзіную ў Гродне польскую групу ў дзіцячым садку"[218].

Адным з фактараў, які ўплывае на нацыянальную палітыку Беларусі, з'яўляецца дзяржаўная ідэалогія, якая пачала ўводзіцца з 2003 г. у якасці навучальнага прадмета ва ўсіх сярэдніх і вышэйшых установах адукацыі[219]. Выступаючы з дакладам на семінары кіраўнікоў аддзелаў па ідэалагічнай працы 27 сакавіка 2003 г., прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка сказаў: „Грамадства не можа існаваць без цэласнага зводу ідэй, каштоўнасцей і нормаў, якія аб'ядноўваюць усіх грамадзян. Дзяржава без ідэалогіі, як і чалавек без думкі, не можа жыць і развівацца, тым больш супрацьстаяць унутраным і знешнім пагрозам і выклікам. Ідэалогія для дзяржавы — тое самае, што імунная сістэма для жывога арганізма. (...) Калі мы хочам бачыць Беларусь моцнай, квітнеючай краінай, то павінны, перш за ўсё, думаць пра ідэалагічны фундамент беларускага грамадства"[220]. А. Лукашэнка, распрацоўваючы і ўкараняючы прынцыпы дзяржаўнай ідэалогіі, думаў не пра шматнацыянальнае грамадства ў Беларусі і не пра беларускія нацыянальна-патрыятычныя сілы, якія змагаюцца за сапраўды незалежную, суверэнную і дэмакратычную дзяржаву, а перш за ўсё баяўся ўнутраных пагроз і выкарыстоўваў ідэалогію для ўтрымання асабістай улады ў краіне.

У сваім выступленні на вышэйзгаданым семінары А. Лукашэнка абвінаваціў беларускія нацыянальна-патрыятычныя сілы ў спробе пабудаваць (да прыходу яго да ўлады) дзяржаўную ідэалогію на прынцыпах крайняга нацыяналізму. Пры гэтым ён прывёў надума-

[218] R. Szoszyn, *Białoruś: Ważą się losy Związku Polaków*, <http://www.rp.pl/Polityka/311019934-Bialorus-Waza-sie-losy-Zwiazku-Polakow.html#ap-1>, [4.11.2016].

[219] Падрабязней на тэму практыкі функцыянавання ў вышэйшых і сярэдніх навучальных установах гл.: Z. J. Winnicki, *Ideologia państwowa Republiki Białoruś — teoria i praktyka projektu. Analiza politologiczna*, Wrocław 2013, s. 381-397; E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, s. 97.

[220] Z. J. Winnicki, *Ideologia państwowa Republiki Białoruś — teoria i praktyka projektu. Analiza politologiczna*, s. 431.

ныя прыклады ганенняў на рускіх у Беларусі[221]. Верагодна, гэтыя выказванні А. Лукашэнкі павінны былі выклікаць у беларускім грамадстве непрыняцце ідэй апазіцыйных арганізацый і партый. Вопыт амаль дзесяцігадовага знаходжання А. Лукашэнкі на пасадзе прэзідэнта ў той час паказваў, што закон у Беларусі — гэта ён і яго асяроддзе. Дзяржаўная ідэалогія павінна была дапамагчы падтрымліваць такі стан спраў.

Галоўны ідэолаг беларускай дзяржавы прафесар Яўген Бабосаў[222] у распрацаваным ім курсе лекцый піша: „Беларуская мадэль этнакультурнага развіцця дапускае рэалізацыю жыццёвых інтарэсаў грамадзян усіх нацыянальнасцей, (...) дзякуючы якім яны кансалідуюцца ў крайне шырокую сацыяльную супольнасць — беларускі народ. (...) Адным з істотных элементаў беларускай мадэлі этнакультурнага развіцця з'яўляецца фарміраванне агульнабеларускай ідэнтычнасці ва ўсіх грамадзян Беларусі незалежна ад іх нацыянальнай і канфесійнай прыналежнасці"[223]. Я. Бабосаў не вынайшаў нічога новага, прапаноўваючы беларускую мадэль этнакультурнага развіцця. Падобная мадэль існавала ў СССР. Да распаду Савецкага Саюза ўсе яго грамадзяне былі ўцягнутыя ў стварэнне новай супольнасці — савецкага народа. Як вядома, гэтая супольнасць не была пабудавана, а беларусы і палякі, карэннае насельніцтва БССР, у той час зазналі прымусовую русіфікацыю і саветызацыю.

Беларуская мадэль этнакультурнага развіцця, паводле Бабосава, на практыцы не мае на мэце рэалізацыю жыццёвых інтарэсаў усіх нацыянальнасцей. Гэтая мадэль працуе выключна ў інтарэсах адной нацыянальнай групы — рускай, якая ў Беларусі ўладамі пастаўлена ў прывілеяванае становішча. І зусім мадэль не задавальняе інтарэсы тытульнай нацыі — беларусаў.

У іншай сваёй працы Я. Бабосаў паставіў знак роўнасці паміж інтарэсамі дзяржавы (якую прадстаўляе ўлада) і беларускім народам (усімі грамадзянамі краіны). Ён сцвярджае: „У цяперашні час больш дакладным робіцца разуменне таго, што без нацыянальнай ідэнтыфікацыі немагчыма вызначыць нацыянальныя інтарэсы, асабліва мэты і задачы ўнутранай і замежнай палітыкі дзяржавы, знайсці годнае месца Беларусі ў сучасным свеце. Нам неабходная ідэалогія, якая б не падзяляла дзяржаву і народ, а аб'ядноўвала іх у адно цэлае. Таму яд-

[221] Падрабязней на гэту тэму гл.: Там жа, с. 436.

[222] E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, s. 98.

[223] Е. Бабосов, *Основы идеологии Белорусского Государства. Курс лекций*, Минск 2012, с. 157.

ром нашай ідэалогіі можа і павінна быць нацыянальная ідэя. (...) Калі б нацыянальную ідэю можна было назваць адным словам, то слова гэтае гучыць «беларускасць»”[224]. Далей аўтар удакладняе, што „беларускасць” ні ў якім выпадку не з’яўляецца толькі ідэнтыфікацыяй з беларускай мовай, культурай, ментальнасцю, а перш за ўсё атаясамліваецца з беларускай дзяржавай. Бабосаў лічыць, што беларуская мова і культура — другарадныя пытанні для беларускай нацыянальнай свядомасці, таму што „беларускі народ складаюць не толькі беларусы, хаця складаюць яны большасць, але таксама рускія, украінцы, палякі, літоўцы, габрэі, татары. Усе яны з’яўляюцца дзецьмі адной Радзімы”[225].

Незалежныя беларускія палітолагі і сацыёлагі разглядаюць дзяржаўную ідэалогію як утопію, якая служыць для абгрунтавання аўтарытарнага рэжыму палітычнай улады ў Беларусі[226]. Гэтая ідэалогія не ўтрымлівае нічога новага. Яна грунтуецца на савецкай мадэлі. Такое сцвярджэнне падтрымлівае вядомы беларускі тэолаг і філосаф Пётр Рудкоўскі. У сваёй новай працы „Беларускія пытанні ў святле еўрапейскіх адказаў” называе яе няўдалай альтэрнатывай камуністычнай ідэалогіі, да якой не маюць сур’ёзнага стаўлення нават тыя, хто выкладае яе ў школах і ўніверсітэтах, атрымоўваючы за гэта значныя ўзнагароды[227]. У сваю чаргу вядомы ў Беларусі польскі палітолаг Марыюш Машкевіч закранаючы ў сваіх навуковых працах тэму беларускай дзяржаўнай ідэалогіі, называе яе элементам савецкай, камуністычнай спадчыны. Ён паказвае разнавіднасці беларускай ідэалогіі і адэптаў з ліку дзяржаўных чыноўнікаў, якія прасоўваюць яе ў беларускую рэчаіснасць[228].

224 Е. Бабосов, *Роль национальной идеи в обеспечении устойчивого развития Республики Беларусь*, [у:] *Национальная политика — основы устойчивого развития государства*, Минск 2007, с. 37.

225 Там жа, с. 38.

226 Paval Usau, *Związek Radziecki w granicach odrębnego państwa. „Ideologia państwa białoruskiego” — mechanizm jej propagowania i narzucania społeczeństwu*, [у:] *Społeczeństwo białoruskie ’2007. Nadzieje, złudzenia, perspektywy*, red. M. Pejda, Warszawa — Mińsk 2007, s. 44-50; Там жа, P. Rudkouski, *Białoruska ideologia państwowa jako „utopia teraźniejszości”*, s. 51-56.

227 Падрабязней на гэту тэму гл.: P. Rudkowski, *Białoruskie pytania w kontekście europejskich odpowiedzi*, Wrocław 2017.

228 Падрабязней на гэту тэму гл.: M. Maszkiewicz, *Problemy ideologii państwowej na Białorusi*, [w:] *Białoruś — dalsza droga ku demokracji*, red. M. Iwanow, Wrocław 2012, s. 34-71; wersja angielska tekstu: M. Maszkiewicz, *State Ideology in Belarus: Main Problems and Concepts*, „Warsaw East European Review”, 2012, vol. 11, Warszawa 2013, s. 79-100.

Трапна заўважыў Яўген Мірановіч, што адначасова са стварэннем дзяржаўнай ідэалогіі ў пачатку XXI ст. з заканадаўчай тэрміналогіі пачало знікаць такое паняцце як „нацыянальныя меншасці”[229]. Паўсюдна пачалося выкарыстанне тэрмінаў „нацыянальныя супольнасці” або „этнічныя супольнасці”[230].

Укараненне ў беларускае грамадства дзяржаўнай ідэалогіі з'яўляецца вельмі небяспечным і шкодным як для развіцця сапраўднай беларускасці, так і для польскасці ў Беларусі. Для беларусаў гэта небяспечна тым, што яны, як і ў савецкі час, русіфікуюцца, а дзяржава не толькі не набывае, але страчвае ўласцівыя кожнай незалежнай і суверэннай дзяржаве нацыянальныя рысы, што звязана ў першую чаргу з невыкарыстаннем у штодзённым і публічным жыцці беларускай мовы. Як ужо адзначалася, увядзенне ў палітычную рэчаіснасць дзяржаўнай ідэалогіі прывяло да знікнення паняццяў „нацыянальныя меншасці” і „тытульная нацыя”. Замест іх выкарыстоўваецца тэрмін „этнічныя супольнасці”, якія ствараюць беларускі народ. Дзяржаўнай мовай і мовай штодзённай камунікацыі для большасці прадстаўнікоў „беларускага народа” з'яўляецца мова рускай этнічнай супольнасці, якая складае толькі каля 10% насельніцтва Беларусі[231].

Варта заўважыць, што такая сітуацыя склалася ў выніку палітыкі прэзідэнта Беларусі і падначаленай яму вертыкалі ўлады. Яны пад лозунгамі роўнасці ўсіх этнічных супольнасцей і свабоды выбару мадэлі культурнага развіцця выключылі беларускую мову і ўсе іншыя элементы будаўніцтва беларускай нацыянальнай свядомасці з публічнага жыцця. Беларускасць у якасці падмурка фарміравання беларускамоўнай нацыянальнай супольнасці ўспрымаецца ўладамі як праява нацыяналізму, які неабходна любымі сродкамі вынішчаць з усіх сфер грамадскага жыцця[232].

У сучасным еўрапейскім свеце Рэспубліку Беларусь цяжка залічыць да нацыянальных дзяржаў. Хаця фармальна, з пункту гледжання міжнароднага права, яна такой з'яўляецца. Беларуская мова і культура тытульнай нацыі — беларусаў, адыгрываюць у палітыч-

229 E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, s. 98.

230 І. Пушкін, *Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць 1990-2005 гг.*, Магілёў 2007, с. 71.

231 E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, s. 98.

232 Падрабязней на гэту тэму гл.: Е. Бабосов, *Основы идеологии Белорусского Государства. Курс лекций*, Минск 2012, с. 50-55; ён жа, *Идеология Белорусского Государства: Теоретические и практические аспекты*, Минск 2009, с. 66-70; ён жа, *Основы идеологии современного государства*, 3-е издание, переработанное и дополненное, Минск 2007, с. 62-66.

най, культурнай, эканамічнай і іншых сферах публічнага жыцця маргінальную ролю, а сам народ зведзены да статусу адной з этнічных супольнасцей. Дзяржаўная сістэма ўлады ў Беларусі і палітычная думка накіраваныя на ўкараненне ў грамадстве ідэі, што вышэйшай каштоўнасцю для яго павінны быць дзяржава і органы ўлады.

Пачынаючы з 1995 г. беларускія ўлады праводзяць палітыку выціснення беларускай мовы з публічнай прасторы, адначасова спекулююць лозунгам поўнай свабоды выбару мовы адукацыі, выхавання і культурнага развіцця ўсіх этнічных супольнасцей. Насамрэч свабоды выбару няма. Прыкладамі гэтага з'яўляюцца пастаянныя адмовы ўлады даваць дазвол на будаўніцтва і адкрыццё польскіх школ у Навагрудку, Брэсце, іншых гарадах Беларусі, а таксама другой школы ў Гродне. Большасць беларускага насельніцтва без усялякага супраціву[233], маўкліва прыняла моўную палітыку прэзідэнта А. Лукашэнкі[234].

Мадэль этнічнай палітыкі, як адзначалася вышэй, пачала фарміравацца з 1995 г., калі А. Лукашэнка адмовіўся ад парламенцкай сістэмы кіравання дзяржавай і сканцэнтраваў усю паўнату ўлады ў сваіх руках і ў руках сваёй адміністрацыі. У той час было прынятае рашэнне спыніць працэс беларускага нацыянальнага адраджэння, у тым ліку развіцця беларускай мовы, культуры і выкарыстання нацыянальных сімвалаў. Калі рэжым ставіўся такім чынам да тытульнай нацыі, то і да іншых этнічных супольнасцей выпрацоўваліся падобныя адносіны.

Пастаянныя спробы беларускай улады адмовіцца ад агульнапрынятага ў сусветнай практыцы паняцця „нацыянальныя меншасці" і замяніць яго тэрмінам „нацыянальныя супольнасці" варта разглядаць не інакш, як імкненне вывесці палякаў у Беларусі з-пад прававой абароны міжнародных дакументаў.

Па колькасці палякі займаюць у Беларусі другое месца (пасля рускіх) сярод усіх нацыянальных меншасцей. Іх правы і свабоды гарантуюцца шэрагам міжнародных дагавораў. Беларусь ратыфікавала ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Міжнародную дамову „Аб палі-

[233] Адзінай нацыянальнай супольнасцю, якая не пагаджалася з такой сітуацыяй, была польская. Яе інтарэсы прадстаўляў СПБ. Увесь гэты час, з моманту прыходу да ўлады А. Лукашэнкі, СПБ не толькі вёў перамовы з беларускімі ўладамі пра рэалізацыю сваіх нацыянальных патрэб, але і выказваў нязгоду з нацыянальнай палітыкай праз судовыя працэсы з уладамі, арганізацыю публічных пратэстаў у Гродне і Навагрудку. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 297-427.

[234] *Моўная палітыка ў Беларусі ў 1990-я гады*, <http://www.tbm-mova.by/monitoring16.html>, [22.11.2016].

тычных і грамадзянскіх правах" ад 1966 г. Паводле яе забараняецца дыскрымінацыя ў дачыненні да нацыянальных меншасцей, забяспечваецца права на развіццё культуры, свабоднае спавяданне рэлігіі і выкананне рэлігійных абрадаў, а таксама права карыстацца роднай мовай[235]. Апрача таго, Беларусь прыняла факультатыўны пратакол дамовы, які дае магчымасць асобным грамадзянам падаваць скаргу ў органы ААН у выпадку парушэння правоў, гарантаваных гэтай дамовай. Беларусь як член Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе павінна прытрымлівацца яе рашэнняў адносна правоў і свабод нацыянальных меншасцей. За іх рэалізацыяй сочыць Кансультатыўна-назіральная група АБСЕ[236].

Правы палякаў таксама прапісаныя ў двухбаковых дамовах, заключаных паміж Беларуссю і Польшчай. Найбольш важнымі з іх для польскай нацыянальнай меншасці з'яўляюцца дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча „Аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве" ад 23 чэрвеня 1992 г., дагаворы паміж урадамі Беларусі і Польшчы „Аб супрацоўніцтве ў сферы культуры, навукі і адукацыі" ад 27 лістапада 1995 г.[237], „Аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі" ад 20 ліпеня 2016 г.[238] Таксама статус нацыянальных меншасцей, у тым ліку і польскай, вызначаецца ўнутранымі законамі Рэспублікі Беларусь[239].

[235] A. Wierzbowska-Miazga, *Wybór dokumentów prawnych dotyczących mniejszości narodowych*, t. II: *Polacy na Białorusi*, s. 11.

[236] СПБ неаднаразова інфармаваў амбасадара Групы АБСЕ ў Мінску Ханса Георга Віка пра парушэнні ўладамі Беларусі права польскай нацыянальнай меншасці на навучанне дзяцей на польскай мове і пра перашкоды з боку ўлад у справе будаўніцтва польскамоўных школ у Гродне і Навагрудку. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Związek Polaków na Białorusi 1988-2005. Historia działalności*, s. 464-465, 466-468, 470-471. СПБ інфармаваў таксама пра гэтыя праблемы Вярхоўнага Камісара АБСЕ па справах нацыянальных меншасцей Макса ван дэр Стула ў Гаазе. Там жа, с. 473-476; ён жа, *Polska mniejszość narodowa na Białorusi w latach 1987-2005 a dyplomacja polska*, [у:] *Polska dyplomacja na Wschodzie*, s. 509.

[237] Пералік і змест дагавораў гл.: A. Wierzbowska-Miazga, *Wybór dokumentów prawnych dotyczących mniejszości narodowych*, t. II: *Polacy na Białorusi*, s. 220-274; E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, [у:] *Polityka etniczna współczesnych państw Europy Środkowo-Wschodniej*, red. H. Chałupczak, R. Zenderowski, W. Baluk, Lublin 2015, s. 97-148.

[238] Архіў СПБ Анжалікі Борыс, Дакументы ўваходныя за 2016 год; <https://men.gov.pl/ministerstwo/informacje/podpisanie-porozumienia-pomiedzy-polska-a-bialorusia-w-obszarze-edukacji.html>, [07.08.2017].

[239] Найбольш важнымі з іх з'яўляюцца: *Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года*, Мінск 2014; Закон РБ „Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Бе-

Усе без выключэння пералічаныя вышэй законы і дагаворы давалі палякам у Беларусі права на развіццё сваёй мовы і культуры. Артыкул 10 закона РБ „Аб культуры" ад 4 чэрвеня 1991 г., напрыклад, гарантаваў палякам права на стварэнне нацыянальнай школы, установ культуры (тэатраў, музеяў, выдавецтваў і г.д.). Але рэалізаваць гэтае права было вельмі складана або зусім немагчыма[240]. Тым больш што новы Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры ад 20 ліпеня 2016 г., які пачаў дзейнічаць 3 лютага 2017 г.[241], на заканадаўчым узроўні выклю-

ларусь" ад 11 лістапада 1992 г. са зменамі і дапаўненнямі ад 5 студзеня 2004 г. № 261-З («Нацыянальны рэестр прававых актаў РБ», 2004 г., № 4, 2/1010), ад 7 мая 2007 г., № 212-З («Нацыянальны рэестр прававых актаў РБ», 2007 г., № 118, 2/1309), [у:] *Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*, ИПС, «ЭТАЛОН» версия 6.7, [11.10.2017];
Закон РБ „Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях" ад 17 снежня 1992 г. са зменамі і дапаўненнямі («Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь», 1993 г., № 2, арт. 18; 1995 г., № 13, арт. 125, «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь», 1999 г., № 95, 2/102), Закон Республики Беларусь от 31 октября 2002 г. № 137-З, О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О свободе вероисповеданий и религиозных организациях», [у:] *Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*, ИПС, «ЭТАЛОН» версия 6.7, [11.10.2017];
Закон РБ „Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" ад 26 студзеня 1990 г. № 3094-XI, С изменениями и дополнениями, [у:] *Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*, ИПС, «ЭТАЛОН» версия 6.7, [11.10.2017];
Кодекс Республики Беларусь об образовании. С изменениями и дополнениями по состоянию на 21 сентября 2016 г., Минск 2016;
Закон Республики Беларусь 19 ноября 1993 г. № 2570-XII „О правах ребёнка", с изменениями и дополнениями, [у:] *Национальный центр правовой информации Республики Беларусь*, ИПС, «ЭТАЛОН» версия 6.7, [11.10.2017]; і інш. Поўны іх пералік і змест гл.: A. Wierzbowska-Miazga, *Wybór dokumentów prawnych dotyczących mniejszości narodowych*, t. II: *Polacy na Białorusi*, s. 129-202; E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, [у:] *Polityka etniczna współczesnych państw Europy Środkowo-Wschodniej*, red. H. Chałupczak, R. Zenderowski, W. Baluk, Lublin 2015, s. 97-148; K. Jurewicz-Bakun, *Prawa mniejszości polskiej na Białorusi a standardy międzynarodowe*, [у:] *Polska mniejszość na Białorusi*, s. 311-317.

240 Прыкладам такога ігнаравання ўладамі Беларусі законаў ў дачыненні да палякаў можа быць Навагрудак, дзе выкарыстоўваліся ўсе метады, каб не дапусціць адкрыцця ў горадзе польскай школы. Дзеля надання гэтаму рашэнню законнага характару, яго прынялі на чарговай сесіі Навагрудскага раённага савета народных дэпутатаў, прызначаных уладай, а не выбраных народам. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Zwycięstwa i porażki*, s. 522-523; T. Malewicz, *Wewnętrzne i zewnętrzne przyczyny podziałów w Związku Polaków na Białorusi (albo jak zmarnowano ZPB)*, [у:] *Polska mniejszość narodowa na Białorusi 1988-2009*, s. 112-113.

241 Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры 20 ліпеня 2016 г. № 413-З, <http://www.vuchoba.org/kodeks-respubliki-belaruse-ab-kuleturi-20-lipenya-2016-g-

чыў пытанні, звязаныя з магчымасцю стварэння нацыянальнай школы і ўстаноў культуры для нацыянальных меншасцей[242].

У сучасны момант Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі прадугледжана, што, згодна з пажаданнямі навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў і паводле рашэння мясцовых выканаўчых, а таксама распарадчых органаў, узгодненага з Міністэрствам адукацыі, могуць стварацца класы або ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх навучанне і выхаванне адбываецца на мове нацыянальнай меншасці або вывучаецца яе мова. На такіх умовах больш за 20 гадоў дзейнічаюць польскія школы ў Гродне і Ваўкавыску. Нягледзячы на паляпшэнне двухбаковых міжнародных беларуска-польскіх адносін і дамову паміж беларускім і польскім урадамі „Аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі" ад 20 ліпеня 2016 г.[243], Міністэрства адукацыі РБ распачало курс на абмежаванне навучання на польскай мове ў адзіных польскамоўных школах Беларусі ў Гродне і Ваўкавыску[244]. На-

413-z.html>, [07.08.2017]; *Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры. Уступіў у сілу 3 лютага 2017 г.*, Мінск 2016.

242 Падрабязней гл.: <http://istina.by/files/file/7-o-kulture-kodeks-respubliki-belarus/>, [07.08.2017]; <http://www.vuchoba.org/kodeks-respubliki-belaruse-ab-kuleturi-20-lipenya-2016-g-413-z.html>, [07.08.2017].

243 Архіў СПБ Анжалікі Борыс, Дакументы ўваходныя 2016 г., *Дамова паміж беларускім і польскім урадамі „Аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі" ад 20 ліпеня 2016 г.*; <https://men.gov.pl/ministerstwo/informacje/podpisanie-porozumienia-pomiedzy-polska-a-bialorusia-w-obszarze-edukacji.html>, [07.08.2017].

244 Абмежаванні тычацца таго, што шэраг прадметаў, якія адносяцца да грамадскіх дысцыплін, у гэтых школах павінны выкладацца на адной з дзяржаўных моў (беларускай або рускай), а таксама на адной з гэтых моў павінны здавацца дзяржаўныя выпускныя экзамены. Варта адзначыць, што гэта плануецца зрабіць насуперак раней прынятаму рашэнню беларускага ўрада пра будаўніцтва польскіх школ у Гродне (1996) і Ваўкавыску (1999), замацаванаму ў лісце ад 3 жніўня 1995 г. і накіраванаму ў Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт міністрам адукацыі і навукі Васілём Стражавым. Паводле ўказанняў, змешчаных у гэтым лісце, а таксама на падставе дзеючага беларускага заканадаўства ў сферы правоў нацыянальных меншасцей 16 жніўня 1995 г. быў падпісаны дагавор паміж Саюзам палякаў на Беларусі і Гродзенскім гарадскім выканаўчым камітэтам. Дакумент вызначыў прававыя межы функцыянавання польскамоўнай школы ў Гродне. Па той жа схеме быў падпісаны дагавор, датычны польскай школы ў Ваўкавыску. Паводле гэтых дакументаў усе прадметы ў польскіх школах павінны выкладацца на польскай мове. Падрабязней на гэту тэму гл.: Архіў СПБ Анжалікі Борыс, Дакументы выходныя за 2017 г., *Письмо в адрес Председателя Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь, подписанное Тадеушем Гавиным, Семёном Домашем, Генрихом Крупенко и Николаем Маркевичем 12 мая 2017 г.* Змест ліста гл. таксама: <http://znadniemna.pl/22691/gawin-domasz-krupienko-markiewicz-obronie-polskich-szkol-grodnie-wolkowysku/>, [07.08.2017].

суперак пратэстам[245] шырокай польскай грамадскасці Міністэрства адукацыі плануе свае прапановы заканадаўча аформіць у лістападзе 2017 г., выходзячы з імі ў беларускі парламент. Такія дзеянні ўлада тлумачыць клопатам пра дзяцей, накіраваным на больш поўную іх сацыялізацыю ў Беларусі і гарантаванне рэалізацыі іх правоў у авалоданні дзяржаўнымі мовамі[246]. Насамрэч гэта першы крок беларускіх улад да ліквідацыі адукацыі на польскай мове ў школах у Гродне і Ваўкавыску[247]. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: навошта белару-

[245] На тэму пратэстаў, арганізаваных СПБ на чале з Анжалікай Борыс і бацькоўскім камітэтам польскай школы ў Гродне на чале з Веславам Кеўляком, гл.: Архіў СПБ Анжалікі Борыс, Дакументы выходныя за 2017 г., і <http://znadniemna.pl/category/oswiata/page/1/>, старонка 1 і далей, а таксама *Szansa na uratowanie polskiego szkolnictwa na Białorusi?*, <http://znadniemna.pl/23154/szansa-uratowanie-polskiego-szkolnictwa-bialorusi/>, [07.08.2017].

[246] У выніку прымусовай як даваеннай (усходняя Беларусь), так і пасляваеннай (БССР, РБ) русіфікацыі палякаў Беларусі гэты працэс зайшоў так далёка, што вучні польскіх школ у Гродне і Ваўкавыску ў штодзённым жыцці ў асноўным размаўляюць на рускай або беларускай мовах. Яны дасканала валодаюць гэтымі мовамі. Таму няма ніякіх прычын для турботы з боку Міністэрства адукацыі РБ пра выкарыстанне вучнямі польскіх школ дзяржаўных моў. Больш за тое, гэтыя дзеці маюць праблемы з дасканалым авалоданнем польскай мовай. І менавіта гэта павінна непакоіць Міністэрства адукацыі. Апроч таго, у межах падпісанай у Варшаве 20 ліпеня 2016 г. дамовы паміж урадамі Беларусі і Польшчы пра супрацу ў сферы адукацыі (параграф 1, арт. 6) беларускі бок узяў на сябе абавязкі стварэння ўмоў для развіцця адукацыі польскай нацыянальнай меншасці, а не яе згортвання, што прадугледжвае праект новага Кодэкса аб адукацыі.

[247] Такое меркаванне мае гістарычныя падставы. Палякі Беларусі ўжо мелі падобны вопыт. Так, у 1937-1938 гг., калі масава закрываліся польскія школы ў БССР, улады гарантавалі палякам, што калі ў класах навучаецца больш за 15 вучняў польскай нацыянальнасці, то класы і школы застануцца. Тым не менш, польскамоўная адукацыя ў 1938 г. у БССР была цалкам ліквідаваная. У пасляваенны час, закрываючы польскія школы ў заходняй Беларусі, улады абяцалі захаваць у іх выкладанне польскай мовы ў якасці школьнага прадмета. Але ўсе гэтыя абяцанні не былі выкананыя. Сучасная Беларусь з'яўляецца правапераемніцай БССР. І ў сферы адукацыі беларускія ўлады праводзяць амаль ідэнтычную савецкай палітыку. Таму заява намесніцы міністра адукацыі РБ Раісы Сідарэнкі пра тое, што ў выпадку прыняцця прапанаваных у Кодэкс аб адукацыі дапаўненняў статус дзяржаўных устаноў адукацыі ў Гродне (школа № 36) і Ваўкавыску (школа № 8) не зменіцца, а вучні будуць працягваць навучацца на польскай мове, успрымаецца польскай супольнасцю ў Беларусі з недаверам. Падрабязней на гэту тэму гл.: Архіў СПБ Анжалікі Борыс, Дакументы ўваходныя за 2017 год, *Письмо заместителя министра образования Сидоренко Р. С. к Гавину Т. Ф. от 31 мая 2017 года*; *Gawin, Domasz, Krupienko i Markiewicz w obronie polskich szkół w Grodnie i Wołkowysku*, <http://znadniemna.pl/22691/gawin-domasz-krupienko-markiewicz-obronie-polskich-szkol-grodnie-wolkowysku/>, [07.08.2017].

скія ўлады імкнуцца да знішчэння і так абмежаванай у сваім развіцці польскамоўнай адукацыі ў Беларусі? Адказы на гэтае пытанне могуць быць наступнымі. Па-першае, улады не могуць спакойна ставіцца да развіцця адукацыі на польскай мове ў Гродне і Ваўкавыску ў той час, калі ў гэтых гарадах няма не толькі беларускамоўных школ, але і класаў. Дзейнасць польскіх школ дае станоўчы прыклад для тых беларусаў, якія змагаюцца за існаванне беларускіх школ. А гэта не ўваходзіць у планы ўлад, якія перманентна рэалізуюць палітыку русіфікацыі. Таму яны і імкнуцца да ліквідацыі польскіх школ. Па-другое, у гэтых школах адсутнічае ўплыў ідэалогіі „рускага свету". У сувязі з гэтым варта чакаць, што беларускія ўлады будуць працягваць дзейнасць, накіраваную на паступовае згортванне польскамоўнай адукацыі ў Беларусі.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што права на вывучэнне польскай мовы ў школах сфармулявана ў беларускім заканадаўстве адносна ліберальна, ёсць патэнцыйныя перашкоды, пераадольванне якіх патрабуе шмат часу і рашучасці. Застой у развіцці польскамоўнай адукацыі, які працягваецца ўжо больш за дзесяць гадоў, сведчыць пра тое, што гэтыя перашкоды з'яўляюцца рэзультатыўнымі, а існуючыя заканадаўчыя магчымасці не выкарыстоўваюцца, або, іншымі словамі, не працуюць. Тым не менш, беларускія ўлады спекулююць тэзісам пра тое, што з прыходам да ўлады А. Лукашэнкі адразу была вырашана праблема навучання грамадзян рэспублікі на іх родных мовах, і што большасць з іх карыстаецца гэтай магчымасцю[248]. На самой справе гэтае сцвярджэнне не толькі з'яўляецца падманным, але улады ўсялякімі спосабамі (у тым ліку адміністратыўнымі) адбіваюць у грамадзян жаданне праяўляць сваю нацыянальную самасвядомасць[249].

Змены, датычныя нацыянальнай палітыкі, уведзеныя ў беларускае заканадаўства пасля 2003 г., мелі касметычны характар. Дзяржаўная ідэалогія, на думку беларускіх улад, стварала фундамент для бесканфліктнага існавання розных этнічных супольнасцей[250]. Ствараліся і ствараюцца далей рознага кшталту праграмы, накіраваныя на захаванне культурнай спадчыны народаў, якія жывуць у Беларусі. Дзяржава павінна падтрымліваць прадстаўнікоў этнічных супаль-

[248] В. Касовіч, *Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцей у Рэспубліцы Беларусь*, [у:] *Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў XX стагоддзі*, Мінск 1997, с. 161-169.

[249] E. Mironowicz, *Polityka etniczna Republiki Białoruś*, s. 97-148.

[250] Там жа, s. 97-148.

насцей у справе развіцця адукацыі і культуры[251]. У выпадку з польскай нацыянальнай меншасцю не было дапамогі ў сферы наладжвання польскамоўнай адукацыі або выкладання польскай мовы ў якасці навучальнага прадмета ў школах у месцах кампактнага пражывання палякаў[252].

Указам прэзідэнта Беларусі ад 5 траўня 2006 г. Дзяржаўны камітэт па справах рэлігіі і нацыянальнасцей рэфармаваны ў апарат Упаўнаважанага па справах рэлігіі і нацыянальнасцей, які падпарадкоўваецца Савету Міністраў РБ[253]. Пры ім працуе Каардынацыйны савет, у які ўваходзяць прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей. Тэарэтычна яны маюць магчымасць уплываць на нацыянальную палітыку ў Беларусі, але на практыцы апарат упаўнаважанага працуе такім чынам, каб ініцыятывы нацыянальных супольнасцей стрымліваць. Так, напрыклад, усе прапановы СПБ па развіцці польскамоўнай адукацыі ніколі не знаходзілі разумення і падтрымкі з боку ўпаўнаважанага[254]. Працу Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігіі і нацыянальнасцей вядомы ў Беларусі польскі грамадскі дзеяч Т. Малевіч ацаніў наступным чынам: „Дзяржаўны камітэт ніколі не ўнёс ніводнай прапановы для вырашэння хаця б адной праблемы па адраджэнні польскай мовы або польскамоўнай адукацыі: не дапамагаў вырашаць праблемы выдання падручнікаў на польскай мове, павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, падрыхтоўкі метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў... НІЧОГА! (...) Нідзе і ніколі польскамоўная адукацыя або выкладанне польскай мовы не з'явіліся дзякуючы ініцыятыве Камітэта, беларускіх улад або іх органаў адукацыі"[255]. Дзяржаўны камітэт па справах

[251] *Программа развития конфессиональной сферы, национальных отношений и сотрудничества с соотечественниками за рубежом на 2006-2010 годы. Согласована Советом Министров Республики Беларусь 30.11.2006 г.*, Минск 2006, с. 20-21.

[252] М. Л. Рыбаков, *О межнациональных отношениях и государственной национальной политике в Республике Беларусь*, [у:] *Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе. Сборник научных статей*, Гродно 2010, с. 20.

